Валянцін
Дубатоўка

# Чорная воля

ГАРАДЗЕНСКАЯ
БІБЛІЯТЭКА

# ЧОРНАЯ ВОЛЯ

Аповесці, апавяданні, абразкі

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

Валянцін Дубатоўка

# ЧОРНАЯ ВОЛЯ

Аповесці, апавяданні, абразкі

Гародня 2013

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

www.facebook.com/knihizhrodna

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА прысвячаецца той Гародні, якой мы ганарымся.

Дзякуем усім, хто з намі.

---

**Каардынатар кніжнай серыі «ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА»:**
Павал Мажэйка

**Ідэя серыі:** Эдвард Дмухоўскі

---

**"Чорная воля"** – гэта 3-я кніга падсерыі «Гарадзенскія коды», якую заснавала «ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА».

**Аўтар:** Валянцін Дубатоўка
**Графічная апрацоўка і вёрстка:** Іван Паўлёнак
**Вокладка:** Dar..ja
**Рэдактары:** Міхась Скобла, Юрка Голуб

Copyright © Гарадзенская бібліятэка, 2013
Валянцін Дубатоўка, 2013

## БОТЫ

Праваруч ад сячкарні, якраз пад звіслымі з бэлькі граблямі ды старымі, плеценымі з лазы ночвамі, ляжалі два акрываўленых целы. Тое, што было бліжэй да выхаду, належала шыракаплечаму, каржакаватаму, сярэдніх гадоў мужчыну, апранутаму ў афіцэрскі фрэнч зялёнага колеру і такога ж колеру нагавіцы. Другі, трохі хударлявы, сівавалосы, у паліцэйскай уніформе, знаходзіўся непадалёк ад зляжалага і ад таго едка пахнучага леташняга сена. Тут жа ля сцяны з настаўленымі ўгору зубамі віднеліся вілы з гладкім ад рук чаранком, з якіх сцякала цягучая, як сок перамерзлае каліны, кроў. Насупраць забітых, на камяні, што выступаў з падрубы, сядзеў лысагаловы, сярэдніх гадоў чалавек. Мужчына, абхапіўшы вялікімі, як абцугі, рукамі, апушчаную галаву, моцна соп і час ад часу глуха стагнаў. Праз расхлябешчаныя дзверы адрыны ў сярэдзіну залятаў цёплы і лагодны вясновы ветрык, даносячы звонку спевы птушак і пах свежаспечанага хлеба. Гэты пах разносіўся паўсюль, перабіваючы ўсе пахі ў адрыне.

Падчас вызначальных для ўсяго чалавецтва гістарычных падзей, калі ўладары краін апякуюцца лёсамі народаў і свету ўвогуле, чалавек нараджаецца, жыве, а з часам і памірае ў прыватным, а значыць абмежаваным асяродку. І пэўна, толькі Бог разумее наколькі важна для сусвету яго жыццё. Бо чалавек і ёсць часцінка сусвету, а сусвет ёсць Бог – вялікі і неабсяжны, усемагутны і разам з тым міласэрны...

Дождж ліў, як з вядра... Дзегцяваны плашч, летась набыты чалавекам на слонімскім кірмашы, упарта трымаў вадзяную аблогу. Гаспадар плашча, насунуўшы на галаву башлык, крочыў асцярожна, але шпарка, лоўка абмінаючы вялізныя лужы ды залітыя па край каляіны. Па ўсім было відаць, што ён вельмі спяшаецца. Шлях да агнёў бачнага непадалёк фальварка хутка скарачаўся. Сабака, пачуўшы на гасцінцы крокі і не пазнаўшы гаспадара, заліўся насцярожаным і гучным брэхам.

“Халодны вечар, а тут яшчэ дождж, каб ён праваліўся”, – разважаў сам сабе чалавек у плашчы. – “Ну, але ж ці варта ўсё гэта ўвагі? Самае галоўнае тое, чаго так моцна прагнуў, – вось яно”.

Перабраўшы пальцамі змесціва торбы, што целяпалася пад праваю рукою, ён гучна вылаяўся і зноў схаваў намоклую руку ў кішэнь прыхаванага пад плашчом бурноса. "А дождж... дык што ён? – працягваў разважаць чалавек, – праз гадзіну-другую скончыцца".

Чым бліжэй была сяліба, тым мужчына крочыў усё больш упэўнена. І вось сабака, які хвіліну таму злосна брахаў, у адначассе аж зайшоўся ад вінаватага віску.

Чалавеку было гадоў каля сарака пяці, ён быў сярэдняга росту, з шырокімі, трохі сутулымі плячыма, на якіх упэўнена трымалася моцная лысаватая галава. З-пад башлыка выглядаў вялікі і прамы нос. Чалавек адкашляўся, яшчэ раз агледзеў падворак і павярнуў ад брамы да ганку. Каля дзвярэй ён змахнуў дзеркачом з ботаў гразоту і зайшоў у абстаўленыя лавамі сенцы. Вобмацкам на прымастаколены каля ўваходных дзвярэй вяшак ён пачапіў мокры і ад таго даволі цяжкі плашч. Побач з лазам у склеп ён паставіў знятыя тут жа таўстаскурыя ялавыя боты. Прыхапіўшы прынесеную з мястэчка торбу, ён накіраваўся да дзвярэй, што вялі ў жытло. І вось металёвая клямка грукнула, шырока расчыніўшы філянковыя сасновыя дзверы, гаспадар ступіў у святліцу. Там было цёпла і суха. Па ўсім адчувалася, што дом быў пабудаваны ўсяго некалькі гадоў таму. Зрабіўшы пару крокаў па хаце, гаспадар сеў каля шырокага дубовага стала, над якім мігцела газоўка. Яе бляклае святло збольшага асвятляла цёмны пакой.

Гаспадар цяжка ўздыхнуў: "Нарэшце". Пачуўшы, што нехта зайшоў у хату, са спальні, праз вузкія дзверы, высыпалі дзеці. Добра было відаць, што яны толькі нядаўна пакладіся спаць, але, спадзеючыся на пачастункі, якія заўсёды прывозіў з мястэчка бацька, змагаліся са сном як маглі. Бацька, убачыўшы сваіх улюбёных дзетак, тут жа дастаў з глыбокай кішэні бурноса даволі ладны папяровы скрутак і паклаў яго на сярэдзіну стала: "А ну, хуценька сюды".

Праз хвіліну вялікі сямейны стол быў апанаваны ўсхваляванымі чалавечкамі ў даўжэзных саматканых сарочках. "Ух ты!" – разнёсся па пакоях дзіцячы галас. Пад цьмяным

святлом лямпы пасярод стала ляжалі рознакаляровыя смачнапахнучыя пеўнікі, матылькі, рыбкі. Дзеці гуртам наляцелі на ласункі. ”А ну, цішэй!”– скамандаваў бацька. Пасля гэтых слоў за сталом усталяваўся парадак. Старэйшыя пачалі частавацца за малодшымі, апошнія, азіраючыся на старэйшых, стараліся браць няшмат. А калі цукеркі скончыліся, да сям’і падышла маці. Увесь гэты час яна мітусілася каля печы, рыхтуючы мужу вячэру. Папрасіўшы дзяцей пакінуць у спакоі стомленага бацьку, яна выцягнула з-пад стала драўляны зэдлік і прысела праваруч ад гаспадара. Дзеці, здаволіўшыся пачастункам, ужо і самі пачалі паціху вяртацца ў ложкі. Яшчэ хвіліна, і ў пакоі стала ціха, як і да прыходу бацькі.

– Ну што, Мікола, стаміўся? – прытуліўшыся да пляча мужа, запыталася гаспадыня.

– Стаміўся... Дурны быў, што цябе не паслухаў, каб паехаў на брычцы – дык даўно быў бы дома.

– А ці шмат было ванілаўскіх у мястэчку?

– Не.

– Ну ты скажы, – працягнула жонка. – Такая ладная вёска і столькі зладзюжных людзей!

– Але ж не ўсе. Вунь Каржы, паглядзі, якія спраўныя кавалі. Усе местачковыя габрэі ў іх сваіх коней падкоўваюць.

Пасля сказанага Мікола адкашляўся. ”Ну добра, Бог з імі, – прамовіла падымаючыся з зэдліка, жанчына. – Ты лепш распранайся ды паказвай, па што так доўга брындаўся ў непагадзь”.

Мікола павольна ўстаў, зняў мокры бурнос і, нахіліўшыся да лавы, адной рукой падхапіў прынесеную з мястэчка торбу.

– Узірайся, Ганна, – прамовіў усхвалявана. Гаспадыня падышла бліжэй і ўважліва паглядзела на прадстаўлены мужам здабытак. Карычневыя, прыгожа прашытыя тонкімі скуранымі ніткамі боты пераліваліся і паблісквалі.

– Паслухай, Мікола, а мы падчас прыезду ў мястэчка ці не падобныя бачылі на князю?

– Не, Ганна, там была штампоўка. Я такіх шмат бачыў у Амерыцы, а тут дубовыя цвічкі, слаёная цвёрдая падэшва, дый скура якая! – пагладжваючы халявы, настойваў на сваім Мікола.

– Ну, добра, – усміхнулася жонка, – ты мне тут не выдумляй, мы ж не на кірмашы, ды і ты не габрэй. Я і так бачу, што боты спраўныя.

Жонка нахіліла галаву і яшчэ ўважлівей прыгледзелася да ботаў. Тут Мікола прыпыніў агляд, спрытна нацягнуў адзін з ботаў на сваю правую нагу, падскочыў, як кавалер, і падаў руку жонцы. Ганна сарамліва ўсміхнулася і адступіла ад мужа на некалькі крокаў:

– Ты, пэўна, на дажджы мазгі застудзіў. Ну і шавец, я табе скажу, лепшага майстра, чымсьці Ёсель, пэўна, і ў Слоніме не знайсці, – прыгаворвала Ганна. Згледзеўшы, што жонка ніяк не рэагуе на яго заляцанні, гаспадар супакоіўся і, прысядаючы на лаву, адказаў:

– Канешне, каб быў благі, дык ці замаўляў бы я яму такую адказную справу? – А потым пачухаў лысіну і, гледзячы на боты, дадаў: – Вось ты скажы, Ганна, хто мог падумаць гадоў дзесяць таму, што я, парабак з Мошак, калі-небудзь набуду фальварак, пастаўлю мур і спраўлю сабе боты, лепшыя, чым у самога Сапегі?

– Пачакай, пачакай, вось убачаць іх мошкаўскія бандыты, дадуць табе і хутар, і боты....

Мікола на хвіліну задумаўся і, як быццам у апраўданне, разважыў:

– А што, я краў ці ашукваў каго, што баяцца павінен? Я на гэтыя боты цэлы год працаваў! – Пасля гэтых слоў Мікола падняўся з месца і стаў нярвова праходжвацца па хаце. Ганна, убачыўшы мужа абутым толькі на адну нагу, спачатку ўсміхнулася, але ўспомніўшы, пра што ішла гаворка, раптам пасур'ёзнела:

– Вось за гэта, што ўсё жыццё працуеш, а не п'еш ды не б'ешся з імі разам, яны цябе і не любяць. Ой Мікола, Мікола, чуе маё сэрдца, не прынясуць гэтыя боты шчасця ні табе, ні нам.

– Нічога Ганна, усё будзе добра, – здымаючы з нагі бот, азваўся гаспадар.

– Ну дык што, будзеш есці зацірку?

– Не, хадзем спаць. Нешта моцна перамерз я на гэтым дажджы.

Мікола падышоў да абраза, што вісеў на покуці, перахрысціўся некалькі разоў, зняў са сцяны лямпу і, стараючыся не пабудзіць дзяцей, пасунуўся да ложка.

На хвіліну ажыўшы хутар зноў адышоў да сну. І толькі дождж, як нечаканы госць, што прынёс дрэнную навіну, настойліва стукаўся ў вокны мураванкі, жадаючы выканаць нарэшце даручаную яму кімсьці справу.

Хутар ляжаў у нізіне. У цёплы дзень ён нагадваў велізарнага шэрага цмока, што выпаўз з балота пагрэцца на ранішнім сонцы. Паміж аддаленых адна ад другой хутаранскіх сяліб вілася закручаная, як змяя, рачулка. Яна ў некалькіх месцах перасякала абсаджаны вербамі, сям-там брукаваны яшчэ некалі гасцінец. І рачулка, і брукаванка, і нават сам хутар толькі ўпрыгожвалі вялікае і трохі зарослае альшыною балота. Нават лес, што ўцякаў ад чалавечага вока за небакрай, здалёк і сам з'яўляўся часцінкаю гэтага амаль палескага краявіда.

Праваруч ад балота, трохі бліжэй да Зэльвы, мясціўся фальварак Казіміра Досты. Драўляная хата была збудавана парадным уваходам да гасцінца. За некалькі метраў ад хаты стаялі новы хлеў для жывёлы ды трохі нахіленая на левы бок адрына, якая, як сарамлівая маладуха, хавалася ў старым, дзе-нідзе падсохлым садзе. Нібы вартуючы купіну балотнае альшыны, каля самае рачулкі стаяў мураваны, пакрыты чарапіцаю дом Сцяпана Дыцка. Збудаваны ён быў так, каб жыць пад адным дахам маглі найменей дзве сям'і. Пуня і астатнія пабудовы фальварка знаходзіліся побач, ствараючы вельмі выгоднае кола сельскагаспадарчых пабудоў, у якім падчас працы усё было блізка. Непадалёк ад сялібы Дыцка, упіраючыся падмуркам у балота, стаяла маленечкая і нізкая драўляная хатка Рыгора Лукашэвіча. Трохі наводдаль ад яе мясцілася значна большая за хату пуня. Упрыгожваў увесь гэты раскінуты на значнай тэрыторыі куток дом Міколы Шпака. Быў ён узведзены зусім нядаўна, дзесьці прыканцы дваццатых. Высокі каменны падмурак трымаў на сабе прыгожы, з чырво-

нае цэглы дом. Яго завостраныя вокны ды па-мастацку зробленыя аканіцы стваралі ўражанне палаца. Ганак быў упрыгожаны па краях драўлянымі, аздобленымі разьбой слупамі, якія неслі на сваіх плячах, як дужыя волаты, прадаўгаваты, падбіты знізу шалёўкаю брылёк. Уся пабудова была пакрыта гонтаю, якая яшчэ не набыла звыклага для воку шэрага колеру. Каларыту ёй надаваў прыгожы і масіўны франтон, на якім быў выкладзены з тае ж чырвонай цэглы год пабудовы і прозвішча гаспадара. Уся гэтая балотная мясціна звалася хутарам Забайкі. Чаму ён так называўся – не ведаў ніхто. Можа, гэтая мясціна належала раней князям Палубінскім, якія гаспадарылі тут аж з часоў сярэднявечча, а можа, іх наступнікам – князям Сапегам. Але ўжо прыканцы дваццатых хутар гэты быў выкуплены і заселены пераважна "беларускімі амерыканцамі", якія зарабілі грошы на заводах Моргана ды Форда і, атрымаўшы разам з далярамі яшчэ і неблагую кваліфікацыю ды веды, спадзяваліся на радзіме ажыццявіць свае мары і спадзяванні.

З той восеньскай пары, калі Мікола вярнуўся з мястэчка, прайшло некалькі месяцаў. Адышла цяжкая і халодная зіма, мінуліся вясёлыя Каляды і таямнічыя грамніцы. Хутар рыхтаваўся да сустрэчы Вялікадня.

Маці і дзяўчаты, якіх у сям'і было дзве – Гандзя і Марыля, мылі падлогу ды апратвалі прыпечак, які ў суровую зімовую пару служыў месцам паратунку ад холаду і начнога страху, што няслo з сабой адасобленае жыццё на хутары. Ганна, прыбіраючы сені, рабіла заўвагі дзяўчатам, якія без пярэчанняў выконвалі любы загад маці. Марыля была маладзейшая за Гандзю гадоў на пяць, і ад таго да ўсяго, што гаварыла матуля, ставілася не зусім сур'ёзна. Але пятнаццацігадовая Гандзя ўважліва сачыла за малодшай сястрой, і калі тая трохі расхалоджвалася, некалькімі словамі зноў заахвочвала Мырылю.

На падворку і паблізу гумна завіхаліся хлопцы, яны шпарка выконвалі некалькі работ адразу. Старэйшы Аркадзік, якому было ўжо гадоў сямнаццаць, займаўся рамонтам авечых кашар. Юзік, на тры гады маладзейшы, працаваў на падворку

і каля адрыны. Самы малодшы – Алесь, якому толькі нядаўна споўнілася сем гадкоў, спрабаваў дапамагчы то аднаму, то другому. Але старэйшыя найбольш цешыліся, калі меншы брат кудысьці адлучаўся. Калі не ўлічваць гэтыя паводзіны малодшага, то з упэўненасцю можна зрабіць выснову, што ўсё на хутары рабілася арганізавана і прадумана.

Вясна ў тым годзе настала надзвычай рана. Дрэвы распусціліся ўжо некалькі тыдняў таму. Птушкі, што вярнуліся дадому, як і жыхары хутара, вельмі спяшаліся прывесці ў парадак свае панішчаныя за зіму гнёзды. З першага погляду здавалася, што ўсё навоколле вельмі спяшаецца жыць, асцерагаючыся, што хутка зноў вернецца халодная і бязлітасная зіма. Сабака, якога ў мінулую восень падараваў гаспадару местачковы габрэй Ахроім, весела мітусіўся на падворку. Клікалі яго чамусьці Ах, можа, ад скарочанага імя былога гаспадара. Хоць і быў ён невялічкі, не вышэй за бот , але за свой непаседлівы характар меў даволі заслужаны аўтарытэт не толькі сярод Шпакоў, але і сярод другіх тубыльцаў.

– Аркадзік, сынок! Паглядзі, ці не прыйшоў бацька ад Досты, – праз расчыненыя дзверы звярнулася да старэйшага сына маці. Аркадзік хацеў было накіравацца за мур, але тут яго прыпыніў Юзік, які ўжо азваўся з-за хаты.

– Вунь ідзе!

З–за прыдарожных вербаў, што атачылі гасцінец, паказаўся бацька. Праз некалькі хвілін Мікола ўжо быў на прыбраным да Вялікадня падворку. Бацька, які звычайна адзначаў зробленае дзецьмі, зараз чамусьці нават не заўважыў пераменаў. Нават Ах і той адчуў, што гаспадар нечым быў моцна засмучаны. Раптам з хаты вылецела Ганна і твар у твар сутыкнулася з заходзячым у сенцы мужам.

– Ну, што там у Достаў?

– Што, што, Казік прыехаў з Беластоцкага суду, – абыякава адказаў, прапускаючы на ганак заклапочаную жонку, Мікола.

– Ну і як там яго справы? – ужо наўздагон крыкнула Ган-

на. Мікола, не адказваючы жонцы, зайшоў у хату, зняў шапку і прысеў на лаву каля сцяны. Ганна адчула, што нешта здарылася, і, забыўшыся на справы, паспяшалася за мужам. Мікола сядзеў нерухома і напружана маўчаў.

– Мікола, што здарылася?

– Вайна будзе, Ганна, вось што.

– Як вайна? – Ганна застыла на парозе.

– А вось так. Гітлер ужо чэхаў захапіў, мусіць, і наша чарга надышла. Дый Саветы нешта моцна рыхтуюцца за Стоўбцамі, разам як наваляцца, то з Польшчы сок пацячэ, як з мочанага яблыка.

– А англікі? – спыталася жонка,

– Што тыя англікі, яны там на выспе самі трасуцца, як лісты на нашай ліпе, бо расейцы разам з немцамі як пасядуць на караблі, то колькі вытрымае тая Англія?

– І што будзем рабіць? Толькі разжыліся, Божа ты мой, Божа.

– А што ты будзеш рабіць? Будзем спадзявацца, што ўсё будзе добра, тым больш заўтра Вялікдзень, – трохі павесялеўшы, выказаўся Мікола. – Аркадзік, – выглянуўшы ў расчыненае вакно, галёкнуў бацька. – Годзе працаваць, збірай хлопцаў, хадзеце на вячэру.

– У парозе ногі выцірайце, – папярэдзіла хлопцаў клапатлівая Гандзя. І сапраўды, у хаце было вельмі чыста, паласатыя саматканыя палавікі разбягаліся ў розныя пакоі. На абразах віселі вышываныя бела-чырвоныя рушнікі, накрухмаленыя ды адпрасаваныя фіранкі дапаўнялі ўражанне надыходзячага свята. Вокны былі так старанна вымытыя, што выглядалі як люстэркі. Стаўбунок, што ратаваў узімку ўсю сям'ю ад холаду, зараз быў пачышчаны і адмыслова пабелены. Прыбраная на святы хата выглядала прасторнай і прыгожай.

Цёплы вясновы вечар ужо цалкам завалодаў хутарам, але надаедлівы Ах, які атрымаў такую колькасць уражанняў, пабыўшы цэлы дзень з людзьмі, ніяк не мог супакоіцца. Мікола нахіліўся ў адчыненае вакно і загадаў:

– А ну пайшоў у буду! – Праз хвіліну Ах ужо спалохана выглядаў са свайго жытла, не разумеючы, за што на яго раззлаваўся гаспадар. У гэты час сям'я ўжо знаходзілася за сталом, дзе пасярод накрахмаленай настольніцы стаяў невялічкі чыгунок, з якога па ўсёй хаце разносіўся цудоўны пах зваранай на алеі куцці. Побач з ім стаяла прадаўгаватая талерка з сялядцом, аздобленая адмыслова нарэзанымі калянкамі цыбулі і шчодра палітая тым жа алеем. Была яшчэ рэдзька, нашынкаваная на тарцы, ды квашаная капуста з морквай. І гэта, пэўна, усё, што было на посным перадвелікодным стале.

Бацька падняўся з месца, уся сям'я зрабіла тое ж самае. Ён павярнуўся на ўсход і, перахрысціўшыся тры разы, пачаў галосна чытаць "Ойча наш". Малодшыя нахілілі галовы і ўважліва слухалі, а маці з Аркадзем ды Гандзяю пачалі паўтараць за бацькам. Калі гаспадар скончыў малітву, уся сямейнікі дружна перахрысціліся і пачалі вячэраць.

Велікодная раніца выдалася халаднаватай, але сонечнай, яна поўнасцю адпавядала вялікаму святу Божага Уваскрошання. Дзеці падняліся і, здымаючы з вешакоў прыбранае загаддзя адзенне, сталі выходзіць з ім у пярэднюю. Тут ужо, як нейкі дзіўны іншаземец, стаяў апрануты ва ўсё новае бацька. Лысіну прыкрывала драпавая, у чорныя кропелькі шапка, з-пад пінжака выглядала бліскучая, прыгожа расшытая камізэлька, пад якой хаваўся вузкі прывезены з Амерыкі гальштук. Нагавіцы, якія гаспадар, смеючыся, называў вушатымі, упрыгожваліся шырокаю папругаю. І ўвесь гэты няхітры гарнітур адмыслова аздаблялі новыя скураныя боты.

– Тата, ну і прыгожыя яны! – гледзячы на боты, сказала Гандзя, а потым, разы са два сатхнуўшы, дадала: – Я такіх ні ў Зэльве не бачыла, ні нават у Слоніме.

На гэты узнёслы вокліч сястры збегліся амаль усе дзеці. Яны, падбадзёрваючы адзін другога, сталі нахвальваць бацькаву абнову. Толькі Ганна, запраўляючы вышываную блузку ў святочны андарак, гучна прыгаворвала:

– Ой Мікола, не абувай ты іх, наклічуць яны бяды, будзеш бачыць.

Ад жончынай перасцярогі вясёлы гаспадар толькі нахмурыў бровы. Тут жа дрэнны настрой бацькі перакінуўся на ўсю сям'ю, дзеці разышліся па хаце і ўжо моўчкі прадоўжылі зборы. Але тут у пярэднюю забег з кухні Алесь, ён пасля ласавання чарнічным варэннем нагадваў спалоханае кімсьці чарцяня. Ён глядзеў на сабраных і не разумеў, што тут адбываецца. І адразу настрой ў хаце палепшыўся: спачатку дзеці, а потым і дарослыя заліліся смехам на ўсю хату.

Брычка па шашы, дзе назіраўся ажыўлены рух, кіравалася ў мястэчка, якое званамі царквы ды адкрытымі яшчэ з вечара габрэйскімі крамамі і шынкамі сустракала гасцей з ваколіц. Тавары ды закускі на ўсе густы прэзентавалі па ўсёй галоўнай вуліцы гаваркія і трохі надакучлівыя гандляры-габрэі. З шынкоў цягнуўся смачны пах смажанага мяса ды каўбас. Пачуўшы адтуль гучныя песні ды п'яныя крыкі, Мікола сам сабе сказаў: "Лепш пахаванне без равіна, чымсьці свята без клейзмара".

Пасля ўсяночнае і ранішняга застолля народ толькі адпачыў ды выбраўся ў мястэчка, каб разам са сваякамі і знаёмымі пачаставацца валачобным і адсвяткаваць першы дзень Вялікадня. Мікола прыпыніў каня, пачакаў, калі з брычкі злезуць дзеці ды жонка, прывязаў лейцы і ступіў на брукаваную местачковую плошчу. Яму здалося, што ўсе местачкоўцы павыбягалі са сваіх дамоў, каб глянуць на яго спраўныя боты. І сапраўды, люд, што знаходзіўся ля святыні, павярнуўся ў накірунку Міколы. Самога Шпака мясцовыя жыхары ведалі: сярод іх ён слыў удалым і разумным гаспадаром, з якім ладзілі справы як мясцовыя, так і прыезджыя гандляры. А тут яшчэ нябачаныя дасюль у мястэчку боты. Мікола, перахапіўшы ў левую руку шапку, накіраваўся ў царкву, дзеці і жонка рушылі за ім. Людзі, якія стаялі на бабінцы, трохі расступіліся, і Шпакі без перашкод зайшлі ў храм. Служба ў царкве была нядоўгай, пэўна, таму, што і святары, і прыхаджане стаміліся за ўсяночную службу. Званы бомкалі на ўсю ваколіцу, народ валам валіў з царквы. Гоман жанчын, смех дзяцей, іржанне коней – усё перамяшалася на малой местачковай плошчы.

Мікола Шпак, вітаючыся направа і налева са знаёмымі, крочыў да сваёй брычкі. І тут Ганна пацягнула яго за крысо пінжака і так моцна, што Мікола аж аступіўся.

– Паглянь, Мікола, Сцяпан Кулак каля брычкі, ды не адзін, а з усёй шайкаю. Мікола крочыў спакойна.

– Ну што, хутаранін? Усё нажываешся, міраед? – апёршыся на аглоблі брычкі, выціснуў праз зубы мужчына гадоў сарака. Шпак сходу пазнаў у ім адвечнага Кулаковага канкурэнта Альбіна Клімашэўскага.

– Працуй пільна, і тут будзе Вільна. І ты будзеш міраедам, – з насцярожаннасцю, але без страху, адказаў Мікола. Ад гэтых слоў мошкаўская шайка, якая налічвала чалавек восем, узбуджана загаманіла. Толькі Кулак, як слуп, стаяў апёршыся на брычку, і ўважліва глядзеў на Міколу. У паветры павісла нацягнутая, як нітка, цішыня.

– Ведаеш, што я табе скажу, Шпак. Я – Кулак па прозвішчы, а ты па ладзе жыцця. Пачакай, прыйдзе час, калі мы даведаемся, хто з нас кулак сапраўдны, – на мускулістым твары прамоўцы з'явілася злосная ўсмешка. Дзецюкі, што атачалі Шпаковую сям'ю, як па камандзе заліліся з'едлівым смехам.

– Як табе ні брыдка, Сцяпан, – стала прыгаворваць Ганна, – вы ж гадаваліся разам.

Кулак, не звяртаючы ўвагі на жанчыну, павярнуся і пакрочыў да шынка, які знаходзіўся праз дарогу. Прайшоўшы некалькі крокаў, ён прыпыніўся і, не паварочваючы галавы, праз плячо крыкнуў: – Едзь пакуль.

Уся шайка пасля гэтых слоў дружна павярнула за сваім верхаводам. Дзеці і жонка Міколы, не марудзячы, размясцілася на лаўках, і брычка тут жа рушыла ў накірунку хутара. Усе маўчалі, нават малодшыя дзеці добра разумелі, што каля царквы здарылася нешта нядобрае.

– Матуля, скажы, калі ласка, хто тыя дзядзькі, што запынілі тату ля царквы, – запытаўся цікаўны Юзік.

– Мошкаўскія бандыты, – адказала маці.

– А ты што, не ведаеш? – нахіліўшыся да Юзіка, прашаптаў Аркадзік, – гэта ж Кулак са сваёй бандай, яны тут нікога не баяцца. І каб не паліцыя, наўрад ці і мы ацалелі б.

Усе ў брычцы насцярожанна маўчалі, ды тут ізноў зняў напругу малы Алесь. Ён, стомлены ад доўгага стаяння ў царкве, моцна захацеў спаць. Прытуліўся да мацеры, задрамаў і спрасонку ледзь неываліўся на калдобіне з брычкі, згубіўшы з нагі яшчэ зусім новы сандалік.

– Стойце, гіцлі!– крыкнула Ганна, – зараз за вашымі бандытамі хлопца згубім.

І ўся да гэтага сумная кампанія весела зарагатала, толькі малы Алесь зноў не зразумеў, што адбылося. Ён толькі заўзята цёр свае заспаныя вочкі кулачкамі і круціў кудлатай галавой у розныя бакі.

Ад Велікодных свят мінулі некалькі месяцаў. Надышла чарговая сялянская восень. Жыццё на хутары Забайкі, як і да гэтага, ішло звычайнай хадой. Бацька з Юзікам працавалі ў полі, маці з дочкамі апратвалі тое, што была прывезена мужчынамі з палеткаў. Аркадзік збіраў сваю падарожную торбу дзеля ад’езду ў Слонімскую гімназію, куды паспяхова здаў іспыты прыканцы лета. Карацей кажучы, усе былі заняты будзёнными справамі. Толькі Алесь сядзеў паблізу ганка і бавіўся ў насыпаным на бруканку жвіры. Раптам за спіной у малодшага Шпака весніцы гучна трэснулі і, перапалохаўшы захопленае гульнёй дзіця, адчыніліся. На шпакаўскі падворак, аглядаючыся навокал, нібы шуляк, уляцеў сусед Казік.

– Здароў, гаспадар, – звярнуўся да Алеся Доста. – Дзе бацька?

– Каля вёскі грыку косіць, – спаважна адказаў, не адрываючыся ад сваіх спраў, Алесь.

– Пабяжы і хуценька пакліч яго сюды. – Алесь хоць і быў малы, але адчуў, што нешта здарылася сур’ёзнае. Хутка Мікола, пакінуўшы ў полі Юзіка, уваходзіў на падворак.

– Ну, што там, сусед? – працягваючы правую руку для вітання, спытаўся ў Досты старэйшы Шпак.

– Вайна, Мікола! Саветы ўжо пад Слонімам.

– Так, – апусціўшы галаву, выціснуў праз зубы Мікола. Досту на хвіліну падалося, што Шпак нават і не здзівіўся, а прыняў страшную навіну як даўно чаканую.

– Чаго стаіце, хлопцы? – усміхаючыся, спытала Ганна, якая несла кош грэчкі з адрыны ў сені. Тыя насцярожана маўчалі. Ганна адчула, што з імі нешта не тое, потым, уважліва паглядзеўшы спачатку на Досту, а затым і на мужа, перапытала:

– Чаго маўчыце, га? – Мікола падняў галаву і напаўголасу сказаў:

– Вайна.

Ганна зніякавела, і на брукаваны падворак з перапоўненай лубянкі пасыпалася грэчка. Праз хвіліну цёплы восеньскі дзень агучыў моцны плач жанчыны. Дзеці, пачуўшы плач, павыбягалі з розных закуткоў хутара. Старэйшыя разумелі, што здарылася нешта страшнае, а малодшыя проста моцна перапалохаліся.

– Цішэй, дзяцей не палохай, – сказаў і павольна паплёўся прэч за Казікам гаспадар. Пастаяўшы каля брамы, мужчыны яшчэ перакінуліся некалькімі словамі і разышліся. Дзеці і Ганна ўжо чакалі бацьку ў хаце, той прысеў ля стала, апёрся на яго край і, не губляючы ўпэўненасці, павольна пачаў гаварыць:

– Ну, вось, дзеці, надыходзяць цяжкія выпрабаванні, будзем маліцца, каб усё ў нас было добра. Дай нам Бог спакойна перажыць змрочныя часы. А цяпер ідзіце і займайцеся тым, чым займаліся, бо сабраны ў гэтым годзе ўраджай будзе значыць для нас ой як шмат! Ты, Аркадзік, нікуды не едзь, пабудзь з намі, пакуль усё ўсталюецца. Дзеці разышліся па даручаных яшчэ з раніцы справах. Ганна, дачакаўшыся, калі ў хаце ўсё супакоіцца, звярнулася да мужа:

– Ну, што будзем рабіць, бацька?

– Казік казаў, што Кулак са сваімі бандытамі па мястэчку шастае, відаць, ужо ведае, што саветы пад Слонімам. Трэба тэрмінова хаваць усё каштоўнае, а то, крый Бог, наляціць, усё адбярэ. Толькі глядзі, каб дзеці не бачылі, а то як біць пачне – прызнаюцца малыя, тады ўсім капец.

Праз некалькі хвілін Мікола ўжо хаваў пад падлогай сякі-такі скарб. Гэтая непрыемная праца не прыносіла яму задавальнення, і ён яе як мага хутчэй скончыў. Прыкапаўшы пад падмурак сабраныя Ганнай рэчы, ён прываліў іх камянём і падняўся. Пасярод хаты, трымаючы ў руках ягоныя новыя боты, стаяла жонка.

– А што з імі будзем рабіць? Можа, таксама ў лёхах прыхаваем?

Гаспадар, нічога не адказваючы, абтрос выпацканыя нагавіцы і выйшаў на падворак. На хутары ўсё было ціха і спакойна. Ён яшчэ раз агледзеўся і павярнуў назад, і тут яму пад ногі з-пад ліпы вылецеў Ах.

– Пайшоў, каб ты здох! – прыкрыкнуў перапалоханы Мікола. Цяпер ужо Ах спужаўся не менш за гаспадара і ірвануў што сілы, прыціснуўшы вушы, да сваёй буды. Шпак усміхнуўся і, прыадчыніўшы дзверы ў хату, гучна спытаўся:

– А можа, давай іх пад сабачую буду прыхаваем? Ніколі не здагадаюцца.

Праз некалькі хвілін Ах стаў захавальнікам самага дарагога скарбу свайго гаспадара.

Дзень скончыўся ў вялікіх клопатах, хутар заснуў намнога пазней, чымсці звычайна. Але ні заўтра, ні праз некалькі дзён на хутары Кулак ці яго паплечнікі не з’явіліся. Мінула яшчэ адна сялянская восень, адскрыпела сцюдзёная зіма, за ёю праімчалі вясна ды лета, а ў Шпакоў ды іхніх суседзяў усё было як і раней, толькі розныя чуткі даходзілі з мястэчка і Зэльвы і будзілі ў душах насельнікаў Забаек насцярожанасць і страх.

Мікола яшчэ спаў, калі Ганна заўважыла, як па гасцінцы ад мястэчка ехалі дзве брычкі. У іх сядзелі ўзброеныя людзі.

– Мікола, уставай! Едзе нехта.

Мікола павярнуўся некалькі разоў у цёплай гусінай пярыне і няспешна падняўся, як і павінны падымацца людзі яго ўзросту. Навіна не застала яго знянацку. Візітантаў Мікола чакаў ужо не адзін дзень ці месяц. Надзеўшы нагавіцы ды вынашаную авечую камізэльку і на хаду прыхапіўшы з вешака шапку, гаспадар хутара павольна выйшаў на двор.

У гэты самы час, не чакаючы дазволу гаспадара, два савецкіх вайскоўцы адчынялі весніцы. Праз некалькі хвілін на сярэдзіну падворка, вагаючыся і паскрыпваючы ад перагрузу, заехалі дзве перапоўненыя людзьмі брычкі. З першай саскочылі яшчэ некалькі вайскоўцаў і, нічога не кажучы Шпаку, бесцырымонна зайшлі ў хату. Сярод нечаканых і нежаданых гасцей Мікола пазнаў Кулака, той, апёршыся на брычку, неадрыўна глядзеў на Шпака і з'едліва ўсміхаўся.

– Всё чисто, здесь только дети, – апавясціў усіх голас з хаты. Мікола нічога не разумеў. З брычкі, што стаяла бліжэй да ганку, саскочыў малады, гадоў дваццаці пяці, чалавек у форме афіцэра.

– Здравствуйце, хозяин, – стрымана павітаўся.

– Добры дзень, пан афіцэр! – зняўшы з галавы шапку, адказаў Шпак.

– Моя фамилия Доренко. Я политрук Красной Армии, – працягваючы Шпаку правую руку, прамовіў афіцэр. Мікола таксама падаў руку.

– Можа, у хату зойдзеце, падсілкуецеся з дарогі?

– А почему нет? – І, павярнуўшыся да Кулака, прамовіў: – Идём, председатель. – Кулак адмоўна пахітаў галавой.

– Ну, как хочешь.

– Сядайце, калі ласка, – ужо ў хаце звярнуўся да афіцэра гаспадар.

– Спасибо, – адказаў палітрук. Вайскоўцы таксама прыселі да стала. Ганна без слоў зразумела мужа і імгненна, прыхапіўшы з прыпяка гарачыя, толькі што спечаныя блінцы, падала на стол, на якім ужо стаяла патэльня са смажанымі сяканцамі і каўбасой. Вайскоўцы пераглянуліся і, адставіўшы да сцяны ружжы, нахвальваючы гаспадыню, наваліліся на ежу. Мікола прысеў на лаву ля акна. "Што ж будзе далей? – ліхаманкава думаў ён, – не есці ж сюды яны прыехалі".

І тут адазвалася Ганна:

– Мікола, а чаму гарэлкі не прапануеш гасцям?

Гаспадар адарваўся ад сваіх разважанняў і глянуў на едакоў.

Не паспеў ён хоць штосьці прамовіць, як афіцэр нечакана падняўся з крэсла, праглынуў кавалак секанца і, папраўіўшы партупею, прамовіў:

– Мы пить не будем. – Пасля гэтых слоў палітрука ўсе заўважылі, як рэзка змяніўся настрой за сталом. У адначассе прыемны сняданак ператварыўся ў звычайнае паглынанне ежы. А праз некалькі хвілін вайскоўцы наогул сталі вылазіць з-за стала. Прыхапіўшы ружжы, яны стрымана падзякавалі гаспадыні і па адным пачалі выбірацца на падворак. Як толькі дзверы за апошнім з іх зачыніліся, афіцэр нахіліўся праз стол да Міколы і прашаптаў:

– Это сотрудники НКВД, они здесь разыскивают пасобникав белополяков или местных помещиков и кулаков. Вот только вчера возле Белого Села арестовали панских холуёв, каторых вы называеце асадниками. Поэтому я бы поостерёгся с ними пить. – Затым іранічна ўсміхнуўся і дадаў: – Чтобы не закончить, как асадники.

Мікола трохі памаўчаў, а потым, гледзячы ў вочы афіцэру, спытаў:

– А вы?

– А я довожу до местного населения политику партии и Советского правительства.

– А Кулак кім у вас цяпер? – спытаў Мікола.

– Председателем сельского савета, – афіцэр падняўся з месца.

– Дык вы што ж, нават гарбату піць не будзеце? – у спіну адыходзячаму афіцэру кінула з кухні Ганна.

– В другой раз, сегодня некогда, – пасля гэтых слоў афіцэр узяў пад брылёк і выйшаў на двор.

Пакуль Шпак даваў распараджэнні жонцы, брычка з афіцэрам і энкавэдэшнікамі ўжо паварочвала на гасцінец. Выбегшы з хаты, Мікола толькі паспеў правесці яе вачыма. І тут хтосьці ззаду крануў яго за плячо. Мікола ведаў, хто гэта, і даволі спакойна стаў паварочваць галаву. Але раптоўны ўдар проста ў патыліцу ледзь не зваліў яго з ног.

– Што ж ты робіш, гад! – крыкнуў Шпак.

– А ты думаў, міраед, я з табой, як гэты расеец, буду цацкацца? Грошы давай ды золата! А калі скажаш, што няма, дык я цябе як жабу раздзяру!

І наступным ударам у твар Кулак зваліў гаспадара хутара на зямлю. Тут да раз'юшанага старшыні падскочыла Ганна, яе нечалавечы крык ды пранізлівыя просьбы на хвіліну падзейнічалі, і ён адступіў. Мікола падняўся і са злосцю прамовіў:

– Не было б тут дзяцей, размова нашая была б іншай! – Хоць гаварыў Мікола не гучна, аднак яго пачуў адзін з прыехаўшых з старшынёй. Мужчына спачатку нахабна ўсміхнуўся, гледзячы на Шпака, потым пагардліва сплюнуў сабе пад ногі і звярнуўся да Кулака:

– Слухай, Сцяпан, гэтая кулацкая морда яшчэ палохае. – Але той ужо адышоў і, праходжваючыся па надворку, ніяк не адрэагаваў на сказанае падначаленым. Міколу падалося, што горшае ўжо мінула, але тут раптам Кулак рэзка павярнуўся да Шпака і скамандаваў:

– А ну, падвядзіце яго сюды. Двое, што сядзелі на брычцы, лоўка саскочылі на зямлю і, адпіхнуўшы ўбок галасіўшую Ганну, пацягнулі Міколу за рукі да свайго камандзіра.

– Слухай, міраед, прыеду на днях, каб былі грошы і золата. – Потым, паклаўшы на плячо Шпака руку, дадаў:

– І боты, якія Ёсель пашыў. Зразумеў?

Міколу ўжо не было страшна, і ён спакойна спытаўся:

– Якія грошы, якія боты?

Але гэтых слоў Кулак ужо не чуў, а можа, і не хацеў чуць. Ён шпарка крочыў да брычкі і, толькі на хвіліну прыпыніўшыся, павярнуўся і выкрыкнуў:

– Шпак, тут дзесьці мой былы прыяцель Клімашэўскі шастае. На дэфензіву працаваў, паскуда. Дык, калі з'явіца на хутары, каб паведаміў, чуеш Шпак?

І ўжо, сеўшы ў брычку, дадаў:

– А я да цябе праз пару дзён заеду.

Праз хвіліны дзве брычка ўжо знікла за дарожнымі вербамі. Ганна, падхапіўшы ручнік, што вісеў каля рукамыйніка, падбегла да Міколы.

– Вось гад! – праз слёзы выціснула яна, – так моцна стукнуў.

Шпак пачакаў, пакуль жонка выцерла акрываўлены твар, потым сплюнуў і прамовіў:

– Я добра ведаю гэтую паскуду, ён абавязкова прыедзе. – Мікола яшчэ раз сплюнуў і паціху пайшоў да хаты. Дзеці стаялі пасярод падворка, пільна пазіраючы на сваіх бацькоў. Гандзя ціха ўсхліпвала, Аркадзік насцярожана маўчаў, а малодшыя, напэўна, не зусім разумелі, што адбылося.

Заснуць ноччу Мікола не змог. Ганна, адчуваючы, як перажывае муж, і сама падрамала толькі з вечара. А калі пеўні на хутары зацягнулі сваю першую песню, Мікола падняўся з ложка і, адшукаўшы чыстую вопратку і абутак, стаў паціхеньку збірацца.

– Ты куды? – усхвалявана спыталася гаспадыня. Мікола моўчкі працягваў зборы. – Ты што, нямко? – раздражнёна дапытвалася жонка. Шпак яшчэ хвіліну памаўчаў, як быццам абдумваў, што ёй адказаць, каб тая моцна не хвалявалася, і напаўголасу сказаў:

– У Зэльву паеду. Той малады афіцэр, што заязджаў да нас учора, як мне падалося, хоць савецкі, але прыстойны чалавек. Не знайду заступніка – нас альбо паб'юць усіх, альбо сашлюць да белых мядзведзяў.

Ганна, каб не пабудзіць дзяцей, прыкрыўшы твар далонямі, заплакала. Мікола падышоў да жонкі і, пагладжваючы яе па галаве, ціха прамовіў:

– Не плач, можа, яшчэ ўсё ўсталюецца.

Мікола яшчэ некаторы час пахадзіў па хаце, шукаючы нейкія рэчы, і, падхапіўшы з вешака шапку, накіраваўся на двор. Па надворку і ваколіцах слаўся шчыльны, як дым, туман. Шпак выйшаў за брамку. Вербы ля гасцінца, прыхіліўшыся адна да другой, драмалі, як зачараваныя прыгажуні. Іх станістыя целы шчыль-

на захутвала цёплая тумановая пярына. Толькі кудлатыя галовы выглядалі з-пад яе тоўшчы. А поўня, што хавалася за лесам, нібы прагнаная няўдзячнымі дзецьмі маці, усё адно прыглядала за вербамі і з замілаваннем цешылася іхняй прыгажосцю.

Мікола крочыў шпарка і хутка выйшаў на шашу. Праз гадзіны дзве ён ужо стаяў ля старога сапегаўскага будынка, што мясціўся каля зэльвенскай царквы. Даволі вялікі двухпавярховы дом знаходзіўся ў самым цэнтры Зэльвы, калоны і завужаныя ўверсе дзверы і вокны надавалі будынку незвычайную для павятовага гарадка прыгажосць. На пакрытым чырвонай чарапіцай даху на халодным восеньскім ветры балондаўся чырвоны сцяг. Ён хлёпаў сябе па баках, як фанатычны мусульманін, намагаючыся як мага хучэй адарвацца ад тронка і паляцець з гэтай чужой для яго краіны.

У дзверы будынка час ад часу заходзілі людзі ў форме, якая Міколу чамусьці нагадвала колер пачарнелай без вады бульбы, і людзі ў цывільным. Шпак без разважанняў рушыў у накірунку ўстановы. І толькі ён зрабіў некалькі крокаў, як яго нехта паклікаў:

– Хозяин!

Мікола павярнуў галаву і ўбачыў ззаду таго самага маладога расейскага афіцэра, што прыязджаў на хутар. Ён стаяў каля невялічкага грузавічка і прыветна ўсміхаўся.

– Добры дзень, пан афіцэр, – павітаўся Шпак.

– Вы к нам?

– Да вас прыехаў, пан афіцэр, паратунку шукаць, бо як толькі вы паехалі з хутара, Сцяпан Кулак стаў біццца ды золата патрабаваць.

Дарэнка азірнуўся па баках і, нахіліўшыся да Міколы, прамовіў:

– Тихо! Зачем кричать на весь город, пойдёмте со мной, – і накіраваўся па прыступках у тую самую ўстанову. Мікола зразумеў, што зрабіў штосьці не тое. Хвілінку паразважаўшы, ён пайшоў за афіцэрам. Падымаючыся за ім па прыступках, Мікола паспеў звярнуць увагу на салдата, што стаяў з ружжом каля дзвярэй, і на шыльду, што вісела з правага боку ад увахода: “Исполнительный комитет”.

Праз некалькі хвілін хады па вузкіх калідорах Дарэнка прыпыніўся, дастаў з задняй кішэні вязанку ключоў, знайшоў неабходны і адчыніў масіўныя дзьверы. Пакуль афіцэр скідаў шынель, Мікола аглядзеў пакой. Стол, крэслы, нічога лішняга. На сцяне вісеў партрэт. Мікола пазнаў таго, хто быў на ім, ён яшчэ да вайны, набываючы польскія газеты ды часопісы, часта бачыў там здымкі вусатага, з хітрымі вачыма, грузіна ў вайсковым фрэнчы. Мікола яшчэ не паспеў як след разгледзець партрэт, як яго аклікнуў Дарэнка:

– Ну, хорошо, расскажите, что там произошло? – палітрук сядзеў у крэсле ля вакна і ўважліва глядзеў на Шпака. Мікола прысеў на прысунутае бліжэй да стала крэсла.

– Пан афіцэр, няўжо савецкая ўлада хоча, каб мошкаўскі парабак, які ўсё жыццё дзённа і ночна працаваў, як конь, пад старасць стаў зноў галадаць? І ўжо не адзін, а з цэлай сям'ёй?

Шпак нечым імпанаваў Дарэнку. Можа, таму, што той чымсці нагадваў яму яго бацьку, які жыў на хутары пад Харкавам, а з прыходам савецкай улады быў прымусова перасялены ў вёску, дзе і сканаў ад голаду на пачатку 30-х. А можа, таму, што інтуіцыйна разумеў, што перад ім не кулак, які здабыў свой дабрабыт за кошт эксплуатацыі аднавяскоўцаў, а чалавек, які ўсё жыццё беспрасветна працуе. Зрэшты, яму, вайсковаму афіцэру, прайшоўшаму фінскую кампанію, недаспадобы было займацца допытамі ды арыштамі.

– Скажите, Шпак, вы нанимали батраков к себе на работу? – гледзячы ў вочы суразмоўцы, спытаў Дарэнка.

– У час жніва, калі сіл не хапала, наймаў, – упэўнена адказаў Шпак і пасля невялічкае паўзы дадаў: – Але і я з імі працаваў, а прыканцы кожнага тыдня грошы за працу выплочваў. А ваш цяперашні старшыня Сцёпка толькі біць людзей ды сядзець па паліцэйскіх пастарунках умее, нічога ў жыцці добрага не зрабіў і, канешне, не запрашаў парабкаў, бо куды ён мог іх запрасіць, не ў турму ж?

– Ну, мы сами разберёмся, кому в Западной Белоруссии быть представителем советской власти, – пасля гэтых слоў Да-

рэнка рэзка павярнуў галаву да вакна. У кабінеце стала ціха, як на пахаванні. За дзвярыма ў калідоры былі чутны чыесьці крокі, на якія суразмоўцы да гэтага не звярталі ўвагі. Па вуліцы зрэдку праязджалі машыны, б'ючы гукавымі хвалямі ў вокны кабінета. Надакучлівая муха, якая падчас размовы звінела, як падбіты аэраплан, у адначассе прытаілася на партрэце Сталіна. Дарэнка павярнуўся да Міколы:

– Вот, что я вам скажу, Шпак. Пока ещё не поздно, вступите в колхоз. Если вы откажетесь, то мне будет очень сложно спасти вас от судьбы асадника. Я надеюсь, вы меня понимаете?

У Міколы ўжо не засталося сумніву, што становішча ў яго вельмі складанае. Яшчэ трохі паразважаўшы, Шпак надламана прамовіў:

– Ну, калі вы гаворыце, што іншага выйсця няма, падказвайце, дзе можна запісацца ў той калхоз.

– Вы прямо здесь напишите заявление, а я его передам кому надо.

Учынак, які да сёння здаваўся Шпаку непрымальным ні пры якіх абставінах, быў здзейснены ў казённым пакоі за некалькі хвілін. На хутаранца нейк раптоўна накацілася незразумелае адчуванне роспачы, здавалася, што жыццё, якім ён жыў да сённяшняй раніцы, скончылася, і далей толькі пустэча. Усё, для чаго ён працаваў на панскіх палетках ды заводах Амерыкі, гінула з напісаннем гэтай заявы. Але нейкая незразумелая сіла вадзіла яго рукой. Неўзабаве на стале ляжаў дакумент, які дзяліў жыццё Шпака на дзве часткі – да калгаса і пасля. Дарэнка дастаў са стала папку з надпісам "Дело" і акуратна паклаў заяву Шпака туды.

– Вот і славно. А вы куда сейчас? А то я еду в местечко, мог бы и вас захватить до хутора.

Ужо праз некалькі хвілін два чалавекі сядзелі ў кузаве невялічкага грузавіка, які імчаў іх у накірунку мястэчка.

– Скажите, Шпак, – ужо зусім весела спытаў Дарэнка, – а што там за сапоги у вас, про каторые говорит вся округа?

– Ды гары яны гарам! Казала мне Ганна, каб не заказваў боты

ў Ёселя. Не – захацелася пакрасавацца! Стары дурань!

– Ну да ладно, чёрт с ними.

Калі грузавік прыпыніўся на паваротцы да хутара, Мікола злез на зямлю і, развітаўшыся са сваім нечаканым зычліўцам, падаўся дамоў. Халодны восеньскі вецер падганяў яго. Сонца, як падпаленае кола, шпарка кацілася за лес. Шпак спяшаўся, каб яшчэ да цямна трапіць дахаты. Падзеі, што адбыліся сёння з раніцы, не пакідалі яго ў спакоі.

– А можа, ён мяне падмануў? – разважаў, ідучы, Мікола. – А чаго пра боты спытаў? Няўжо забраць захацеў? А як там будзе ў тым яго калхозе? Усё, што зарабіў за сваё жыццё, прыйдзецца аддаць. Але – жыццё дзяцей даражэй. Тым асаднікам, якіх саслалі ў Сібір, ужо нічога не патрэбна, а дабро яшчэ нажывецца. Так разважаючы, Мікола прыйшоў на свой хутар. Дома яго ўжо даўно чакалі. Жонка, каб спытаць, як там усё склалася ў Зэльве, і дзеці, каб паласавацца цукеркамі. Але бацьку, можа, упершыню, было не да цукерак. І толькі Мікола ступіў на падворак, як Ганна яшчэ з ганка насцярожана спытала:

– Ну, што там, Мікола?

– Халера яго ведае, Ганна. У калхоз запісаўся.

– Ты што, здурнеў?! – ахнула Ганна. – Чым дзяцей будзеш карміць, калі ўсё прыйдзецца аддаць. Як у Расеі – мякінаю?

Мікола паглядзеў на жонку і спакойна спытаў:

– А ты лепш да белых мядзведзяў паедзеш?

– Як? А за што? – яшчэ больш расхвалявалася жонка.

– Годзе балбатаць, стаў вячэру ды дзяцей кліч.

Праз хвіліну сям'я Шпака села вячэраць.

Раненька, калі дзеці яшчэ спалі, на хутар прыехаў Сцяпан Кулак. Мікола выйшаў на двор і адчыніў браму. Усе прыехаўшыя, як і сам старшыня, былі з Мошак. Шпак іх ведаў. Не чакаючы пакуль конь прыпыніцца, старшыня саскочыў на брукаванку і накіраваўся да гаспадара.

– Ну, што, кулацкая морда, я ж абяцаў прыехаць – вось і

прыехаў. – Грошы гані, міраед!

– Якія грошы ў звычайнага калгасніка? – нейк падазрона спакойна адказаў Шпак.

Кулак нічога не зразумеў. Тут з хаты выбегла Ганна і проста з ганка зацягнула на ўвесь хутар:

– А людцы мілыя, што ж гэта робіцца? Ты што, простых калгаснікаў рабаваць сабраўся, га?

Гэтая ўпэўненасць жанчыны так усхвалявала дагэтуль рашучага Кулака, што нават прыехаўшыя разам з ім паплечнікі заўважылі раптоўную разгубленасць старшыні. Адчуўшы, што падзеі разгортваюцца не па яго сцэнарыі, здзіўлены навіной Кулак паспрабаваў сітуацыю нарэшце выправіць.

– Ведаеш, што я табе скажу, Шпак. Стаць калгаснікам без маёй згоды табе наўрад ці ўдасца. Хопіць тут лухту несці. Дзяўбеш, як дзяцел – калгаснік, калгаснік...

Кулак быў пакіраваўся да брычкі, але раптам прыпыніўся і рашуча павярнуў да Шпака:

– А боты дзе?

Мікола ведаў, што рана ці позна Кулак усё ж спытаецца пра боты, і загадзя падрыхтаваў адказ:

– Дык перад самым адыходам палякаў іх забраў твой былы сябар Клімашэўскі.

Мікола гаварыў спакойна і ўпэўнена. І раптам ён убачыў Аха, які... цягаў ля будкі зрэб'е, у якое Шпак загарнуў боты. "Мой ты Божа, няўжо выцягне, няўжо выцягне?"– зніякавела падумаў і адчуў, як затахкала сэрца. Але Ах залез у буду і больш адтуль не паказваўся.

– Ну, Шпак, дазнаюся, што падмануў, – і калгас цябе не ўратуе.

Кулак яшчэ хвіліну пахадзіў каля ганка і, махнуўшы рукой сваім падначаленым, спрытна заскочыў на брычку, якая рушыла ў накірунку гасцінца. Мікола моўчкі стаяў ля весніцаў, праводзячы вачыма старшыню і яго хаўруснікаў.

– Што ты яму сказаў? – спытала ў мужа Ганна.

– Што Клімашэўскі боты забраў.

– Ох, калі ён дазнаецца, што боты пад будаю ляжаць, – заб'е. І дзяцей не пашкадуе.

Мікола злосна зыркнуў у бок жанчыны:

– Каб я гэтаму бандыту свае боты аддаў? Ніколі! Пайду прыкапаю глыбей, каб крый Бог, Ах не дастаў.

Восеньскі дзень выдаўся надзвычай сонечным і цёплым. На местачковай плошчы каля царквы сабралася народу, як на Вялікдзень. Тут былі і местачкоўцы, і гаспадары з вакольных хутароў, і ваенныя, што круціліся пераважна каля грузавіка. На яго кабіне стаяў вялізны рупар, з якога па ўсім мястэчку разносіліся савецкія песні. Трошкі наводдаль ад палутаркі яшчэ два чалавекі ў вайсковай форме майстравалі доўгія лавы. За імі наглядаў маладжавы міліцыянт, пэўна, з мясцовых, які падыходзіў то да Кулака, то да палутаркі. Мікола, убачыўшы Сцяпана, які чамусьці камандаваў вайскоўцамі і міліцыянтам, сам сабе падумаў: "Гэты бандыт і тут начальнікам стаў".

Людзі, што сабраліся на плошчы, перакрыкваючы песні з рупара і адзін аднаго, энергічна абмяркоўвалі местачковыя навіны. Але сход, які павінен быў пачацца тут праз некаторы час, турбаваў людзей найбольш. Тыя, хто заўважна адрозніваўся ад астатніх крамным адзеннем і разважнымі паводзінамі, запэўнівалі астатніх, што нізавошта не аддадуць свае зямельныя надзелы ў калхоз. Другія, у лапцях ды брудных лахманах, услых лаялі першых і пераконвалі, але ўжо адзін аднаго, што тых надзелаў мелі мала, і турбавацца няма чаго. А трэція, якіх было больш за ўсіх, толькі выслухоўвалі і тых, і другіх, але ніяк не маглі вырашыць, да якой групоўкі далучыцца. І толькі габрэі, што стаялі трохі наводдаль, вялі размову пра нешта сваё, выразна дэманструючы, што зямельная справа ў дадзеных варунках іх зусім не цікавіць.

Але ўвесь люд на плошчы аднадушна замаўкаў, калі па натоўпе кацілася вестка пра ўжо арыштаваных альбо сасланых саветамі.

Дый брак якойсьці праўдзівай інфармацыі наконт будучага сходу нараджаў у людзей многа непатрэбнай мітусні і страху.

У гэты самы час з-за царквы выпаўз чорны легкавік. З яго павылазілі людзі ў савецкай вайсковай форме. Сярод іх Мікола пазнаў свайго знаёмага Дарэнку. Пасля вітання з партыйным актывам мястэчка і нядоўгай размовы з Кулаком прыехаўшыя прайшлі да накрытага чырвоным прасцірадлам стала. Па-гаспадарску расселіся за ім і расклалі свае паперы. Кулак паклікаў міліцыянта і падаў таму складзены ўдвая лісток. Той подбегам рушыў у накірунку царквы. Наблізіўшыся да насцярожанага натоўпу, ён уважліва акінуў яго поглядам і гучна спытаў:

– А дзе Серадзіха?

– Дык вунь яна, на возе спіць.

І сапраўды, немаладая жанчына, накрыўшыся нейкім зрэб'ем, храпла як пшаніцу прадаўшы сярод расхрыстаных драбаў.

– А ну давай яе сюды! – камандным голасам загадаў міліцыянт.

Разбуджаная Серадзіха спаўзла на зямлю і, абтросшы з андарака салому, накульгваючы на адляжаную нагу, пасунулася да міліцыянта.

– Чаго табе?

– Вось табе запіска. Як толькі ўсе пасядуць, ты павінна падняцца і прачытаць тэкст уголас. Але гучна, каб усе пачулі. Зразумела?

Серадзіха згодна кіўнула галавой. Ванда Серада, менавіта так звалі Серадзіху, належала да адной з самых бедных сем'яў у мястэчку. Яе маці даволі рана асірацела і, не маючы поўных шаснаццаці год, засталася адна ў невялічкай хатцы паблізу гасцінца, што вёў са Слоніма ў мястэчка. Геаграфічнае месцазнаходжанне хаціны і малады ўзрост гаспадыні праз некаторы час прынеслі свае вынікі. Ужо праз некалькі гадоў маці цяперашняй нашай гераіні ўжо мела трох байструкоў. Сярод местачкоўцаў гэтых дзяцей называлі Гасцінцовымі. Ванда была старэйшай з траіх і зараз ужо мела гадоў сорак. Працуючы з маленства парабкам у

мясцовых габрэйскіх крамах, трохі навучылася пісаць ды чытаць па-расейску. Гэтая акалічнасць і дазволіла даручыць ёй такое адказнае заданне.

Да натоўпу падышоў Сцяпан Кулак, акінуў вокам граmаду і скамандаваў:

– Сядайце, мужыкі.

Праз некалькі хвілін будучыя калгаснікі ўжо расселіся, напружана думаючы, што ж будзе далей. Насупраць іх за пастаўленым загадзя сталом сядзеле начальства з Зэльвы. Кулак таксама заняў месца ў прэзідыуме. І тут паднялася народная "глашатайка" Серадзіха і, не адрываючы вачэй ад тэкста, гучна зачытала па складах:

– Мы, жы–ха–ры За–хо–дняй Бе–ла–ру–сі, дзя–ку–ем савец–кую ў–ла–ду, што я–на ас–ва–ба–дзі–ла нас. Ад поль–ска–га іга–га...

Госці за сталом усміхнуліся. Але людзям было не да смеху. Яны насцярожана чакалі, што ж будзе далей? Тым часам з-за стала падняўся чарнявы, з вялікім гарбатым носам, чалавек. Ён падзякаваў усім за мажлівасць выступіць і па-расейску, праглынаючы літару "р", пачаў расказваць, дзеля чаго ўсе на гэтай плошчы сабраліся. Але тут нехта з прысутных мужчын гучна пажартаваў:

– Паглядзіце, рыхтык брат нашага Іцка з цырульні!

Сярод натоўпу раздаўся прыглушаны смех. І толькі рука старшыні, паднятая ўгору, спыніла перасмешкі. Выступоўца набраў належны тэмп і гаварыў спраўна і прыгожа, часта ўжываючы словы "камунізм", "пралетарыят", "гегемон".

Местачкоўцы і мясцовыя сяляне, пачуўшы мудрагелістыя словы і пашаптаўшыся, зрабілі выснову, што выступоўца гаворыць па-габрэйску, і таму ўсё ім сказанае датычыцца толькі мясцовых гандляроў ды гаспадароў местачковых майстэрняў, а не сялян. Але тут чарнявы скончыў прамову і заняў сваё месца за сталом. Пасля яго адзін за адным пачалі браць слова ўсе прыехаўшыя на легкавіку. Ужываючы рознага кшталту аргумен-

ты, яны наперабой спрабавалі пераканаць мясцовых жыхароў у неабходнасці стварэння ў мястэчку калхоза. Слухачы толькі нярвова палілі самасад і абыякава паглядалі на прыехаўшых.

І вось нарэшце чарга дайшла да Дарэнкі. Гаварыў ён, у адрозненне ад папярэднікаў, проста і зразумела. А тут яшчэ кідаліся ў вочы ўзнагароды, што красаваліся на афіцэрскім фрэнчы маладога афіцэра. І ўжо неўзабаве нават Серадзіха ўсвядоміла, што калгасу ў мястэчку быць.

Міколу ў гэтым трагікамічным спектаклі цікавіла толькі адно: ці прымуць у калхоз яго. Бо калі адмовяць, то невядома, дзе будзе яго сям'я заўтра.

І тут нейкі актывіст якраз аб'явіў галасаванне. Пасля аднадушнага падымання рук той жа актывіст прапанаваў абраць старшыню калхоза. Сход раптоўна ажыў, людзі пачалі выкрыкваць з месцаў. Самыя актыўныя паўставалі з лавак. Здавалася, што натоўп губляе арганізаванасць. Тут з-за стала падняўся і загаварыў Кулак, які да гэтага не прамовіў ні слова.

– У калгас павінны ўступіць усе, – тут ён паглядзеў на Шпака і дадаў: – Акрамя, канешне, кулакоў.

У Міколы перахапіла дых: "Ну, усё, капец. Знішчыць мяне задумаў, сабака".

Але тут зноў падняўся Дарэнка:

– Нет, в колхоз будут приниматься все желающие, ещё раз повторяю для вас, Кулак. Всё!

Увесь люд як па камандзе сціх. У ваколіцах мястэчка ніводзін чалавек не мог так размаўляць з Кулаком. І калі малады афіцэр асмеліўся, значыць, ён вельмі важны альбо вельмі смелы чалавек. Кулак са злосцю глянуў у вочы Дарэнку, той у сваю чаргу глядзеў на яго. Хвіліна маўчання. І тут Дарэнка павярнуўся да людзей:

– Товарищи! Совесткая власть никогда не будет с теми, кто не желает памочь установлению её на освобождённой от белополяков территории. Но и отказать тем, кто решил связать свою судьбу с создаваемыми в освобождённых областях Белоруссии колхозами, мы тоже не можем, да и не должны!

Людзи мала што разумелі з таго, што гаварыў па-расейску гэты малады афіцэр, але па ягонай ўпэўненасці яны адчувалі, што ён тут самы галоўны.

Сход яшчэ цягнуўся не адну гадзіну, але Шпака ён мала хваляваў. Падтрымка Дарэнкі выратавала яго сям'ю ад высылкі і раскулачвання, але ці надоўга?

Пасля сходу прайшло шмат часу, жыццё ў нядаўна створаным калхозе бурліла. Ці было яно выгодным для сялян і местачкоўцаў, ніхто яшчэ толкам не разабраўся. Пачыналася лета 1941 года. У мястэчку пабольшала вайскоўцаў, былыя памяшканні колішняга сапегаўскага палаца пераабсталявалі пад вайсковыя кашары, па наваколлі будаваліся абарончыя валы ды дзоты. Мікола часта прыязджаў у мястэчка па справах і ўсё гэта бачыў на свае вочы. З шматлікіх размоў ён зрабіў выснову, што адносіны саветаў з немцамі пагоршыліся, ад былых пацалункаў пасля падзелу Польшчы не засталося і следу. Усе жыхары мястэчка разумелі, што паміж былымі саюзнікамі можа пачацца вайна, пытанне было толькі ў тым – калі?

Пабыўшы ў праўленні калхоза, паразмаўляўшы са знаёмымі, Шпак ужо збіраўся адправіцца ў Забайкі, але тут успомніў, што Ганна прасіла яго заехаць у краму ды набыць цукру, сёлета, як ніколі, многа было вішні. Мікола заўсёды заходзіў толькі ў адну краму, да Мойшы Маньскага, там і кошты былі меншыя, ды і знаў ён гаспадара вельмі даўно. Вось і цяпер Шпак рашуча адчыніў дзверы Мойшавай крамы.

У краме было пуста. Ён прыслухаўся, на складзе нехта зычна галасіў. Шпак удыхнуў паветра і моцна галёкнуў:

– Ёсць тут хто? – На складзе прыціхлі, а праз хвіліну ў краму ўбег узбуджаны Мойша.

– О, Мікола, а я думаю, хто там да мяне завітаў. Пэўна, па цукар Ганна выправіла?

– А ты адкуль ведаеш?

Гаспадар крамы тым часам ужо выцягваў з-за прылаўка вялікі мех цукру.

– Дык Дышка Айзіковіч казаў.

Мікола добра ведаў чалавека, пра якога гаварыў Мойша. Да саветаў Дышка займаўся арэндай садоў у вакольных фальварках і нават цяпер, калі паўсюль ішло калгаснае будаўніцтва, добра ведаў, у каго з гаспадароў які ураджай.

– Дык колькі насыпаць, Мікола?

– Давай кіль пяць.

– А ці не мала будзе?

– Не, якраз.

– Слухай, Мікола, ты чуў, што хутка пачнеца вайна?

– Так, Мойша, пачнецца.

– А ты ведаеш, што яны, гэтыя фашысты, робяць з габрэямі?

– Ведаю, Мойша, хай іх халера пабярэ.

– Дык я кажу сваёй жонцы: трэба ўцякаць з мястэчка, а яна шкадуе пакідаць краму.

– Раней трэба было ўцякаць, яшчэ ў 39-м, а цяпер позна, хто ж цябе выпусціць зараз.

– А чаго ты не ўцякаў, ты ж быў у Амерыцы.

– Не, Мойша, я ўжо адсюль нікуды. Куды я з дзецьмі дзенуся? А іх у мяне вунь колькі.

Мойша падаў Шпаку кужэльную торбу, напоўненую цукрам, і разборліва, каб добра было чутно пакупніку, назваў цану. Шпак разлічыўся, падзякаваў гаспадару крамы і выйшаў да сваёй брычкі, якая была прывязаная тут жа, каля брамы. Паклаўшы тавар у брычку, шлёгнуў цяпер ужо калгаснага каня ляйчынай і накіраваўся на гасцінец, што вёў на хутар...

– Мікола, прачынайся, мястэчка гарыць!

– Дзе гарыць? Што гарыць? – гаспадар са сну не разумеў, што адбываецца. Ён выглянуў у вакно. І сапраўды, мястэчка гарэла, нейкі незразумелы гул то набліжаўся, то аддаляўся. Мікола павярнуўся да жонкі і спакойна, нават неяк абыякава, сказаў:

– Вайна пачалася.

Жонка загаласіла.

– Ціха, дзяцей пабудзіш, дурніца!

– Што цяпер будзе?

– А нічога, саветы паўцякаюць, і ўсё здадзенае ў калхоз дастанецца таму, хто першы трапіць на калхозны двор. Трэба тэрмінова бегчы і забіраць назад сваіх коней, кароў, усё, што яшчэ ацалела.

– Ты што – здурнеў!? – праз слёзы ўсхліпнула жонка, – хай яны паздыхаюць, твае коні і каровы, каб ты жыццём рызыкаваў за скаціну. Не пушчу!

Ад лаянкі бацькоў прачнуліся старэйшыя дзеці. Яны ўпотай слухалі сварку, што заўважыў Мікола:

– А ну, пайшлі спаць!

Тым часам ужо развіднела, і Мікола пайшоў пакарміць тую нешматлікую, жыўнасць, якая засталася пасля стварэння калхоза. Яму неяк не працавалася, і ён няўзнак ля прысадаў падаўся да Досцінага хутара. Праз хвіліну суседзі сустрэліся і пачалі абмяркоўваць, як ім вярнуць з калхоза сваю скаціну і ацалелае пасля пажару дабро.

– Трэба ехаць менавіта цяпер, пакуль яшчэ скаціну не паразбіралі ці не пабілі, – прамовіў Казік.

– А калі саветы яшчэ не пайшлі з мястэчка, што тады будзем рабіць?

– Мы спачатку агледзімся, паціхеньку, і – дахаты.

– Ага – дахаты. Паб'юць нас, як курапатак. Ну, але ўсё роўна – ехаць трэба.

Праз гадзіну па гасцінцы, што вёў да мястэчка, бег вазок з двума забайкаўскімі "калхознікамі". Калі яны выехалі на зэльвенскую шашу, то пабачылі жудаснае відовішча. Абапал дарогі гарэлі машыны, санітары ў акрываўляных халатах цягнулі нявedama куды параненых чырвонаармейцаў. Над шашою слаўся едкі дым, стаяў рэзкі смурод ад паленай гумы. Усюды валяліся рэшткі

тэхнікі ды кавалкі чалавечых і конскіх целаў. Раптам аднекуль выскачыў чалавек з рэвальверам, у бруднай ваеннай форме, з перабінтаванай галавой. Ён схапіў за вуздэчку каня забайкаўскіх хутаранцаў і пацягнуў яго ўбок з дарогі. Суседзі былі настолькі ўражаныя ўбачаным, што і не думалі аказваць супраціўленне. Непадалёк ад старых габрэйскіх могілкаў, каля паламаных і абпаленых бярэзін, адзін каля аднаго ляжалі дзясяткі параненых.

Вайсковец адпусціў вуздэчку і скамандаў:

– А ну, мужики, подмогите! Вы что, вашу мать, по-русски не понимаете!?

Мікола тут жа схапіў параненага за акрываўленыя абмоткі на нагах і разам з афіцэрам паклаў яго на падводу. Казік падняў пад пахі аднаго з ляжачых, але вайсковец прыкрыкнуў:

– Куда ж ты его тащишь, он же мёртвый!

Казік дарэшты разгубіўся, яму ніколі не даводзілася бачыць столькі смерцяў адразу. Праз хвіліну падвода была поўнасцю загружана, афіцэр махнуў ляйчынай, і перапоўненая падвода рушыла ў мястэчка. Шпак і Доста, як заварожаныя, стаялі на тым самым месцы, дзе іх пакінулі. Разгубленыя ад убачанага, мужчыны нават і не думалі спытаць у афіцэра наконт каня. Урэшце мужчыны моўчкі папляліся да мястэчка. Ужо з дарогі было бачна, што пад раніцу тут дасталося ўсім – і ваенным, і габрэям, і сялянам, што жылі па ўскраінах. У мястэчку панаваў хаос: хтосьці бегаў па дварах, спрабуючы з агню ўратаваць пазасталыя рэчы. Хтосьці збіраўся наўцёкі, укладваючы клункі на падводы. Але больш усяго Міколу ўразілі руіны, на якіх было зусім ціха.

Суседзі праз пару хвілін шпаркае хады падышлі да калгаснага двара. На дзіва, усё калгаснае дабро засталося некранутым. Коні, якія моцна былі напалоханыя начнымі ўзрывамі ды пажарамі, усхвалявана храплі і насіліся па бязлюднай стайні. Каровы, якіх сёння ўжо ніхто не збіраўся даіць, раўлі на ўсё мястэчка. Мужчыны без асаблівых праблем знайшлі сваю скаціну і, сагнаўшы яе ў адзін статак, рушылі на свае хутары ў абход зэльвенскай шашы. Толькі пад вечар яны дабраліся да Забаек. Іх расказ пра ўбачанае

ў мястэчку напалохаў нават дзецей, якія яшчэ думалі пра вайну як пра нейкую рамантычную забаву. Жанчыны сядзелі на ганку Досцінае хаты і толькі войкалі ды хіталі галовамі.

– Божа, што ж гэта будзе? – спытала Прузына, жонка Досты.

– Страшная будзе вайна, каб хоць дзяцей зберагчы, – панурыўшы вочы ў зямлю, прамовіў Мікола.

– Божа мой, Божа, і ўсё на нас – то саветы, то немцы. І калі гэта ўсё скончыцца? – азвалася Ганна.

– Ды ўжо, пэўна, ніколі, – panыла адказаў Казік.

Адчуваючы, што размова вядзе ў нікуды, Мікола рашуча падняўся з прыступкаў:

– Так, разыходзімся па хатах, – і пайшоў да коней, што пасвіліся за садам Досты. За ім падаўся і Доста. Разам яны сагналі ў адно месца кароў ды коней, што разбрыліся па выгане. Ноч надыходзіла на Забайкаўскі хутар ад лесу, і хутаранцы з нецярпеннем чакалі яе, бо болей не мелі сіл перажываць тое, што ўбачылі на працягу гэтага страшнага дня. Нават вайна і тая павінна адпачываць. А тут сяляне, якія акрамя вілоў ды пугі ніякай зброі ў жыцці не бачылі. Што з імі будзе заўтра, не ведаў ні цёплы чэрвеньскі вецер, што далятаў ад цёмнага лесу, ні залітае чырванню летняе неба....

Некалькі дзён за лесам грымела кананада, усе насельнікі хутара чакалі пераменаў да горшага. І вось праз пару дзён выбухі заціхлі, навокал стала як і да вайны – ціха і спакойна. У дзяцей на тварах сталі зноў з'яўляцца ўсмешкі, жанчыны пачалі часцей прыбіраць хаты і падворкі. Але мужчыны ведалі, што зацішша часовае.

Мікола касіў за адрынаю атаву, калі да яго прыбег перапалоханы Юзік.

– Тата, тата, хадзем, да нас прыехалі нейкія людзі! – і яшчэ больш спалохана дадаў: – І яшчэ два немцы!

Мікола працёр скошанай травой касу і павесіў яе на гру-

шу. Бацька з сынам накіраваліся на падворк. Каля ганка стаяла фурманка Кулака. Але на ганку стаяў не Кулак, а Клімашэўскі. Той самы Альбін Клімашэўскі, які яшчэ перад прыходам саветаў запыняў яго разам з Кулаком каля местачковай царквы.

– Ну што, міраед, думаў, што мяне застрэлілі?

– А мне што, – апусціўшы галаву, ледзь чутна прагаварыў Мікола. І тут Клімашэўскі з развароту ўрэзаў Шпаку нагой проста ў пах. Той снапом зваліўся на зямлю.

– У калхоз запісаўся, пся крэў?! – і зноў ударыў ляжачага на зямлі Шпака. Худы, як хрушч, немец, што сядзеў на падводзе, саскочыў долу і шпарка падышоў да Клімашэўскага. Той хацеў яшчэ раз прыкласціся, але немец адрывіста крыкнуў: "Nein!" і адштурхнуў паліцая ўбок. Пасля гэтага немец падышоў да Шпака і дапамог яму падняцца. Толькі цяпер Мікола ўважліва разгледзеў Клімашэўскага. Той быў апрануты ў чорны мундзір, на галаве ў яго была фуражка з нейкім значком, на рамяні вісеў рэвальвер у карычневай кабуры, а на нагах паблісквалі чорныя хромавыя боты. Тут да Шпака падышоў яшчэ адзін чалавек у нямецкай форме і без акцэнта па-руску спытаў:

– Почему он вас так не любит, хозяин?

– Не ведаю, – пастогнваючы, адказаў Шпак, – пэўна, за тое, што я маю хутар, а ён не мае. І мець ніколі не будзе.

– Знаете, хозяин, ему лошадь и телега нужны, вы отдадите ему? – чалавек у нямецкай форме, сказаўшы гэта, павярнуўся і, не чакаючы адказу, пакрочыў да падводы. Уладкаваўшыся на ёй, ён пачакаў, пакуль усядзецца ззаду худы немец, таўхануў дулам аўтамата ў спіну возчыка з такой жа павязкаю, як у Клімашэўскага. Падвода хутка схавалася за Шпаковым мурам. Мікола застаўся сам-насм са сваім старым знаёмым Клімашэўскім.

– Каня запрагай, кулацкая морда! – скамандаваў той і паклаў руку на кабуру.

"Баіцца, бандзюга, – падумаў Мікола, – а можа, заманіць у стайню ды – сякерай?" Але вернуцца хаўруснікі, убачаць, што няма Клімашэўскага, і ўсіх паб'юць. Шпак, накульгваючы, запрог

каня ў брычку. Паліцай падышоў да яго і пагладзіў па грыве. Конь спалохана захроп і ледзьве не рвануў з месца.

– Стой, кулацкі вырадак! – Клімашэўскі тузянуў за ляйчыну. Конь застыў на месцы, косячы вокам па баках. Шпак не мог глядзець, як здзекваюцца з яго ўлюбёнага каня, вылаяўся і пайшоў у хату.

– Стой, Шпак!

– Чаго яшчэ?

– Як чаго? – навязаўшы каня за брамны слуп, паліцай падышоў да Шпака.

– Боты дзе?

– Кулак забраў, калі ты ўцёк з мястэчка.

– Ну-ну! Нікуды я не ўцякаў, проста адступіў з польскімі вайскамі. А твой хвалёны Кулак цяпер сам уцёк, як заяц.

– Ну, вось якраз у маіх ботах і ўцёк, – ужо зусім іранічна адказаў Шпак. І гэтая яго абыякавасць, мусіць, і дапамагла Клімашэўскаму яму паверыць. Ён адвязаў каня, шлёгнуў яго пугай, і брычка кранулася з двара...

Настала першая, халодная і суровая, ваенная зіма. Ночы былі доўгія, доўгімі былі і акупацыйныя дні. Як толькі небакрай пакрывала чырвоная ранішняя зараніца і першыя сонечныя промні слізгалі па стрэхах хатаў, паліцаі з мястэчка выбіраліся ў Забайкі. Падсілкаваўшыся з "доўгай" дарогі і апахмяліўшыся з холаду, браліся насаджаць "новы парадак".

...Ах заліўся гучным і насцярожанным брэхам. У вакно, што было ад падворка, нехта пастукаў. Праз хвіліну лямпа ажывіла хату святлом. Мікола падкруціў кнот, насунуў на ногі валёнкі і, накінуўшы на плечы кажух, выйшаў у сені.

– Хто там?

– Мы, – прагучаў глухі голас за дзвярыма.

– Хто мы?

– Эй, Шпак, зараз як дам чаргу па дзвярах з аўтамата, адразу зразумееш хто. Адчыняй, каму кажу!

Не паспеў Мікола адступіць убок, як дзверы адчыніліся і, адштурхнуўшы гаспадара, у сені зайшоў каржакаваты барадаты мужчына. Мікола падняў лямпу на ўзровень твару і ледзь не зваліўся ад нечаканасці – перад ім стаяў Сцяпан Кулак. Яго пякучыя злосныя вочы свідравалі Міколу навылёт.

– Ну што, Шпак, здарова.

– Вечар добры, – насцярожана адказаў Мікола. Тут жа за былым старшынёй сельсавата ў сені ўваліліся яшчэ два чалавекі.

– Запрашай на вячэру, гаспадар, – праз зубы выціснуў Кулак і сам, не чакаючы запрашэння, зайшоў у хату. Яго спадарожнікі пацягнуліся за ім. Пераступіўшы парог, старшыня агледзеўся і, не распранаючыся, прысеў каля стала. Тыя, хто прыйшлі з Кулаком, моўчкі паселі побач. Ганна ў гэты час стаяла каля печы, накінуўшы на плечы грубую вязаную хустку.

– Ну, што ўзіраешся, баба? – адрывіста прамовіў адзін з чужакоў, – есці давай!

Ганна паглядзела на мужа і пайшла на кухню. Мікола паставіў лямпу на стол, падсунуў бліжэй да яго крэсла і прысеў насупраць Кулака. Той, не падымаючы галавы, прамовіў:

– Ну што, Шпак, як будзем дапамагаць партызанам?

– Якім партызанам?

– Шпак, цяпер гуляць з табою ніхто не будзе. Гэта да вайны ты мог схавацца за таго маладога афіцэра, а цяпер – я тут галоўны, – і, глянуўнуўшы з-пад ілба на Шпака, дадаў: – А таму ты павінен даць нам золата, коней, ежу і цёплую вопратку.

– Але ж Клімашэўскі адсюль усю восень не вылазіў: і каня забраў, і брычку, нават курэй пастраляў, падлюка, – прамовіў Мікола.

Кулак зірнуў на аднаго са сваіх паплечнікаў:

– У хлеў! Паглядзі, што там у яго ёсць. – Той імгнення знік за дзвярыма.

– Ты кажаш, што нямецкі халуй Клімашэўскі часта тут бывае. А можа, ты з ім заадно? – пагрозліва спытаў Кулак, потым усміхнуўся і дадаў: – Ну, а як твае боты, не ціснуць яму?

Мікола змаўчаў. Ганна падала на стол капусту, прыгатаваную на свіной костцы, і заскварaную бабку. Тут дзверы адчыніліся, і ў хату зайшоў пасланы ў хлеў партызан.

– Ну, што там?

– Толькі карова ды старая кабыла.

– А пляшка дзе? – злосна паглядзеўшы на гаспадара дома, спытаўся Кулак.

– Дык выгнаць няма з чаго, усё немцы паадбіралі, толькі на сяўбу трошкі і прыхаваў.

Трэці партызан, які ўвесь час маўчаў, расшпіліў зялёную савецкую фуфайку і выцягнуў аднекуль з-за пазухі вайсковую біклагу. Пабоўтаў і спрытна наліў у пададзеныя Ганнай алюміневыя кубкі. "За пабеду!"– сказаў Кулак, і партызаны дружна выпілі, пасля чаго сквапна накінуліся на ежу. Шпак сядзеў за сталом моўчкі. Падсілкаваўшыся ды выпіўшы ўсю біклагу, начныя візітанты павесялелі. Кулак адклаў лыжку ўбок і звярнуўся да гаспадыні:

– Ну ты, Ганна, смачна гатуеш.

– Спадабалася, дык дзякуй Богу, – абыякава адказала жанчына.

– Так, Шпак, запомні. Да цябе будуць прыходзіць нашы людзі, ты ім харчы давай ды прытулак.

Мікола пачухаў лысіну, пакруціў галавой у розныя бакі і ціха прамовіў:

– А што я ім дам, калі ў мяне запасаў няма? Чым дзяцей карміць буду?

– Знайшоў што на стол паставіць, знойдзеш што і даць, – беручы аўтамат, спакойна прамовіў Кулак. – А калі пакрыўдзіш маіх хлопцаў, то я да цябе, кулацкая морда, сам прыйду.

Не развітваючыся, начныя госці выйшлі за дзверы. Мікола зачыніў за імі дзверы і паныла сказаў жонцы:

– Цяпер наша жыццё ператворыцца ў пекла: днём – паліцаі, ноччу – партызаны.

Раніцай сапраўды на хутар заявіўся Клімашэўскі.

– Ты што, партызанаў корміш, што так доўга не адчыняў? – злосна спытаўся адразу з парога. – А нас чым пачастуеш?

Ганна моўчкі прынесла на стол тое, што засталося ад начных гасцей.

– А самагонка?

– Нават на лекі няма.

Паліцаі без ахвоты ўзяліся даядаць тое, што засталося з ночы. Клімашэўскі да ежы не дакрануўся, плюнуў сабе пад ногі і скамандаваў:

– Пайшлі адсюль! – І павярнуўся да гаспадара: – А Кулак у маіх ботах быў? – Не пачуўшы адказу, паліцай звёў бровы і, патросшы пальцам перад тварам Шпака, прыгразіў:

– Ну пачакай, кулацкая морда, за ўсё адкажаш!

Бразнулі дзверы. Мікола ўздыхнуў і сеў на лаву.

– От, скажы ты! Ужо год мінула, як яны па чарзе сюды ездзяць і ўсё пра боты пытаюцца. Каб сказаць Ёселю, што яго боты гэтак цэняцца. Ды, пэўна, загінуў Ёсель восенню, калі за мястэчкам габрэяў пастралялі.

– Божа, мой божа, – забожкала Ганна, – а колькі іх там было?

– Дакладна не ведаю, але Дыцко казаў, што дзесьці тысячаў пяць пабілі.

З тае зімы прайшло даволі шмат часу. Партызаны выцягнулі з ямы апошняе Шпаковае свінча, паліцаі застрэлілі на падворку брахлівага Аха. Але жыццё на хутары працягвалася, і кожную вясну Шпакі зноў сеялі збожжа ды бульбу, адзначалі, як маглі, Каляды ды Вялікдзень.

Нарэшце скончылася вайна. Шмат хто са знаёмых, сваякоў Шпака загінуў у ваеннай калатнечы. Прыгожае і шматлюднае мя-

стэчка пасля габрэйскіх пагромаў падчас акупацыі і партызанскіх налётаў ператварылася пасля вайны ў звычайную вёску.

Сцяпан Кулак у лесе даслужыўся да камандзіра атрада, але пасля вайны не змог паказаць сябе на адміністрацыйнай працы ў раёне і быў вернуты назад – змагацца з "краёўцамі" ды "бульбоўцамі", што завяліся ў Ліпічанскай пушчы.

Альбін Клімашэўскі пад немцамі стаў начальнікам нейкага паліцэйскага злучэння, але пры наступе Чырвонай Арміі дзесьці знік. Потым па мястэчку паўзлі чуткі, што ён падаўся ў лес і сфармаваў там даволі вялікую банду, якую цяпер лавіў Кулак.

Мікола Шпак, пабыўшы на прымусовых працах у Германіі, пасля таго, як партызаны ў 1944 годзе ўзарвалі чыгунку каля Зэльвы, якую ахоўваў на пару з Казікам Достам, вярнуўся ў Забайкі схуднелы і аслабелы. Карацей, усё ішло, як і павінна было ісці ў першыя пасляваенныя гады.

Забайкі рыхтаваліся да Вялікадня. Шпаковыя дзеці за гэтыя гады выраслі, але, акрамя ад'ехаўшага на вучобу ў Менск Аркадзя, былі яшчэ каля хаты. Ганна моцна пастарэла, можа, з-за таго, што Мікола доўгі час быў у Германіі, а можа, далася ў знакі цяжкая сялянская праца. У Гандзі ўжо ад восені быў хлопец з мястэчка, які зрабіў ёй прапанову, таму ў Шпакоў пагаворвалі пра вяселле старэйшай дачкі.

Вялікдзень толькі тады прыносіць радасць, калі чалавек рыхтаваўся да яго, належна вытрымаўшы саракадзённы пост. Удзел кожнага сямейніка ў падрыхтоўцы да свята быў строга вызначаны гаспадаром. У жаночыя абавязкі ўваходзіла ўпарадкаванне хаты, хлопцы прыбіралі падворак, апратвалі пуню і адрыну. Усё рабілася, як і некалі да вайны.

Мікола, узяўшы з гумна рыдлёўку, накіраваўся да буды геройскі загінулага Аха. Некалькі хвілін працы, і на Божы свет з'явіўся шэры, акуратна згорнуты скрутак.

Асцярожна, нібы скарб, Мікола яго разгарнуў. Дзёгаць амаль асыпаўся, але боты былі ў выдатным стане і выглядалі як новыя.

Перадвелікодны вечар выдаўся ціхім і трохі халаднаватым.

Мікола рыхтаваўся да ўсяночнае, апрануўшы ўсё лепшае з адзення. Абуў і боты.

– А мо не абувай ты іх, лепш пасля святаў паедзеш на кірмаш у Слонім ды прадасі, – нечага захвалявалася Ганна.

Мікола лоўка падняўся і гоцнуў абцасамі аб падлогу, як малады хлапец.

– Ох і спраўныя, га?

Рашэнне было прынятае, а перадумваць Шпак не любіў. Падышоўшы да дзвярэй, Мікола надзеў на боты гумовыя галёшы, узяў у рукі прыгатавую жонкай сумку з валачобным і накіраваўся за парог. Ганна перахрысціла яго і прашаптала малітву.

Шпак падышоў да мястэчка, так і не акрыялага з ваеннага рэзруху. Спаленыя хаты, брудныя надворкі, ніводнай адчыненай крамы ці шынка. Толькі надвор'е ўсё такое ж, святочнае. Каля царквы на плошчы было шмат людзей. Мікола падышоў бліжэй і прыпыніўся каля ліпы. Тыя людзі, што пазналі яго, пераглянуліся. З натоўпу вылучыўся чалавек з забінтаванай рукой і накіраваўся ў бок Шпака. На правым плячы ў яго быў савецкі аўтамат з круглай абоймаю.

– Ну, здарова, Шпак. – Мікола ледзь пазнаў у падышоўшым аднаго з партызанаў, што наведваліся на ягоны хутар разам з Кулаком. Той акінуў поглядам Шпака, прыпыніўшы позірк на ботах.

– А казаў – Клімашэўскі забраў. Значыць, падманваў. Ну пачакай жа, кулацкая морда! – Партызан адышоў на колькі крокаў, але рэзка прыпыніўся і павярнуўся да Шпака. – А твой прыяцель Клімашэўскі разбіты, сёння пабілі яго "краёўцаў", вунь на возе, як селядцы, ляжаць, толькі сам, паскуда, збег!

Партызан сплюнуў сабе пад ногі, паправіў аўтамат і пакрочыў да астатніх. Мікола без роздуму рушыў за ім. Каля муараванай агароджы царквы ў атачэнні вайскоўцаў, стаяла падвода. На акрываўленай саломе ляжалі чатыры цела. Мікола сходу пазнаў траіх. Той, злева, з прастрэленай галавой, жыў на ўскрайку невялічкай вёскі Плянта, што па дарозе на Казібар, звалі яго Янка Дажына. Другога, чыя рука звешвалася між драбінаў, звалі

Мікола Дамастуй, быў ён з суседняга хутара Крупкі, што прылягаў да Забаек. "Яны ж праваслаўныя, навошта ім спатрэбілася гэтая польская Армія Краёва?" – разважаў сам сабе Шпак. Трэці, што ляжаў ніц, паходзіў з даволі заможнай сям'і местачкоўца Бусловіча, звалі яго Язэп. Мікола ведаў гэтага чалавека яшчэ з той пары, калі ў мясцовым касцёле служылася імша па маршале Пілсудзкім. І нябожчык заахвочваў мясцовых габрэяў спяваць "Марш Дамброўскага", дырыжуючы пры гэтым бізуном...

Тут Шпака хтосьці ціха паклікаў. Мікола пазнаў местачковы млынара – Міхася Скрыбу.

– Паслухай, Шпак, ішоў бы ты адсюль, бачыш, што робіцца. У Казібарскім лесе банду Клімашэўскага пабілі. Кулак злы, як воўк, што Альбіна не злавілі.

Мікола прыслухаўся да парады млынара і праз хвіліну ўжо паварочваў з мястэчка на гасцінец, што вёў да хутара. Праз гадзіну бесперапыннай хады ён ужо заходзіў на падворак. Было яшчэ не зусім цёмна, хаця сонца ўжо схавалася за лесам. Каля хаты было ціха. Дзверы – насцеж. Мікола, прадчуваючы нядобрае, убег у хату і – акамянеў. За сталом, паклаўшы перад сабой нямецкі аўтамат, сядзеў Альбін Клімашэўскі. Сівавалосы, хударлявы, з непаголеным тварам, ён спяшаючыся еў прыгатаваную на заўтра і ад таго яшчэ не застыглую дрыгву.

– Ну што, пся крэў, да сябра свайго хадзіў? – падняўшы галаву ад міскі, прамовіў былы паліцай.

– Да якога сябра?

– Як да якога? Да Кулака! – Тут Клімашэўскі ваўкавата паглядзеў на гаспадара і закрычаў:

– Ты, пся крэў, падмануць мяне ўздумаў? – тыцнуўшы аўтаматам на Шпаковыя боты, выкрыкнуў паліцай. – Застрэлю, гад! – Па хаце разляцеліся плач Ганны і віскат дзяцей.

– А ну цыц, а то і вам будзе! – пагрозліва крыкнуў Клімашэўскі. Мікола не ведаў, што яму рабіць: ці кінуцца на бандыта, ці ўпасці перад ім на калені ды прасіць літасці. Адзінае, што ён ведаў без ваганняў, гэта тое, што трэба адвесці пагрозу ад дзяцей і жонкі.

Ён сабраў сваю волю ў кулак і вельмі спакойна прамовіў:

– Што з тых ботаў? Паабяцай, што адчэпішся ад нас нарэшце, калі я табе золата дам.

– Нясі!

Мікола пайшоў да дзвярэй, але за ім рушыў і Клімашэўскі.

– А дзе яно? – усхвалявана пацікавіўся былы паліцай.

– У адрыне пад сячкарняй закапанае.

Мікола ішоў павольі і ліхаманкава думаў, што рабіць далей. Ніякага золата пад сячкарняй не было. Яны падышлі да адрыны. Клімашэўскі забег наперад, першым зайшоў у сярэдзіну, акінуўшы памяшканне поглядам.

– Дзе? – адрывіста спытаўся.

– Вось тут, – паказаў на старую польскую сячкарню Мікола. Клімашэўскі, забыўшыся пра асцярожнасць, схапіў стары шуфель і калупнуў цвёрды, як камень, ток.

– Чаго стаіш, памагай.

Мікола зрабіў выгляд, што шукае якога рыштунку для капання, а сам незаўважна для былога паліцая ўзяў вілы, што стаялі каля дзвярэй. Імгненна павярнуўшыся, Мікола з усяго маху ўсадзіў іх у плечы Альбіну. Клімашэўскі, выпусціўшы з рук шуфель, нема заенчыў. Ён спрабаваў падхапіць з пляча аўтамат, але Шпак прыціснуў яго віламі да зямлі. Яшчэ хвіліна змагання, і цела абмякла.

Мікола яшчэ трохі патрымаў яго, а потым выцягнуў вілы з забітага. Сэрца бухала і, здавалася, вырывалася з грудзей. У гэты самы час з падворка данесліся галасы. Мікола, яшчэ не супакоіўшыся, як на чужых нагах падышоў да дзвярэй адрыны. І тут нечакана перад ім паўстаў Кулак з настаўленым на яго рэвальверам.

– Ну што, Шпак, гаворыш, Клімашэўскі боты забраў? Я за цябе, міраеда, буду немцаў і паліцаяў біць, а ты тут раскашаваць на сваім хутары?! – на хаду запіхваючы рэвальвер за партупею, Кулак ступіў да гаспадара хутара і з размаху даў у сківіцу. Мікола

падаўся назад, зачапіўся за цела забітага паліцая і зваліўся на ток. Ужо лежачы, намацаў тронак вілаў. У памяшканні адносна надворка было даволі цёмна. Кулак ступіў некалькі крокаў наперад і натыкнуўся на труп паліцая.

– Уставай, сука! – і штурхнуў цела хромавым ботам.

"Ён думае, што Клімашэўскі – гэта я," – дайшло да Міколы. Пакуль Кулак спрабаваў разгледзець ляжачага перад ім, Мікола, апіраючыся на тронак, падняўся і прыціх. У дзвярах сілуэт заслужанага партызана быў добра відзён.

Мікола перахапіў вілы ў правую руку і кінуўся на свайго ворага. Зубцы мякка ўвайшлі ў жывот Кулака. Партызан толькі цяжка ўсхліпнуў і машынальна схапіўся за тронак. Яго ашалелыя ад болю вочы глядзелі ў цемру са спадзевам разгледзець твар забойцы. Ён не адрываў позірк нават тады, калі сілы яго пакінулі...

Яшчэ некалькі хвілін – і ўсё было скончана. Мікола не змог выцягнуць вілы са свае ахвяры. Галава ў яго за кружылася, ногі падкасіліся, цела, як куль, асунулася па сцяне на падрубу.

Ён сядзеў, як нежывы, моцныя сялянскія рукі звісалі долу. На яго акамянелым твары не было радасці перамогі. Мікола глядзеў не адрываючыся ў зямлю і ні пра што ўжо не думаў...

# ПАЛІЦАЙ

Бязлітаснае летняе сонца выскварвала Дубровенскую дарогу, нібы ўюна, які не паспеў вярнуцца ў раку да паўдзённае спёкі. З вёскі здавалася, што гэтая дарога і сапраўды жывая. Яе высмажанае сонцам пясчанае цела то хавалася за голымі пагоркамі, то зноў з'яўлялася з-пад якога-небудзь прыдарожнага каменя. Цёплы жнівеньскі ветрык лашчыў наваколле, не звяртаючы ніякай увагі ні на вымучаную спёкай дарогу, ні на тых, хто трапіў на яе ў гэтую нябожую часіну. Ветрык проста цешыўся лету, надакучваў сваімі гульнямі людзям, жывёлам і, асабліва, ліпам, якія раслі на адхонах дарогі. Маўклівыя дрэвы пры наскоках ветрыку толькі ківалі сваімі пажоўклымі кудлатымі чупрынамі, пасыпаючы дарогу пазалочанай лістотай. І толькі пераспелая збажына, што кленчыла пад цяжарам налітых каласоў, радавалася ветрыку і ратавальнаму ценю, што слаўся ад старых прыдарожных ліпаў.

Нават падбітыя савецкія танкі, якія іржавелі на адхонах дубровенскага гасцінца яшчэ з 41-га, неяк дзіўна дапаўнялі гэты прыдарожны краявід.

Невялікая калона чалавек з дваццаці ў атачэнні некалькіх канваіраў рухалася надзвычай павольна, падымаючы з дарогі пылату, якая чаплялася за босыя ногі падканвойных і боты тых, хто крочыў па баках. Падвода, што рухалася ззаду працэсіі, час ад часу галосна паскрыпвала, перавальваючыся на калдобінах, час ад часу абуджала дрэмлючага ў драбінах паліцая, не даваляючы таму заснуць.

Людзі, якія ішлі ў калоне, час ад часу прыглушана стагналі, збіваючы босыя ногі аб стоеныя пад гарачым пяском камяні.

– Гэй, не прыпыняцца там, бандзюгі! – галёкнуў уздоўж калоны каржакаваты паліцай з парэпаным, як старая кадушка, тварам. Ён жа хвілін некалькі таму лаяўся на сваіх .

– От сука! – пад нос мармытнуў Іван Лявеза.

Ён не мог трываць гэты сіплы голас, а яшчэ больш не выносіў ягонага гаспадара. Бо менавіта Сцяпан Мысцік, начальнік ме-

стачковай паліцыі, і прымусіў яго, Лявезу, паступіць на службу ў паліцыю Зарэчына. Усе, і местачкоўцы, і паліцаі, добра ведалі, што Зоська – жонка Івана – была дачкой Хаіма і Бузі Новікаў, якія жылі на Ражанскай вуліцы ў самым канцы Зарэчына. Можа, менавіта з-за гэтага ў мястэчку і ў яго родным Наскаве Івана за службу ў паліцыі асабліва ніхто і не асуджаў, бо хто ведае, дзе была б яго Зоська і дзеткі, каб не тая служба.

Да вайны Іван працаваў у мясцовай школе. Маючы добрую адукацыю і кемлівы розум, Лявеза карыстауся павагай як у габрэйскай часткі мястэчка, так і ў польскіх уладаў. Усё было добра у гэтага простага хлопца з Наскава, але тут, як гром з яснага неба, грымнула вайна.

Асноўную частку мясцовых паліцэйскіх атрадаў складалі маладыя хлопцы з сялянсіх сем'яў Зарэчына і ваколіц. Звычайныя вясковыя хлопцы, па веравызнанні і каталікі, і праваслаўныя, не вельмі ахвочыя ехаць у Германію на прымусовыя работы альбо гніць у балотах пушчы, абараняючы незразумелыя для вяскоўцаў «высокія» савецкія ідэалы, яны лічылі за лепшае ісці ў паліцыянты.

Але былі ў паліцыі і іншыя людзі: акружэнцы, што засталіся тут пасля разгрому 10-й ды 3-й армій, і крымінальнікі рознага кшалту, якіх вызваліла з-за кратаў вайна, і проста розныя прыблуды.

Напачатку паліцэйская каманда Зарэчына толькі п'янствавала ды цягалася па адзінокіх салдатках ды бежанках, час ад часу баронячы мясцовых жыхароў ад літоўскіх, латышскіх ды расейскіх вайсковых падраздзяленняў, якія хаваліся ад немцаў у Ліпічанскай пушчы. Пералічаныя хаўруснікі немцаў не надта хацелі змагацца з партызанкаю, а ўсё больш рабавалі ды забівалі мясцовых безабаронных сялян. І таму местачковая паліцыя на пэўны час стала адзіным абаронцам для абяздоленых насельнікаў вакольных вёсак.

Але з часам нямецкае камандаванне навяло парадак і ў паліцыі. Пайшлі ў ход і акупацыйныя маркі, якіх немцы не шкадавалі, і матэрыяльныя заахвочванні паліцаяў і іх сем'яў. Не спыняліся і рэпрэсіі партызан супраць паліцыянтаў і іх родных.

Карацей кажучы, праз некаторы час паліцыянты сяк-так сталі праводзіць у жыццё так званы новы нямецкі парадак. А з цяперашняга лета асноўным заняткам паліцаяў стала збіранне габрэяў з усёй ваколіцы у зарэчынскае гета, якое стварылі немцы якраз у самым цэнтры мястэчка.

Для Івана гэты занятак быў як зубны боль – невыносна балючы і жудасна непрыемны, з бяссоннымі начамі ды бясконцымі днямі. Колькі Зосіных сваякоў яму давялося канваіраваць за калючы дрот гета – толькі Богу і вядома. Праўда, тым з падканвойных, хто хацеў уцячы ў лес, Іван не вельмі перашкаджаў. Бывалі выпадкі, калі Лявеза і сам ініцыяваў уцёкі, хаця апошнім часам начальнік паліцыі Мысцік перастаў яму давяраць, пасылаючы ў канвоі разам з Іванам самых davераных сваіх падначаленых і субутыльнікаў. Але тыя і падчас канвою то гарэлку пілі без меры, а значыць мала што кумекалі, то і наогул заставаліся дома пры гаспадарцы. Таму перашкаджаць Івану рабіць сваю справу падчас дадзеных Мысцікам заданняў асабліва не было каму.

Але гэтымі днямі нешта ў мястэчку змянілася, з’явілася шмат немцаў на матацыклах ды апранутых у нямецкую форму літоўцаў і ўкраінцаў. Канвоі сталі больш дысцыплінаваныя і ўзмоцненыя. Сярод паліцаяў хадзілі чуткі пра блізкую эвакуацыю гета кудысьці ў Польшчу. Ад таго збіранне габрэяў з суседніх мястэчкаў цяпер ішло асабліва энергічна. А ўчора камендант Зарэчына маёр Кнаўф загадаў Мысціку завітаць у Дубраўку і прыгнаць у мястэчка тамтэйшых габрэяў і спачуваючых камуністам сялян. І вось паліцэйская каманда і дзясяткі два падканвойных жыхароў Дубраўкі ідуць па шашы да Зарэчына.

– Так, Лявеза, бягом сюды! – камандным голасам прамовіў Мысцік. Іван спакойна крочыў па ўзбоччы, як быццам нічога не чуў.

– Я каму кажу! Ты, жыдоўскі прыхвасцень!

– Каб ты здох, сука, – сам сабе прагаварыў Лявеза, пасля чаго павольна пакрочыў да начальніка.

– Ты, я бачу, Іван, хутка давыпендрываешся.

– Чаго клікаў?

– Слухай, як падыдзем да Лозкаў, прыпыні калону.

– А чаму не цяпер? Вунь пад той дзічкай. І горка – відно ўсё навокал, і цянёк, каб ад спёкі схавацца.

– А ваду ім насіць з вёскі ты будзеш, га?

– Ды ў нас у падводзе бідон з вадой поўны.

– Ты што, хочаш каб я з жыдамі з аднаго бідона піў? Ды ні ў жыцці. А зараз ідзі і выконвай.

Іван незадаволена пакруціў галавой і, павярнуўшыся на сто восемдзесят градусаў, павольна пакрочыў у накірунку калоны.

“Во, гад, сам да вайны на млыне ў Фількінштэйна прыбіральшчыкам працаваў – і нічога сабе. Талеркі вылізваў за Яшаю, як галодны сабака, і не гідзіўся, а цяпер вады не хоча піць, падлюка.”

Абураючыся, Іван падышоў да калоны і ўслых, каб чулі іншыя канвойныя, галёкнуў:

– Каля Лозкаў прыпынімся.

Усе – і падканвойныя, і паліцаі – з надзеяй пачалі ўглядацца ў накірунку нябачнай за пагоркам вёскі. Іван, паддаўшыся агульнаму зацікаўленню, а можа, і па інерцыі, зрабіў тое самае, а пасля некалькіх хвілін маўклівага ўглядання ўголас прамовіў:

– Так, з кіламетры два будзе.

– Не, менш, – пачуўся мужчынскі голас з калоны. Іван павярнуўся да падканвойных і заўважыў сярод іх Юзіка Бугука. Малодшага брата партызанскага камандзіра Паўла Бугука па мянушцы Стары.

– А табе якая розніца, колькі туды кіламетраў?

– Калі дапаможаш, то для мяне будзе вельмі вялікая розніца. – Пасля гэтых слоў Іван насцярожана агледзеўся навокал. Паліцаі былі далёка, і слоў, сказаных Юзікам, яны чуць не маглі.

– Ты хочаш, каб тваё месца я заняў?

– Ды ты толькі не заўважыш, і ўсё.

Іван як быццам нічога не чуючы, пакасіўся на Юзіка, а затым

і на Мысціка. Апошні корпаўся каля падводы. Відаць, перабіраў адзенне, забранае ў гэтых жа дубраўлянскіх габрэяў. Лявеза яшчэ раз агледзеўся і моўчкі накіраваўся ў другі канец калоны. Папаліўшы там з паліцаямі, Іван незаўважна зірнуў туды, дзе павінен быў крочыць Бугук. Але таго ўжо не было відаць. Толькі след у спелым жыце па-здрадніцку выдаваў уцекача. Але ўсе былі занятыя сваімі справамі, і калона як ні ў чым ні бывала прадаўжала рухацца па дарозе. Паліцаі на ходу слухалі, як Іван нешта цікавае расказваў. Мысцік корпаўся ў клунках і зусім не звяртаў увагі ні на сваіх падначаленых, ні на падканвойных.

Прайшло ладнавата часу, да Лозак заставалася метраў сто, калі па калоне, як гром па жнівеньскім небе, пакаціўся лямант Мысціка.

– Паскуды, вы ж Бугука праваронілі! А ну ўсе сюды! – Паліцаі, спатыкаючыся аб прыдарожныя камяні, пачалі хаатычна бегаць уздоўж калоны ў розныя бакі. Мысцік, таксама насіўся па ўзбочыне, а то забягаў у сярэдзіну калоны, быццам спадзяваўся знайсці там уцекача.

– Няма, уцёк. Ну, паскуды, маць вашу, пастраляю! – Уся паліцэйская каманда і сапраўды спалохалася камандзірскага гневу. Але Мысцік хутка астыў.

– Так, Іван, бяры з сабой усходніка, і вяртайцеся, ён недзе ў жыце сядзіць.

Усходнікам звалі акружэнца, які застаўся ў мястэчку ў 1941 годзе. "Не давярае, гад", – падумаў Іван.

– А ну, шпарчэй там! – крыкнуў без аглядкі на свайго спадарожніка Іван.

– Так я же стараюсь.

Праз паўгадзіны паліцаі вярнуліся.

– Ну, што там? – нярвова спытаў начальнік паліцыі.

– Нічога, – вінавата прамовіў Іван.

– Цьфу, – Мысцік яшчэ больш нярвова захадзіў каля падводы.

– А ты чаго стаіш, прыдурак? – зганяючы злосць, закрычаў Мысцік на ўсходніка. – Давай падымай калону.

– А ну, пархатые, вставай, да поживей! – прабягаючы паўз калону, закрычаў усходнік.

Гета мясцілася ў самым цэнтры Зарэчына паміж старым кляштарам даменіканцаў і царвой. У гэтым самым месцы яшчэ ў пачатку 20 стагоддзя дзейнічалі вялікая сінагога і габрэйская школа. Адведзеная пад гета тэрыторыя была абцягнутая калючым дротам з вежамі аховы па перыметры. Спачатку габрэяў ахоўвалі спітыя мясцовыя паліцыянты ды некалькі нямецкіх жаўнераў пенсійнага ўзросту. Зрэдку здараліся ўцёкі, але гэтым акупацыйная ўлада ў мястэчку не пераймалася, бо большасць габрэяў усё ж верылі, што з імі не павінна штосьці дрэннае здарыцца, і таму заставаліся тут з сем'ямі.

Усяго зарэчынскае гета прыканцы 42-га налічвала дзесьці каля шасці тысяч насельнікаў. На яго тэрыторыі дзейнічалі розныя майстэрні ды шынкі, куды, дарэчы, без асаблівых праблем дапускаліся акрамя аховы і прыехаўшых немцаў яшчэ і мясцовыя сяляне. Яны замаўлялі габрэйскім майстрам розныя неабходныя ў гаспадарцы ды побыце рэчы. Ды і габрэяў часта адпускалі на працу да вяскоўцаў і местачкоўцаў, адкуль габрэі вярталіся з прадуктамі і рэчамі, якіх нельга было дастаць за дротам.

Праўда, апошнімі днямі сітуацыя ў гета рэзка змянілася, на тэрыторыю перасталі пускаць мясцовых сялян, пачасцелі пагромы ды вобшукі, нярэдкімі сталі і забойствы. Па мястэчку папаўзлі чуткі, што неўзабаве гета некуды будуць пераводзіць, у размовах найчасцей згадвалася Польшча.

Калона падышла да варот гета якраз прыканцы дня. Змучаныя людзі амаль валіліся з ног. Паліцыянты, сабраўшыся каля падводы, палілі і пра нешта гаманілі.

Мысцік па-гаспадарску абабег вакол калоны і падбег для даклада да каменданта капітана Кнаўфа, які стаяў тут жа ля варот. Адрапартаваўшы, працягнуў яму спіс з прозвішчамі прыведзеных. Той, не здымаючы пальчатак, грэбліва прыняў паперу з рук начальніка паліцыі. Лявеза заўважыў, што Мысцік прыпыніўся

каля каменданта так блізка, што яго выпуклы жывот амаль кранаў пражку на паясным рамяні Кнаўфа. Трэба адзначыць, што і Кнаўф таксама не вылучаўся балетнаю статнасцю. Відовішча было камічнае, і Іван ледзь не засмяяўся ўслых. Але тут да яго звярнуўся тоўсты паліцай, які толькі што злез з падводы.

– Ну, зараз будзе нам за Бугука.

Лявеза пасур'ёзнеў:

– А што нам будзе? Ты думаеш, яны нас расстраляюць за Бугука? А дзе ж яны другіх такіх дурняў потым возьмуць, га?

– Цішэй ты, а то камендант пачуе.

У гэты самы час Кнаўф адарваў вочы ад спіска і пра нешта вельмі сурова спытаў у Мысціка. Галоўны паліцай працягваў стаяць нерухома і нешта вельмі хутка гаварыў у адказ. Тут Кнаўф, не чакаючы, пакуль той скончыць прамову, згорнутым спіскам сцебануў Мысціка па твары. Начальнік паліцыі ў гэты момант нагадваў не камандзіра вайсковага падраздзялення, а нашкодзіўшага сабаку, якому больш няма куды падацца. Кнаўф, прамовіўшы яшчэ некалькі рэзкіх слоў на адрас Мысціка і не чакаючы ад таго адказу, павярнуўся і пакрочыў прэч. Мысцік, падхапіўшы з зямлі зляцелую шапку, забягаў перад маёрам то з аднаго боку, то з другога, і нешта таму тлумачыў. Немец ішоў роўна, аніяк на таго не рэагуючы.

– От жа, паскуда, аб яго ногі выціраюць, а яму хоць бы хны.

– Ты, Іван, некалі дабрэшасся. – Іван павярнуў галаву на голас. Гэта быў адзін з паліцаяў.

– А ты чаго стаіш? Давай бяжы за імі, ды абодвум азадкі ліжы.

У гэты час са свайго няўдалага паходу вярнуўся ўсхваляваны Мысцік, за ім шыхтом крочыла падраздзяленне немцаў, на рукавах якіх былі шаўроны з перакрэсленымі маланкамі. Немцы, не звяртаючы ўвагі на паліцаяў каля падводы, узялі ў паўкруг падканвойных і пагналі іх, папіхаючы ў спіны, на тэрыторыю гета. Мысцік пачакаў, пакуль калона зайшла за дрот, памог зачыніць вартавому браму, а потым подбегам накіраваўся да сваіх падначаленых.

– Значыць так, заўтра ў сем ранку збіраемся каля пастарунка.

– А што браць с сабой? – спытаўся нехта з паліцаяў.

– Нічога браць з сабой не трэба. Зброю прывядзіце ў парадак, бо стрэльбамі вашымі толькі капусту ў дзежцы таўкчы, а не справамі сур'ёзнымі займацца.

Кампанія дружна пырснула смехам.

– Смяяцца потым будзеце. А цяпер па хатах, і глядзіце, не напівайцеся. Бо калі заўтра хтосьці спозніцца, Кнаўф таго самога ў гета загоніць.

Паліцаі сталі паціху разыходзіцца па мястэчку. Іван крочыў па вузкай сцежцы, якая пралягала паміж гета і рэчкай. З-за калючага дроту даносіўся брэх сабак і амаль гэткая ж самая лаянка ахоўнікаў. Дадомуісці не вельмі хацелася. З рэчкі даносіўся вячэрні прахалодны ветрык. Навокал было спакойна і ціха, хлопцу на хвіліну падалося, што ўсё перажытае ім за апошнія месяцы – страшны сон. А насамрэч няма на зямлі ні зарэчынскага гета, ні вайны, ні смерці. Іван патануў у прыемных і асалодных летуценнях. Але ў гэты самы момант з-за дроту данёсся прыглушаны, але даволі выразны голас з рэпрадуктара, які чамусьці гучаў спачатку па-нямецку, а затым па-расейску:

– Ахтунг! Внимание! Администрация гетто предупреждает: самавольное оставление отведенных для проживания мест карается смертью, бессмысленное передвижение по лагерю после 10 часов карается смертью.

Усе летуценні Івана ўмомант развеяліся, як дым. Ён крочыў няспешна, успамінаючы пражыты дзень, думаў пра людзей, якіх яму давялося суправаджаць з Дубраўкі. Успаміны ўсё больш і больш ранілі яго сэрца. Іван узважваў свае словы, паводзіны. Душэўная трывога і нейкія супярэчнасці не давалі яму спакою. Але як толькі ён пачынаў думаць пра службу ў паліцыі, немінуча перад вачамі паўставалі дзеці, жонка, састарэлы і адзінокі бацька ў Наскаве. І ён міжволі зноў і зноў пагаджаўся са сваім становішчам.

Іван адчыніў веснічкі і зайшоў на падворак. З вокнаў на вуліцу лілося цьмянае лямпавае святло. У хаце жонка спыталася:

– Куды сёння ездзілі?

– Зноў Мысцік ганяў габрэяў у гета збіраць.

Зоська на хвіліну замаўчала, а потым амаль ледзь чутна пацікавілася:

– І куды на гэты раз?

– Ды ў Дубраўку.

– Я чула сёння ў мястэчку, што заўтра гета ў Польшчу будуць перавозіць.

Іван моўчкі сцягнуў боты.

– Не цягайся ты ў мястэчка. А то забяруць і цябе. Не пагледзяць, што я паліцай.

– Іван, а дзеда Ізю ты там не бачыў? Можа, паесці заўтра яму зянясеш?

– Я і сёння яму што-небудзь перадаў бы, але Мысцік з раніцы ў Дубраўку пагнаў. Разам з габрэямі Юзіка Бугука вялі, але я яго па дарозе ў мястэчка адпусціў.

– Дык ён жа да вайны з табой увесь час ваяваў.

– Гэта ж да вайны. Хай жыве сабе. Можа, і мне калі-небудзь дапаможа. Ну, добра, пабачым, што там заўтра будзе, а цяпер вячэраць пара. – Іван памыў рукі пад саматужным рукамыйнікам і сеў на сваё звыклае месца за сталом.

Зося спрытна дастала з печы чыгунок і наліла ў глыбокую гліняную міску гарачай стравы. Прыемны пах запоўніў усю хату. Пакуль Зоська рыхтавала вячэру, Іван яшчэ раз агледзеў сваё жытло і заўважыў каля ўваходу новы дзіцячы абутак.

– Зоська, а хто чаравікі прынёс?

– Дядзька Веня заходзіў, яго стараста выпрасіў у Кнаўфа на некалькі гадзін, каб паправіць брычку ды збрую. А то як быццам начальнік, а брычка – як у рамізніка. Вось дядзька і падрамантаваў яе, а калі вяртаўся, да нас зайшоў, паеў ды гэтыя чаравікі пакінуў. Трошкі завялікія яны нашай Марысі, але дасць Бог падрасце дзіця – у самы раз будуць. Пэўна, на продаж нёс, але дзе іх сёння прадасі.

Іван моўчкі еў і думаў пра нешта сваё.

– Слухай, Іван, дядзька Веня казаў, што з гета амаль нікога ў мястэчка не пускаюць. Там жа дзеці галодныя, што ж яны робяць?

Іван адклаў лыжку, пільна паглядзеў на Зоську і пайшоў класціся. Ён ляжаў на спіне, нярвова паліў і неадрыўна глядзеў у столь. Праз некаторы час дзверы ў пакой скрыпнулі і амаль нячутна каля ложка з'явілася Зося, яна была ў доўгай белай сарочцы. Іван паклаў папяросу ў зробленую яшчэ да вайны дубовую папяльнічку і паставіў яе на лаву за спінкаю ложка. Зося адкінула рог шарсцяной коўдры і спрытна шмыганула пад яе.

– Ой, як тут цёпла, – яе халодныя ногі абхапілі Іванавы ступні, правая рука пяшчотна пагладзіла яго па твары, а левая абняла за шыю.

– Каханы мой, як я рада, што мы з табой разам!

Іван павярнуўся да яе ўсім целам і моцна пацалаваў...

За вокнамі яшчэ шчаслівай Лявезавай хаціны сумавала жнівеньская ноч. Яна, нібы ведаючы, што будзе раніцай, толькі ўздыхала цёплым ветрыкам і асвятляла поўняй змучаную вайной зарэчынскую зямлю. Шумам дрэў ноч як быццам хацела папярэдзіць людзей аб нечым страшным. Але людзі не ведалі мовы начы. Таму яна і плакала знічкамі, не могучы нічым і нікому дапамагчы. На ўсходзе займаўся ранак.

Іван разам з астатнімі паліцаямі ўжо больш за паўгадзіны стаяў каля пастарунку. Усе мелі пры сабе зброю з амуніцыяй, атрыманую напярэдадні ў Мысціка. З гета данёсся гук унутранай сірэны і брэх службовых сабак, якія спрабавалі перабрахаць жалезную і надта галосную нямецкую машыну.

– Гэй, Лявеза, вінтоўку прывёў у парадак? – яшчэ здалёк запытаўся Мысцік.

– А яна ў мяне заўсёды ў парадку.

Мысцік, нібы вясковы франт, паправіў свой чорны паліцэйскі мундзір і прыпыніўся каля хударлявага ўсходніка, што стаяў на прыступках. Начальнік паліцыі акінуў поглядам спачатку яго, а

затым тых, што стаялі воддаль, і з адчуваннем сваёй адказнасці гучна сказаў:

– Ну, сёння, хлопцы праверым вас.

Па словах Мысціка Лявеза зразумеў, што рыхтуецца нешта нядобрае. І тут з-за царквы адзін за адным сталі выпаўзаць грузавікі плямістага колеру. Іван налічыў іх ажно пяць штук. Калона рухалася, трымаючы дыстанцыю, павольна перавальваючыся на калдобінах, і Іван зрабіў выснову, што аўто добра нагружаныя. Наперадзе калоны рухаўся чорны легкавік з адкінутым верхам. Па разгубленасці Мысціка Іван зразумеў, што ў легкавіку знаходзіцца нейкі важны нямецкі чын.

Калона мінула царкву, гета і, збавіўшы хуткасць, спынілася каля пастарунка. Мысцік шпарка падбег да легкавіка і, згробшы сваю паліцэйскую шапку ў левую руку, правай адчыніў заднія дзверы аўто. Малады немец у чорнай уніформе грэбліва кіўнуў начальніку паліцыі і павольна выйшоў на брукаваны пляц. За ім ззаду трымаўся камендант Кнаўф. Яны нешта перамовіліся панямецку, пасля чаго камендант галёкнуў вайсковую каманду. З грузавікоў, накрытых тэнтам, на брукаванку пасыпаліся салдаты ў шэрай вайсковай форме. Лявеза налічыў іх чалавек семдзесят. Узброеныя яны былі аўтаматамі і двума кулямётамі.

У гэты самы момант галоўны немец паклікаў да сябе Мысціка, і той, як цюцік, ірвануў да афіцэра. Агледзеўшы вахлакаватага, спітага паліцая, немец зрабіў незадавольную міну і павярнуўся да яго тым месцам, дзе спачываў у кабуры парабелум. Але Мысцік лоўка забег яму наперад. Адчуваючы, што размова начальства з начальнікам паліцыі не ладзіцца, Кнаўф паспяшаўся да іх. Некалькі анекдотаў пра нешта толькі немцам зразумелае, і настрой у прыезджага афіцэра палепшыўся. А яшчэ праз хвіліну Мысціку была пастаўленая задача. Апошні стукнуў абцасамі і подбегам накіраваўся да сваіх падначаленых.

– Станавісь! Напра-ва! Шагам марш! – пачулася каманда. Паліцаі, наступаючы адзін другому на ногі, падняўшы клуб пылу, рушылі наперад. Прыезджы афіцэр правёў поглядам адыходзячы атрад, павярнуўся да Кнаўфа і нешта сказаў. Тут жа над

пляцам грымнуў дружны і зацяжны нямецкі рогат.

– Куды яны нас гоняць? – разгублена спытаўся адзін з паліцаяў.

– Як куды? На бойню, знаеш, колькі з цябе мацы выйдзе? Усё гета можна будзе цэлы тыдзень прычашчаць. – Змрочны жарт Івана выклікаў смех сярод паліцаяў. Так, пасмейваючыся, паліцэйская каманда прыбыла на ўскраіну. Там, непадалёк ад дарогі, што вяла на Копчына, група яўрэяў з белымі павязкамі на рукавах заканчвала капаць вялікую яму.

– Сто-ой, – скамадаваў Мысцік. – Па ўсім адчувалася, што ўбачанае ўзрушыла ў калоне не толькі Івана.

– Ну, зразумелі, для чаго патрэбныя спраўныя ружжы? – Зламысна ўсміхаючыся, прамовіў Мысцік. – А ты, Лявеза, будзеш камандаваць. Ты што, жыдоўскі прымак, думаў чысценькім застацца?

Тым часам з мястэчка пад брэх сабак паказалася вялікая калона габрэяў, вакол якой з аўтаматамі наўзгатоўку крочылі прыехаўшыя сёння са Слоніма нямецкія салдаты. Наперадзе калоны спакойна, не аглядаючыся па баках, ішоў той самы малады афіцэр у чорным. Убачыўшы калону, Лявеза зніякавеў і рашуча звярнуўся да свайго начальніка;

– Я страляць не буду!

– Ах ты, сукін сын! – Мысцік засоп і пацягнуўся за «вальтарам», што знаходзіўся ў пацёртай скуранай кабуры. Часу на разважанні не было. Іван імгненна перавёў ружжо з пляча наперавес. Яшчэ імгненне, і ціхую сонечную раніцу абудзіў першы стрэл. Мысцік хістануўся і схапіўся за жывот. У гэты самы момант Іван адчуў моцны ўдар у патыліцу, свет пайшоў кругам і сцямнеў. Ён страціў прытомнасць...

Калі Лявеза расплюшчыў вочы, то ўбачыў высока над сабой блакітнае неба і белыя воблачкі, якія, быццам ягняткі, бестурботна пасвіліся на бяскрайнім выгане. Івану на хвіліну падалося, што ён ужо на прыступках раю. Бо ўбачанае так моцна кантраставала з тым, што ён перажыў нядаўна. Хоць галаўны боль не праходзіў, Іван адчуваў нейкую ўнутраную радасць.

Ён паспрабаваў падняцца, але нешта цяжкае ляжала на яго грудзях і замінала яму. Нічога не разумеючы, Лявеза паспрабаваў сцягнуць груз на зямлю. Прыпадняўшы галаву, ён зірнуў уздоўж свайго цела. На яго грудзях ляжаў чалавек з разбітым ушчэнт чэрапам. Цягучае чырвона-чорнае месіва сцякала па левай руцэ Лявезы.

Івану стала дрэнна. Усё, што было з'едзена напярэдадні, тут жа пачало пакідаць яго цела. Калі ваніты спыніліся, Іван паспрабаваў разгледзець забітага. Маладому чарняваму хлапцу было ўсяго гадоў чатырнаццаць, яго правая рука, за якую ўхапіўся Іван, была яшчэ цёплай. Лявеза пацягнуў за яе, і хлопцава цела, як стары сяннік, падатліва спаўзло на зямлю. Іван сабраў пазасталыя сілы і паспрабаваў зноў падняцца, але ў гэты самы момант нешта цяжкае ўдарыла яго ў спіну і зноў прыціснула да зямлі. Вызваліўшыся ад новага цяжару, хістаючыся ў розныя бакі, Лявеза павольна ўсё ж падняўся на ногі. Тое, што ён убачыў, падалося яму сапраўдным пеклам.

У шырокай яме, якая з сярэдзіны нагадвала вялікі чорны каўчэг, варочаліся, стагналі, малілі аб дапамозе сотні людскіх цел. Зверху на іх падалі новыя ахвяры.

Іван адчуў, што ізноў губляе прытомнасць. Але пакуль яшчэ заставаліся нейкія сілы, ён пачаў паўзці, чапляючыся рукамі і нагамі за людскія целы. Яму раптам падалося, што ён не чалавек, а ваўкалак, які вырывае ў людзей вантробы... Аднак цела яго, паслухмянае нейкаму жывёльнаму інстынкту, сантыметр за сантыметрам працягвала паўзці наперад. На краі ямы галава ў Івана зноў пайшла кругам, рукі і ногі сталі млявымі, і ён ізноў праваліўся ў чорную бездань...

Што адчувае чалавек на мяжы жыцця і смерці? Шкадаванне, роспач, страх, жудасны боль? А можа, доўгачаканае супакаенне? Бо часам яшчэ пры жыцці чалавеку даводзіцца трапляць у пекла.

Іван ачнуўся ад недахопу паветра. Яго ногі, грудзі і нават нос упіраліся ў нешта даволі цвёрдае.

"Пэўна, якраз край ямы. – Розум ягоны чамусьці надзвычай ясна ўсведамляў, што адбываецца з яго целам. – Трэба па-

спрабаваць разграбці пясок над галавой". – І вось ужо мокрыя і анямелыя пальцы Івана аблашчыў халодны і прыемны ветрык. Большай асалоды Іван не адчуваў яшчэ ніколі ў жыцці. Але радавацца не было часу.

Ён, сабраўшы астатнія сілы, пачаў выпаўзаць, звіваючыся як паўжывы чарвяк, на паверхню.

Гасподзь вярнуў чалавека з таго свету – навошта? Можа, для таго, каб ён нарэшце выканаў ускладзеную на яго місію. Шляхі Госпада неспазнаныя.

Іван, амаль нічога не разумеючы, рушыў ад месца свайго выратавання ў бок местачковага касцёла, які высіўся непадалёку. Ён ведаў, што пробашчам там служыць немец, але іншага выбару проста не было. Далей ён усё роўна ісці не змог бы.

І вось Іван, ледзь жывы, з вялікімі намаганнямі адчыніў засаўку брамы касцельнай агароджы. Хістаючыся, ён скіраваўся да плябаніі. Дзверы Івану адчыніў сівавалосы мужчына гадоў пяцідзесяці.

– О майн Гот, – гэтыя словы былі апошнімі, што пачуў Лявеза. Ногі падкасіліся, і ён, як шляга, зваліўся на ганку плябаніі...

Іван расплюшчыў вочы і ўважліва агледзеўся. У прасторным і ўтульным пакоі было прахалодна і суха. З высокага і шырокага вакна ў пакой трапляла шмат сонечнага святла. Насупраць ложка, на якім ляжаў Іван, прыпёршыся бокам да сцяны, стаяў акаваны чорным жалезам куфар, у кутку ўзвышалася вялікая шафа з люстэркам. Наводдаль ад шафы на пабеленай сцяне вісела вялікае срэбнае распяцце. І паўсюль панавала ідэальная чысціня, з якой вельмі гарманавала белая накрухмаленая бялізна. Пасля акаяннай ночы з трупамі ў яме гэты пакой выглядаў як рай нябесны.

Нячутна адчыніліся дзверы, і Іван убачыў над сабой твар пробашча. Лявеза ведаў яго яшчэ з даваеннага часу. Ксёндз Ёзаф паходзіў з немцаў, але любіў мясцовых сялян, а тыя адказвалі яму ўзаемнасцю. Часам нават пераходзілі з праваслаўя ў каталіцызм. Вось на гэтай глебе Іван часта спрачаўся з пробашчам, бо лічыў

празалітычную палітыку шкоднай для беларусаў. Яны зацята дыскутавалі, але ніколі не пераходзілі мяжы тактоўнасці і павагі адзін да аднаго.

– Іван, ты мяне спалохаў.

– Крычаў праз сон?

– Так, вельмі гучна. Я цябе вельмі добра разумею, Іван. – Юзаф зірнуў у бок распяцця і пеpажагнаўся. – О, майн Гот, – пробашч паківаў галавой, склаў рукі перад сабой, цяжка ўздыхнуў і выйшаў з пакоя.

Толькі на трэці дзень Лявеза ўстаў з ложка і, зрабіўшы некалькі крокаў, пабачыў сваё адлюстраванне ў люстэрку. Спачатку ён сябе не пазнаў – нейкі незнаёмец з зарослым шчаціннем тварам, з ліхаманкавым бляскам у вачах глядзеў на яго...

Потым ён адчыніў дзверы і, прытрымліваючыся за сцяну, выйшаў у калідор. Падцягваючы параненую нагу, рушыў наперад і ўжо праз хвіліну пабачыў пробашча. Той сядзеў за шырокім дубовым сталом.

– Добры дзень, ойча.

– Добры дзень, Іван. – Пробашч добра разумеў беларускую мову, але гаварыў звычайна на польска-беларуска-нямецкай трасянцы.

– Як се маш? – як здалёку пачуў Іван.

– Дзякуй, ойча, ужо лепш.

– О, майн Гот. Кнаўф учора ў касцёл заходзіў. – Пробашч замаўчаў, нібы абдумваў прычыну з'яўлення камендaнта на вячэрняй службе.

– Ойча, а чаму вы мяне не выдалі сваім суайчыннікам? – Іван уважліва глядзеў на ксяндза, у пакоі панавала цішыня. Пробашч адарваўся ад сваіх спраў, уважліва паўзіраўся ў твар Івана і, як ні ў чым не бывала, спакойна спытаўся:

– А ты, Іван, чаму не змог страляць?

Іван не ведаў, што адказаць.

– Відзіш, Іван, справа не ў тым, якой ты нацыі і прафесіі. Са-

мае галоўнае ў тым, ці можаш ты распараджацца чужым жыццём, ці не. Забіваючы чалавека, ты ў першую чаргу забіваеш Бога. Не-не, не дзесьці там, – пробашч паказаў рукой угору, – а ў сабе, вось тут. – Ксёндз пастукаў указальным пальцам сабе ў грудзі. – Юда таксама думаў, што прадаць – гэта не забіць. Але потым яго і пахаваць ніхто не хацеў. Нават забойцаў і тых хаваюць, а яго цела крумкачы, як падліну, цягалі па балоце...

Наступнай раніцай, калі Іван пабачыў пробашча, той зноў сядзеў за сваім сталом, нібы і не ўставаў з-за яго з учарашняга дня.

– А, Іван, будзем эсэн. Ты юж, не эсэн ужо вельмі даўно.

– Нешта не хочацца, – прысядаючы на крэсла, прамовіў Лявеза.

– Што такой не хочацца, ты павінен многа эсэн. Ты ўжо тут цэлы тыдзень, але ні разу добра не пад'еў. – Пробашч, адчуваючы, што хлопцу не па сабе, замаўчаў. Але добра разумеючы, што маўчанне доўга цягнуцца можа, ён ізноў узяў ініцыятыву ў свае рукі.

– Іван, не вем, як ты ў паліцую трапіў?

Іван загаварыў не адразу:

– Больш за ўсё на свеце я не люблю людзей, якія сцвярджаюць, што выбар у чалавека ёсць заўсёды. У мяне яго не было. Жонка габрэйка, дзеці малыя – куды з імі? У лес ад холаду прападаць? А можа, у гета трэба было адвесці жонку і дзетак? Іхнія сваякі тут паблізу ў яме ляжаць...

Пробашч зрыхтаваў сняданак, акуратна выцер рукі аб рушнік, што вісеў на рукамыйніку, і ціха прамовіў:

– Ведаеш, Іван, упершыню я пабываў у вас у 1916 годзе ў рангу унтэр-афіцэра дойч арміі. Я тады лічыў, што забіць мэнша на вайне ці спаліць варожы хаўз – гэта нармальная з'ява. Ды толькі ранілі мяне зімой таго ж года, якраз на Зальвянцы, паблізу дорф Дархуны. О, майн Гот! Мяне, параненага, падабрала ў полі беларуская фраў. Яна мяне некалькі месяцаў падымала на ногі, дзелячыся са мной апошнім. Яна падабрала мяне, вяртаючыся з могілак, дзе пахавала свайго адзінага сына. Яго наш зольдат застрэліў, калі той харчы краў з вайсковага абозу...

Ксёндз уздыхнуў і нібы сам у сябе спытаўся:

– Ды як я мог паступіць з табой?

Іван паглядзеў пробашчу ў вочы і сказаў:

– А я, відаць, не змагу стаць святаром.

– У кожнага своя дрога. Але цо робіць бэндзеш?

– У лес пайду. Дахаты мне няможна, дзяцей паліцаі паб'юць. – Лявеза на хвіліну задумаўся, да горла падкаціўся камяк. – Калі яшчэ не пабілі. Хавацца далей таксама не выпадае, не хачу ні на кога наклікаць бяды. Так што толькі ў лес.

Пробашч зірнуў на Івана і прыглушана прамовіў:

– Ты ж у паліцыі быў, партызаны за гэта таксама расстраляць могуць.

– Могуць, але ж іншага выйсця ў мяне няма. Сённяшняй ноччу і пайду, ойча. Вы не бойцеся, я пра вас нікому не скажу.

– О, майн Гот. Ідзі, Іван, толькі ідзі з верай у Бога.

– Дзякуй, ойча, за ўсё. Але як мне пасля ўсяго жыць на свеце? Я ж пасля ўбачанага ўжо ні ў Бога не веру, ні ў д'ябла.

– Я не ведаю як, але жыць ты мусіш, і верыць мусіш. Вера – твой ратаўнік.

Пробашч паказаў на прыбраны стол:

– Проша сядаць, – затым узяў з невялічкага століка, што стаяў каля печы, паднос з кавай, белым хлебам ды яешняю і паставіў перад Іванам. Адышоў на другі канец стала, павярнуўся да абраза, які вісеў якраз над Іванам і, склаўшы далоні перад сабой, пачаў маліцца па-нямецку. Іван падняўся са свайго месца і таксама перажагнаўся. Але нешта малітва яму ў галаву не ішла.

Пад'еўшы, Іван вярнуўся ў свой пакой і стаў збірацца. Пасля дванаццаці ночы ён зазірнуў у кухню. За сталом сядзеў пры запаленай лямпе пробашч. Пасярод стала ляжала Біблія ў скураной абкладцы.

– Вечар добры, ойча.

– О, я, я, вечар добры. – Ксёндз лёгка, нібы маладзён, падхапіўся са свайго месца.

– Дзякуй, ойча, за ўсё. Каб не вы...

– Я ест ксёндз, то мой абавязак, – ціха сказаў пробашч. Потым крышачку замінуўся, быццам перакладаў з нямецкай на беларускую патрэбныя словы, і дадаў:

– Не тшэба ходзіць у партызаны, перачакай дзе-небудзь.

Іван зірнуў у вочы свайму выратавальніку.

– А што перачакаць, ойча? Смерць сваю я ўжо перачакаў. – Іван няўмела пацалаваў руку пробашчу і накіраваўся да дзвярэй. Раптам спыніўся і папрасіў:

– Ойча, я вас вельмі прашу, дзяцей маіх пашукайце, калі жывыя, дапамажыце ім.

– Добра, Іван, я абавязкова пашукаю. О, майн Гот.

Лявеза адчыніў дзверы і рашуча ступіў за парог, за якім яго чакала невядомае жыццё. І толькі адзін Бог ведаў, што з ім будзе далей.

Ва ўсе часы жыхар пушчанскай вёскі мог пры жаданні за гадзіну-другую адшукаць любога чужынца, які хаваўся па балотах альбо цёмных лясных засценках. Гэтую здольнасць пушчанцаў улады ва ўсе часы ўмела выкарыстоўвалі. Таму бандыты розных масцей рэдка хаваліся ў пушчы. Так было заўсёды, ад часоў Капацэвіча, які валодаў Ліпічанскаю пушчай у сярэднявеччы, і аж да сярэдзіны стагоддзя дваццатага. Менавіта праз пушчу ў чэрвені 41-га прарываліся з акружэння ацалелыя дывізіі Заходняга фронту Чырвонай Арміі – каля сяміста тысяч салдат і афіцэраў. Вялікая колькасць іх, галодных і параненых, засталася ў беларускіх пушчанскіх вёсках ды на хутарах.

А тут яшчэ распачаўся люты пераслед немцамі габрэйскага насельніцтва па вакольных мястэчках ды гарадах. І тыя з габрэяў, хто не трапіў у гета, адзін за адным пачалі прабірацца ў пушчу. І сапраўды, куды яшчэ можна было дзецца падчас ліхой гадзіны чалавеку? Толькі ўцячы ў лес, як уцякалі туды спрадвеку ад

ворагаў яго дзяды і бацькі.

Хаця, калі казаць праўду, пушчанцы не падтрымлівалі ні саветаў, ні немцаў. Яны толькі па-хрысціянску дапамагалі тым, хто гэтай дапамогі патрабаваў. Пра тое, што жыхары пушчанскіх вёсак кармілі ды хавалі бежанцаў, а затым і партызанаў, ведалі як нямецкія ўлады ў вайну, так і савецкія ўлады пасля вайны. Тыя і другія, кожны ў свой час, спрабавалі кантраляваць сітуацыю. Але гэта далёка не заўсёды ўдавалася. Даводзілася прыбягаць да карных акцый. І палыхалі пушчанскія вёскі і хутары, рэкамі ліліся слёзы і кроў мірных людзей...

Іван нядоўга блукаў па пушчы, ужо на другі дзень ён натыкнуўся на партызанскі кардон паблізу Шчары. Пасля даволі працяглага допыту ў камандзіра, падчас якога Івана хацелі і забіць, і павесіць, і пакалечыць, усё ўрэшце скончылася мірна. Яго пакінулі ў атрадзе, дакладней, пры кухні атрада. І толькі таму, што Бугук, камандзір атрада, быў вельмі ўсцешаны тым, што Іван застрэліў Мысціка – яго крэўнага ворага.

Хаця і застаўся Лявеза ў атрадзе, зброю яму ўсё ж не далі. Пацягнуліся доўгія месяцы ляснога жыцця. У ім хапала ўсяго: і працяглых бамбёжак, і галодных дзён і начэй, і сутычак з «дубовікамі». Але ўсе нягоды партызанскага жыцця не вельмі турбавалі Івана, яму не давала спакою яго сям'я. Ён не ведаў, што з Зосяй і дзецьмі. Мучыўся, не спаў начамі.

За ўвесь час знаходжання ў атрадзе Лявеза ні з кім блізка не сышоўся, да яго прыляпілася дадзеная камандзірам мянушка Паліцай. Хіба толькі малодшы брат камандзіра Юзік Бугук, якому ён дапамог некалі збегчы з палону і які служыў пры штабе, адносіўся да Івана з сімпатыяй. Увесь час заступаўся за Лявезу перад камандаваннем. І ўсё як быццам нарэшце стала наладжвацца. Івана пачалі браць у паходы па правіянт, ставіць у каравулы, праўда, не аднаго, а з кімсьці.

Але неяк да кіраўніцтва атрада дайшлі чуткі, што ўся вёска Наскава, з якой паходзіў Лявеза і дзе жыў яго адзінокі бацька, падалася ў Беларускую Самапомач. І Іван зноў трапіў у апалу.

Аднойчы, калі Іван звыкла гаспадарыў на атраднай кухні, туды прыбег Юзік Бугук з паведамленнем, што неўзабаве ўсіх, хто можа трымаць зброю, пагоняць паліць Наскава. Іван разгублена перапытаў:

– Як гэта паліць?

– А ты думаў, што іх узнагароджваць будуць за тое, што падаліся ў Самапомач?

– Ды яны дзеля таго ўступалі, каб у Нямеччыну не пагналі, каб ад бандытаў розных бараніцца! – выгукнуў Іван.

Юзік насцярожана агледзеўся па баках:

– Ты лепш пра гэта маўчы, бо першым пад кулю станеш. А ў цябе там хто?

– Бацька, дзядзькі, пляменнікі.

"Што рабіць? Як папярэдзіць?"– круцілася ў галаве адна думка.

Праз некалькі хвілін Лявезу паклікалі на агульнае пашыхтаванне. Камандзір атрада Бугук уважліва агледзеў свае войска, затым павярнуўся да чалавека ў скуранцы і акулярах. Той адкашляўся ў кулак і пачаў прамаўляць па-расейску. У атрадзе ведалі: калі рыхтуецца карная аперацыя супраць насельніцтва, камандзірам фактычна становіцца гэты ў скуранцы. Хаця і прыслалі яго з Масквы параўнальна нядаўна, трымаўся ён у атрадзе даволі ўпэўнена. Камандзір яго трохі пабойваўся, не ўступаючы ў спрэчкі. У партызанаў чужак атрымаў мянушку Чэкіст.

– Товарищи партизаны, сегодня вы будеце выполнять ответственное задание по уничтожению фашистских приспешников в деревне Насково. Хотя они ещё не начали против нас военных действий, мы обязаны опередить их. – Прамоўца адсопся і, набраўшы ў грудзі паболей паветра, закончыў: – Уничтожим предателей в их же логове. У нас не должно быть к ним жалости и малодушия. Жители других деревень должны знать, что предательство будет караться беспощадно.

Партызаны моўчкі слухалі і толькі пераступалі з нагі на нагу. Іван быў так уражаны словамі Чэкіста, што нават дыхаў праз раз.

– Разайдзісь! – Прагучала каманда. Іван накіраваўся на сваю кухню, але яго спыніў воклік камандзіра:

– Лявеза, зайдзі ў штаб.

У штабной зямлянцы да Івана звярнуўся Чэкіст:

– Ты, Левеза, служил в полиции Заречина, значит, знаешь, кто где живёт в местечке?

– Знаю.

– Так вот, зареченский ксёндз там такую пропаганду развернул, пуще Гебельса. Несмотря на это, он пользуется популярностью у местных несознательных элементов. Сведёшь к нему нашу разведку, а после того, как они поговорят с ним, незаметно проведёшь их в Насково. Я думаю, дорогу из Заречина лучше тебя никто не знает. І не вздумай баловать, я ребятам скажу, что ты за фрукт.

– Дык чаго пасылаеце, калі даверу няма? – Іван паглядзеў на камандзіра.

– Ну... мы знаем , што рабіць, – не адрываючыся ад разасланай на стале карты сказаў, нібы адрэзаў, Бугук.

– Ну что, задание понятно? – пацікавіўся Чэкіст.

– Панятна, – мармытнуў Іван.

– Так вот, подойди к Зубову, он тебе растолкует, что и когда надо делать.

Іван моўчкі выйшаў з зямлянкі. Думкі свідравалі галаву. Што рабіць? Дапамагаць у ліквідацыі ксяндза, які яму выратаваў жыццё?.. Ён ішоў, чапляючыся нагамі за карані. Неўзабаве быў каля зямлянкі, дзе жылі разведчыкі. Якраз у гэты момант з яе выйшаў камандзір атраднай разведкі Марат Зубаў – каржакаваты, з раскосымі вачыма акружэнец, выхадзец з Урала. Ён спадылба паглядзеў на Івана, нахіліўся ў праём і адрывіста крыкнуў:

– А ну все наверх! – У зямлянцы пачуўся шум, мат, а яшчэ праз хвіліну на паверхню выскачылі трое разведчыкаў, апранутых і абутых па-рознаму, але з аднолькавымі нямецкімі аўтаматамі. Зубаў акінуў іх халодным поглядам:

– Выходим как стемнеет, патроны – по три рожка, лишнего не брать. Этот пойдёт с нами. – Зубаў, не гледзячы на Івана, тыцнуў пальцам яму ў грудзі. Он пойдёт впереди, без оружия, мы за ним.

– Як гэта без зброі? – не змоўчаў Іван.

– А тебе кого бояться? Для немцем и полицаев ты свой. Ха-ха-ха. – Разведчыкі таксама рагатнулі.

Ноч была цёмная і халодная. Іван крочыў хутка, разведчыкі за ім ледзь паспявалі. Праз гадзіны тры яны ўжо падыходзілі да зарэчынскага касцёла з боку местачковых могілак.

– Вунь там плябанія, – Іван паказаў на будынак, што заўважна беляхцеў у цемры. Зубаў уважліва агледзеў подступы да плябаніі.

– Так, Левеза, останешься с Сергеевым, а мы подберёмся к дому попа.

– Хіба вы мяне з сабой не возьмеце?

Зубаў ніяк не адрэагаваў на словы Івана, прашаптаў нешта Сяргееву на вуха і паклаў таму пад ногі пакаўны мяшэчак, які яны неслі ўдвух. Яшчэ хвіліна, і тры чалавечыя цені, хаваючыся за дрэвамі, незаўважна падабраліся да касцёла. Сяргееў, што застаўся на могілках, прысеў на мяшэчак.

На душы ў Івана было паскудна. Зноў перад вачыма паўстаў воблік ксяндза. У гэты самы момант з куста проста перад Сяргеевым выпырхнула нейкая вялікая птушка. Гэта было так нечакана, што партызан, які толькі хвіліну таму здаваўся дужым і смелым, з перапуду кульнуўся з мяшэчка, выпусціўшы з рук аўтамат. Той глуха гоцнуўся на зямлю, проста пад ногі Івану.

“Іншага выпадку не будзе!” – Іван імкліва схапіў аўтамат, кінуўся на разведчыка і выцяў яго шмайсерам па галаве. Той, мабыць, нават не зразумеў, што адбылося. Дрыгануўся і заціх.

“А цяпер хуценька ў плябанію, можа, яшчэ паспею, мушу паспець”. – Іван ускочыў на ногі і не хаваючыся ірвануў да плябаніі. Ён асцярожна пацягнуў за жалезную каваную клямку, і дзверы лёгка паддаліся. Праз некалькі крокаў Іван апынуўся ў знаёмым

яму кухонным пакоі. Акінуўшы вокам пустое памяшканне, ён паціхеньку зайшаў у калідор, пасля прытаіўся і прыслухаўся. Аднекуль з-пад падлогі даносіўся прыглушаны шум.

“Відаць, у падвал павялі”. – Іван стаў спускацца па сходах. За падвальнымі дзвярыма ужо грамчэй гучалі галасы. Часу на развагі не было. Ён адчыніў дзверы і ў цьмяным агні свечкі ўбачыў Зубава, які выціраў аб рукаў сваёй фуфайкі трафейны нож. Тут жа стаялі двое разведчыкаў.

– А ты, полицай, зачем здесь? Решил посмотреть?

– Ён жа ні ў чым не вінаваты, ён жа людзей нашых ратаваў...

– Ах ты, морда полицейская, фашистского прихвосня пожалел! – Галоўны разведчык працягнуў руку па аўтамат, які ляжаў на куфры. Марудзіць больш не было як, і Іван ірвануў з-пад крыса шмайсер...

Калі аглушаны доўгай, на ўвесь ражок, чаргой Іван адпусціў курок, у падвале стаяла мёртвая цішыня. Лявеза сеў проста на падлогу. Пасярод падвала і па кутах ляжалі пастраляныя ім разведчыкі. Бліжэй да дзвярэй ніцма ляжаў пробашч. Іван падышоў да яго, асцярожна перавярнуў на спіну і падклаў пад галаву нейкі рызман.

– Ойча, вы мяне чуеце? Вы мяне чуеце, ойча?! – Іван з усяе сілы трос нерухомае цела. У гэты момант вейкі ксяндза задрыжалі, і ён адплюшчыў вочы.

– Ойча, вы жывы! Я вас выцягну адсюль, пацярпіце крышку, ойча. – Лявеза ўхапіў параненага пробашча за плечы і пачаў валакчы да дзвярэй, што вялі наверх.

– Іван, не тшэба, – ледзь чутна прашаптаў пробашч. Лявеза нічога не чуў і працягваў валакчы. – Не тшэба. О, майн Гот.

Гэтым разам Іван пачуў голас ксяндза. Ён падклаў сваю левую руку яму пад галаву і прыпадняў яе.

– Ну, як вы, ойча? – Іван агледзеў цела ксяндза, шукаючы рану. З-пад рукі параненага, якая заціскала левую грудзіну, сачылася кроў.

– Я перавяжу вас. – Лявеза стаў аглядвацца па баках, шукаючы якога небудзь лахмана. У гэты момант цела ксяндза стала ўздрыгваць, і ён моцна застагнаў.

– Іван, твае кіндар, я іх...

– Мае дзеці, што з імі?! Ойча, яны жывыя? – Цела ксяндза раптам абмякла, рука, што затуляла рану, апала ўніз. Іван зразумеў, што пробашча ён не ўратаваў. Ён нахіліўся над акрываўленым целам і заплакаў...

Іван добра ведаў дарогу з Зарэчына ў Наскава. Па ёй ён мог ісці з завязанымі вачыма. Але цяпер ён бег, думаючы толькі аб адным – каб паспець. Ужо быў відзён хмызняк, у які ён хадзіў маладзёнам за савякамі, а за ім у лагчыне – яго родная вёска.

Праз некалькі хвілін Іван быў ужо на пагорку, за нейкі кіламетр ад Наскава. І тут ад убачанага ён ажно прысеў. Вёска гарэла, як вялізная паходня. Здалёк здавалася, што гарыць не вёска, а небасхіл. З Наскава даносіліся стрэлы – адзіночныя і чэргамі.

Хутка Іван апынуўся на загуменні. Гарэла хата Ігната Марвыша, які быў адным з самых заможных гаспадароў. Толькі ў яго жытло было накрыта шыферам, які ў агні страляў і разлятаўся гарачымі аскепкамі. Займалася хата Нічыпара Дзявёлы – Іванавага суседа. Ён сходу перамахнуў праз невысокі паркан, праз сад убег на свой падворак і спыніўся, як укапаны. На ганку, раскінуўшы рукі ў розныя бакі, ніцма ляжаў стары Лявеза.

– Тата-а! – Іван падскочыў да бацькі – ён быў увесь у крыві, але дыхаў і быў пры памяці. Стары не мог уцяміць, дзе ён, на гэтым свеце, ці ўжо на тым? Яго забіты сын стаяў перад ім і штосьці гаварыў. Некалькі хвілін цішыні, і стары Лявеза, дарэшты апрытомнеўшы, прашаптаў:

– Янак, дзяцей ратуй.

– Дзе яны? – Іван насцярожана паглядзеў у перакошаны ад болю твар бацькі.

– Ксёндз перад Калядамі прывёз... – Адчувалася, што сілы

пакідаюць старога. Іван асцярожна апусціў галаву бацькі на ганак і імгненна падняўся на ногі. Марудзіць не было калі, Іван маланкаю ірвануў у хату. Каля вакна, на саматужным драўляным ложку ляжалі два нерухомыя цельцы. Дзяўчынка з растузанай касой і чарнявы хлапчук гадоў трох.

– Што з вамі, маленькія мае? – Іван нярвова агледзеў сваіх дзетак, ніяк не верачы ў іх смерць. Ён знямелай рукой павольна сцягнуў з іх акрываўленую коўдру. Дачка і сынок ляжалі, абняўшы адзін аднаго на залітым крывёй ложку... Іван заенчыў. Той, каму давялося б пачуць гэты енк, перапалохаўся б да смерці. Гук, які вырваўся з Іванавага горла, быў зусім не падобны на чалавечы крык...

На старой, расколатай напалам вярбе, што дажывала свой век сярод балота, вісеў труп яшчэ даволі маладога чалавека. На моцным пранізлівым ветры ён хістаўся ў розныя бакі. Хоць ужо развіднела, сонца на неба выходзіць не спяшалася, нібы баялася пабачыць гэты змрочны краявід.

Пад вярбой, якраз пад самым вісельнікам, у гразі валялася чорная паліцэйская шапка.

# ЧОРНАЯ ВОЛЯ

У назовах нашых вёсак і гарадоў схаваны незразумелы для нас код, і ён, як міна замаруджанага дзеяння, абавязкова спрацуе ў прызначаны кімсьці час: ні раней, ні пазней. І дадзенае наканаванне мы змяніць не ў стане ні ў якіх варунках.

Вёска Чорная Воля спакон веку мясцілася ў самым сэрцы Ліпічанскай пушчы. Пасярэдзіне вёскі, нібы пупавіна, цягнулася звілістая рака, падзяляючы яе на дзве раўназначныя часткі. Валянцы, якія жылі на левым нізкім беразе ракі, называлі сваіх аднавяскоўцаў з берага, што мясціўся на ўзвышшы, ляснымі. Тыя ж, у сваю чаргу, з-за таго, што першыя жылі пры балоце, называлі іх дрыгоўцамі. Хаця ўрэшце ўсе жыхары Волі былі паміж сабою альбо сваякамі розных канструкцый, альбо яшчэ важней – кумамі ды сватамі. Значных паселішчаў побач з Чорнай Воляй не было, так дзе-нідзе закінуты паляўнічы хутар ці будан якога-небудзь прыблуднага з Жыровіцкага манастыра чарняца. І паўсюль, як неабдымнае неба, пушча. Ад таго ўсё жыццё мясцовых людзей варылася тут, у сваёй вёсцы, у самым сэрцы Ліпічаншчыны, па берагах жыццяноснай для іх Шчары.

З-за адсутнасці сістэматычных зносінаў з астатнім светам люд мясцовы жыў пераважна з таго, што давалі яму лес ды рака. Дзякаваць Богу – і пушча, і Шчара ў тую пару былі ўрадлівыя. Культурнае і духоўнае жыццё Волі будавалася пераважна на рэлігійных святах ды мясцовых звычках яшчэ ад сівой даўніны. Карацей кажучы, звычайная вёска, якіх на Беларусі процьма. Ды была ў дадзенага паселішча адна таямніца – назва. Ніводзін разумны чалавек не мог праўдзіва растлумачыць, адкуль яна ўзялася, гэтая загадкавая Чорная Воля.

Былі такія, што выводзілі назву вёскі яшчэ з часоў Вітаўта і нямецкіх рыцараў. Іншыя лічылі, што сфармавалася назва з-за аддаленасці вёскі ад тамтэйшых цэнтраў Дзятлава, Слоніма, Дзярэчына. Вы мне можаце запярэчыць, маўляў, ці мала на свеце назваў, пра якія не тое што сказаць няма чаго, а іншы раз на-

огул узгадваць брыдка. Я лічу ўсё ж, што такое меркаванне будзе памылковым, бо кожная назва – гэта сімвал, у якім схавана і мінулае, і сённяшняе, а, галоўнае, перспектыва на будучае. Ці не ад таго спакон веку беларусы стараліся называць сваіх дзяцей імёнамі святых, каб апошнія з нябёсаў аберагалі ды прыглядвалі за тымі, каму іх імёны дадзены. Вось так і назвы нашых вёсак і гарадоў нясуць у сабе нейкую таямнічую загадку. Толькі мы, на жаль, з-за сваёй неадукаванасці яе ніяк не можам разгадаць.

З таго самага моманту, як цётка Адэля перарэзала яму пупавіну, Сымон жыў тут, у Чонай Волі. Дзяцінства яго, як, дарэчы, і ранняе юнацтва, праходзіла пасярод вось гэтых дуброваў ды алешнікаў на беразе ўлюбёнай Шчары. Тут ён сапраўды быў шчаслівы. Зімой і летам – рыбалка, збіранне грыбоў ды ягадаў, розныя звязаныя з пушчай і Шчараю прыгоды. Усё тут было –і першае каханне да суседскай дзяўчыны, і бойкі з дрыгоўцамі, якія адбываліся амаль кожны тыдзень. Дзіцячае нутро Сымона напоўніцу жыло ў Волі тутэйшымі радасцямі, якія цешылі душу, ды жалямі, што не давалі ёй закамянець. Вясковаму хлапчуку здавалася, што за яго вёскай няма болей нічога, і яго вялікая Чорная Воля – гэта цэнтр свету.

Ды нарэшце надышло 20 стагоддзе, усё часцей і часцёй у Волю пачалі заязджаць людзі з мястэчкаў і гарадоў. Старэйшыя хлопцы пачалі выбірацца на вучобу ў мястэчкі і гарады, у іншыя дзяржавы і за моры. Карацей кажучы, цывілізацыя няўмольна пачала браць сваё. Скончылася і Сымонава дзяцінства, прыйшла пара нарэшце зрабіць першыя крокі насустрач жыццю, якое рыхтавала яму новыя ўражанні і захапленні.

Пасля таго, як Сымона адвезлі ў Дзярэчынскую школу, хлопец абсалютна змяніўся, ён прагнуў вучобы, імкнуўся пасля ўрокаў у бібліятэку, надакучваў пытаннямі выкладчыкам. За некалькі гадоў у местачковай школе ён стаў адным з самых паспяховых вучняў. Сымонава прыналежнасць да пушчанскай Волі ўжо разглядалася выкладчыкамі ды шкалярамі як звычайная рэчаіснасць. А прыканцы вучобы сяброўствам з ім ужо ганарыліся

дзеці самых заможных местачкоўцаў. Але і вучоба ў Дзярэчынскай школе скончылася скора, як і канчаецца дзяцінства. Бацька, улічваючы здольнасці сына і яго прагу вучобы, па рэкамендацыі дырэкцыі школы ўладкаваў Сымона ў Слонімскую гімназію, якую той скончыў праз пару гадоў таксама на "выдатна".

І вось прыйшла пара нарэшце выбіраць свой дарослы жыццёвы шлях. Сымон вырашыў цвёрда – Карлаў універсітэт у Празе, дзе выдаваў сваю Біблію Скарына, дзе працуе ў выгнанні ўрад Беларускай незалежнай дзяржавы, дзе гуртавалася ўся перадавая беларуская інтэлігенцыя. Вось дадзены горад і стане яго выбарам.

– У Прагу, толькі ў Прагу!

Бацька запрог каня, праверыў ляйчыны, хамут, падводу і з задавальненнем, што ўсё ладзіцца, з усяго маху ляпнуў каня па крупе. Той ледзь не выскачыў з аглабель.

– Тпр-р-ру, ядры тваю палку, куды рвешся? Да Ёселя-скуралупа яшчэ паспееш.

Усё гэта прамаўлялася без злосці і крыху нават з гумарам. Бацька яшчэ раз абышоў вакол воза і накіраваўся ў хату. Маці ціха плакала і нешта сама сабе прычытала, час ад часу праціраючы прыполам мокрыя ад слёз вочы.

– Ну добра, годзе ўжо, не на вайну праводзіш, а на вучобу.

Але маці слоў бацькавых як быццам і не чула, толькі плакала і плакала.

– Ты лепш выйдзі ды паглядзі, што на падворку робіцца, амаль уся Воля праводіць твайго сына выйшла.

Усе хатнія, шасцігадовая Адэля і васьмігадовая Вольга, наперагонкі кінуліся да вокнаў. Толькі васьмідзісяцігадовы матчын бацька Ладзік нават не зварухнуўся са свайго месца на печы. Ён толькі незаўважна зірнуў на Сымона і зноў заплюшчыў вочы.

– Мама паглядзі, і сапраўды ўся вёска прыйшла, – прамармытала малодшая Адэля.

– Во як яны нашага Сымона любяць, – дадала старэйшая.

У гэты самы час дзед на печы цяжка закашляўся.

– Можа, табе, дзеду, вады падаць? – спытаўся Сымон.

– Падай, унучак.

Сымон падхапіўся з месца, зачэрпаў з драўлянага вядра кубак вады і ў два крокі аказаўся каля свайго састарэлага дзеда.

– Папі, дзеду.

Той ізноў адкашляўся і, пакрэктваючы, пацягнуўся да кубка.

– Кідайце, дзеду, паліць, а то вунь як хрыпіцё.

– А нашто мне кідаць? У маім веку цыгарэты – як лекі, што засцяць боль. Без іх я ўжо не жыхар на гэтым свеце, унучак. Ты лепш вунь пра што паслухай, Сымоне. Бачыш, як яны цябе праводзяць? – Дзед кіўнуў галавой у той бок, дзе былі вокны. – Самае галоўнае, каб яны цябе так жа сустракалі. Зразумеў?

Дзед сваімі прымружанымі і пранізлівымі вачамі заглянуў Сымону проста ў душу. Праз хвіліну дзед, не чакаючы ад ўнука адказу, адвярнуў галаву ўбок і, укладваючыся на кажух, прашаптаў:

– Галоўнае – не як правядуць, галоўнае – як сустрэнуць.

– Ну, годзе, – прамовіў бацька. – Пара ад'язджаць, а то як будзем так выбірацца, то на цягнік трапім толькі заўтра.

Маці, пачуўшы бацькавы ўшчуванні, нарэшце прыціхла. Сымон ухапіў цяжкі драўляны сундук з ручкаю, што яшчэ дзед Ладзік прывёз з Першай сусветнай, і, нахіляючыся на адзін бок, павалок яго з хаты ў накірунку воза. Дзяўчаты хапалі астатнія пажыткі Сымона і, сварачыся паміж сабою, пацягнулі усё на падворак. Як толькі сямейства Сымона з рэчамі выпаўзла на вуліцу, ад людзей, што стаялі паўсюль, пачуліся развітальныя словы. Тут і дзявочае: не забывай, Сымоне. І пажаданне бабулек: Бог у помач. І зайздрасць хлопцаў: от жа, пашчасціла.

Па нарастаючай галасы зліваліся ў аднародны натужны гул. І ўсё, што адбывалася на падворку Лупача, выглядала нечуванай падзеяй, бо ніколі яшчэ ніводзін валянец не вучыўся ў такой знакамітай вучэльні. Святары ў Волі былі, былі пісары, аканомы, але каб вучыцца ў Пражскім універсітэце? Не, такога ў Волі не было яшчэ ніколі. І ад таго не толькі Лупачы, а ўся Воля гана-

рылася Сымонам. Але больш за ўсіх ганарыўся, канечне, бацька Сымона Янак. Ён бадзёра, хаваючы сваё задавальненне, снаваў каля падводы, папраўляючы вупраж.

– Ну ўсё, развітвайся, і паехалі. – Сымон павярнуўся да маці, якая, нібы на пахаванні, зацягнула:

– Ах сыночак ты мой! А калі ж мы пабачымся? – Сымону стала няёмка за сваю расчуленую маці, але ён нічога не прамовіў, а толькі абняў яе і, нахіліўшыся, пацалаваў у салёныя ад слёз шчокі, пасля чаго імгнення заскочыў на вазок.

– Но пайшоў! – галёкнуў бацька на каня. Дзеці, якіх тут сабралася процьма, ірванулі за вазком. Пажылыя валянцы, бойка размаўляючы паміж сабой, сталі павольна выходзіць з падворка Лупача. Валянская ж моладзь засталася на месцы, перавёўшы размову на нешта сваё. Вазок шпарка рухаўся па звілістым гасцінцы і ўжо праз хвіліну згінуў у зялёным пушчанскім моры. Сымон сядзеў крыху наводдаль ад бацькі, падпершы рукамі галаву. Яму было вельмі сумна, не хацелася пакідаць Волю, маці, малых сясцёр, якія выгадаваліся на яго вачах. Але больш за ўсё ён сумаваў па сваім даўнім сябру Кастусю Краўцэвічу. З маленства яны былі разам.

“Жывуць па розных берагах вёскі, а заўсёды разам. Можа, яны блізнюкі? Трэба абавязкова папытаць пра гэта Лупача ці Краўцэвіча”, – жартавалі ў Волі. І калі вучыліся ў Дзярэчыне, яны ізноў былі разам. Бывала, у аднаго не атрымліваецца які-сьці прадмет, то яны будуць сядзець да раніцы, але толькі ўдваіх. Ну, а калі даводзілася заводзіцца з местачковымі, то біцца па адным яны наогул не ўмелі. У далейшым так было і ў гімназіі. Заўсёды ўдвух, паўсюль толькі разам.

І толькі прыканцы гімназіі ў іх адносінах стала нарастаць расколіна. І адбылося гэта ці то з захаплення Кастуся камуністычнымі ідэямі, ці таму, што Сымон падзяляў пазіцыі незалежнікаў. Ды толькі калі Сымон ад'ехаў у Волю, каб сабрацца ў Прагу, Кастуся арыштавалі. Людзі, якія прыязджалі са Слоніма, гаварылі, што апошнія дні бачылі Кастуся ў Слоніме, што ён разносіў па тамтэйшым кірмашы нейкія палітычныя ўлёткі. Так

яно было ці не, мог распавесьці толькі Кастусь, але дзе ты яго цяпер знойдзеш. Сымон сумаваў па сябру.

Вазок тым часам аднатонна грукаў сваімі абкаванымі коламі па старой слонімскай брукаванцы, адвозячы Сымона ўсё далей і далей ад яго дзяцінства, ад яго радасцяў, насустрач абсалютна невядомаму свету. Ішоў 1933 год, год карэнных пераменаў. Эканамічны крызіс задушваў заходнія краіны і Амерыку. У Германіі да ўлады прыйшлі фашыстоўцы, саветы з кожным годам нарошчвалі сваю ваенную сілу, фанабэрыстая Польшча выказвала сваю гатоўнасць да вайны супольна са сваімі агрэсіўнымі суседзямі. Але ўсе ў краіне добра разумелі: крый Бог што, ёй наўрад ці ўдасца абараніцца. Усе ў Еўропе чакалі перамен. Толькі якімі яны будуць, тыя перамены, наўрад ці хто здагадваўся...

## Сымон

Лёс шматкроць кідае чалавека ў прорву, забірае самае дарагое, а часам дорыць тое, чаго той ніколі не чакае. І чалавек тут змяніць нічога не можа. Можа толькі падпарадкавацца лёсу, альбо загінуць...

За час вучобы і вайны Сымон Лупач пасталеў. З даўгавязага шкаляра нейк незаўважна хлопец вырабіўся на прыгожага сталага мужчыну. Кучаравыя русыя валасы з выразнымі блакітнымі вачамі толькі ўпрыгожвалі яго амаль двухмятровую антычную фігуру. Сымон любіў спорт, неаднаразова ўдзельнічаў у чэмпіянатах свайго ўніверсітэта і горада Прагі. Прытым навука не была ў занядбанні з-за яго спартыўных дасягненняў. А што самае галоўнае, Сымон паміж многіх студэнтаў вылучаўся цвёрдай грамадзянскай пазіцыяй. Яго жыццёвае крэда – змаганне за свабодную, шчаслівую Беларусь. Калі будзе патрэбна – цаной жыцця.

Можа, таму ў эміграцыйным беларускім урадзе, які знаходзіўся ў Празе, гэтага высокага ліпічанскага хлопца любілі і паважалі ўсе без вынятку. Але не хапала Сымону канкрэтнай справы. Хапала розуму, ведаў, здароўя, а справы не было. Яго калегі з беларускай эміграцыі былі пераважна людзьмі сталага

веку і да нейкіх канкрэтных спраў наўрад ці падыходзілі. Ён жа, малады, разумны, няўжо мае сядзець у Празе каля жонкі, пісаць кніжкі і нікому непатрэбныя пракламацыі?

І вось, нарэшце, на пачатку вясны 1942-га прыйшло запрашэнне ў Менск. У афіцыйным лісце ўсё было сур'ёзна расапісана: дзе павінен жыць запрошаны, каму будзе падпарадкоўвацца, які будзе заробак і, самае галоўнае – пасада. А запрашалі Сымона стварыць і ўзначаліць школу Саюза беларускай моладзі ў яго ўлюбёным Слоніме. Разважанні былі нядоўгімі. Ехаць!

Снежань 1943-га ў Беларусі выдаўся не надта халодным. У акупаваным начным Слоніме было ціха і сумна. Толькі час ад часу з другога берага Шчары раздаваўся прыглушаны брэх сабак, які ў марозную ноч чуўся, быццам з-за вугла.

"Пэўна, у турме", – падумаў сам сабе Сымон. З таго часу, як ён прыехаў у альбярцінскую школу СБМ на пасаду дырэктара, з гэтым сабачым шматгалоссем яму даводзіцца і класціся спаць, і падымацца. Прытым, кватэру акупацыйныя ўлады адвялі Лупачу ў самым выгодным месцы. Дом, у якім ён жыў, належаў раней слонімскаму габрэю, якога звезлі ў гета прыканцы 41-га.

Параўнанне даваеннага Слоніма з цяперашнім для Сымона было – як белае і чорнае. А пасля таго, як ён некалькі дзён таму адвёз сваю сям'ю ў Чорную Волю да бацькоў, на душы зусім стала цяжка. Лупач сядзеў ля стала, піў гарбату і паліў. Спаць зусім не хацелася. Кожную ноч, з тых пор як сям'я была ў Волі, ён думаў пра сваіх дачок-блізнятак Алеську і Зоську, ды пра сваю каханую Ларысу, якую спаткаў у далёкім 38-м у Празе.

Тут Сымон выпадкова злавіў сябе на думцы, што цяпер ён давярае толькі свайму намесніку Яну Пяцюшыку, бо той быў, па-першае, земляком, з пушчы, па-другое, яго аднадумцам. Сымон, пакінуўшы разважаць пра сваю цяперашняю службу, пачаў у думках хваліць Пяцюшыка. "Каб не ён, мне было б тут зусім цяжка, а ён жа і справы колькі робіць, дый мяне ў сітуацыю тутэйшую, не зважаючы на свой занятак, увёў."

У гэты самы час за вакном пачулася фырканне аўто, водбліск

фар якога асвяціў пакой Сымона.

– Ні дня яму няма, ні начы. – Пасля сказанага услых Сымон не стаў нават падыходзіць да вакна, бо тое аўто пазнаваў па гуку. Яно належала начальніку мясцовага гестапа маёру Клаўсу фон Хорсту.

Прускі арыстакрат меў універсітэцкую адукацыю, выдатна валодаў некалькімі мовамі. Ён часта наведваўся да Лупача, з якім мог паразважаць пра культуру, мастацтва, эканоміку. Сымон жа гэтага прускага барона, які быў зацятым нацыстам, на дух не пераносіў. Сымон часта думаў, ці правільна ён робіць, што сустракаецца з Хорстам. Ян Пяцюшык, калі яны з Сымонам аднойчы ехалі з Менска, быў заўважыў:

– Ужо калі стаў ім служыць, то глядзі каб у с... цалаваць не давялося.

Сымонавы разважанні перапыніў стук у дзверы.

– Заходзьце, пан маёр! – Дзверы павольна адчыніліся, і ў пакой зайшоў падцягнуты мужчына гадоў трыццаці ў чорнай эсэсаўскай уніформе.

– Гутэн таг, пан Лупач, – афіцэр зрабіўківок галавой, як прынята у арміі, і павольна накіраваўся да вешака.

– А дзе ваша жонка, пан дырэктар? Чамусьці я яе не бачу, а то яна мяне звычайна сустракала, – здымаючы шынель і фуражку, не гледзячы на Сымона, прамовіў афіцэр.

– Ды на Каляды да бацькоу завёз, яе і дзяўчат. Хай пабудуць у вёсцы.

– Я вас не разумею, пан дырэктар. Там жа паўсюль партызаны. Калі яны даведаюцца, хто гасцюе ў Волі, то ў вас будуць вялікія непрыемнасці.

– Пакіньце, пан маёр, яны не будуць ваяваць з жанчынаю і дзяцьмі.

– Я ў вашых словах, пан Лупач, адчуваю нейкую іронію. Значыць, мы ваюем з жанчынамі і дзяцьмі, а яны – не? Вы ж адукаваны еўрапейскі чалавек, пан дырэктар. Вайна гэтая вядзецца на вынішчэнне. Альбо мы іх, альбо яны нас, трэцяга няма.

Маёр паважна падышоў да стала, паправіў партупею, падставіў крэсла, важна прысеў на яго, закінуў нагу на нагу і запаліў. Сымон уважліва выслухаў нямецкага афіцэра, крышку падумаў, а затым сказаў:

– Ну, са мною зразумела. Але ж да каго прылічыць маіх маленькіх дзяўчат ды састарэлых бацькоў – да нацыяналістаў, калабарантаў? Ім жа невядомы нейкія навязлівыя ідэі, яны проста любяць жыццё, якое яно ёсць, любяць сваіх родных, бацькоў, сваіх суайчыннікаў. За што ж іх забіваць? Яны ж нікому не робяць шкоды.

– Але праз іх, пан дырэктар, можна зрабіць шкоду вам. А калі лічыць вас нашым хаўруснікам, то значыць, і нам. Вось і атрымліваецца, хочаце вы таго ці не, а і вы, і вашыя дзеці з'яўляецеся для іх ворагамі.

– Пан маёр, вы ж разумееце, што ў нас з вамі абсалютна розныя ідэі. Я беларускі дэмакрат, а вы член нацысцкай партыі. І аб'ядноўвае нас толькі тое, што ў нас адзін вораг. Дый метады змагання з ім у нас вельмі ж розныя.

– Я заўсёды ведаў, пан Лупач, што вы не падтрымліваеце нашу палітыку як у самой Германіі, так і на акупаванай тэрыторыі. Але ж я іншых, больш эфектыўных метадаў не ведаю.

– І таму ваша паліцыя без разбору паліць вёскі? – Ужо амаль не баючыся, прамовіў Сымон. – Я лічу, што гэта шкодна для справы, а самае галоўнае, бесчалавечна ў адносінах да звычайных людзей.

Маёр рэзка павярнуў галаву ў бок Лупача і нярвова прамовіў:

– А хіба ж чалавечна нападаць на бязбройных параненых нямецкіх салдат, якія знаходзяцца ў Чамярах на лячэнні? Забіваць нашых актывістаў па вёсках, знішчаць іх сем'і?

– Самае страшнае, пан маёр, у гэтай сітуацыі тое, што гінуць у гэтых карных аперацыях зусім бязвінныя людзі, якія ні на каго не нападаюць, нікога не крыўдзяць.

– Не, пан дырэктар, вы не маеце рацыі. Бязвінных на вайне не бывае, гэта толькі такім, як вы, здаецца што яны бязвінныя.

– Якім такім, пан маёр?

– А такім, якія ніяк не могуць зрабіць выбар – з кім яны. Але я вам праўду кажу, пан Лупач. Выбар толькі адзін: альбо мы, альбо яны, і трэцяй сілы няма. І калі вы не можаце аніяк зрабіць гэты выбар, за вас яго зробім мы. Маёр хвіліну падумаў, а потым дадаў:

– А можа, і яны...

Пасля сказанага Хорст пачаў успамінаць Еўропу і Прагу. Сымон, адчуваючы, што суразмоўцу надакучыла папярэдняя тэма, падтрымаў маёра. У далейшым размова пацякла, як звычайна, спакойна і безэмацыйна. Сымон дастаў пляшку гарэлкі, два шкалікі, і абодва суразмоўцы паддаліся ўспамінам пра былое, з задавальненнем пацягваючы гарэлку і палячы цыгарэты.

Гэтай ноччу Сымон амаль не спаў, хоць маёр пайшоў ад яго не вельмі позна. Што з ім адбывалася, ён не разумеў: ці то ён стаміўся, ці то захварэў, а можа, разважанні і думкі, якія грызлі яго душу кожную ноч, захацелі звесці яго з розуму? Ну добра, цяпер ужо раніца, а там новы дзень, новыя ўражанні. Сымон падняўся, сеў на ўскраек ложка і запаліў цыгарэту.

“Як сумна і ціха без Ларысы і дзяўчат.” Сымон агледзеў пакой, і яму раптам падалося, што за дзвярыма ён чуе галасы дзяўчат, а жонка рыхтуе сняданак. О, якія салодкія ўспаміны!

Раптам за вакном хаты пачуўся знаёмы гук аўтамабіля.

– Ён што, здурэў – прыязджаць у такую рань? – Праз хвіліну нехта нярвова загрукаў у дзверы.

– Зараз, пан маёр, зараз. – Сымон накінуў паліто і адчыніў дзверы. На парозе стаялі двое: яго вячэрні госць і Ян Пяцюшык.

– Прабачце, пан дырэктар, што мы вас так рана турбуем, але ў мяне непрыемныя навіны.

– Якія? – Сымон насцярожанна ўзіраўся ў твары Хорста і Пяцюшыка.

– У паліцэйскую ўправу тэлефанавалі з Руды, кажуць, што бандыты зрабілі напад на Волю.

Сымон пахапіўся з месца і пачаў бегаць па пакоі, нібы нешта шукаючы.

– Супакойцеся, пан дырэктар, – прамовіў Пяцюшык.

– А дзе мой капялюш? – Лупач няўцямна азіраўся па баках.

– Ды вось ён, на вешаку. – Сымон схапіў капялюш разам з паліто і, не апранаючыся, паспяшаўся на двор. Маёр і яго спадарожнік, нічога не гаворачы, пакрочылі следам.

– Пан Лупач, нікуды ехаць пакуль не трэба. Праз гадзіну будзе сфармаваны атрад, вось тады разам з ім і рушым, – уладна прамовіў фон Хорст. Сымон яго як быццам не чуў.

Зборны атрад, у які ўваходзілі эсэсаўцы са Слоніма, паліцаі з Руды і Дзярэчына, толькі ў другой палове дня дабраўся да Волі. Лупач, стоячы ў санях, ехаў наперадзе. На тых жа санях ззаду сядзеў Пяцюшык. Сымон, як ашалелы, гнаў каня і думаў толькі пра адно – ці жывыя яго дзеці і Ларыса, што з яго бацькамі? І вось ён ужо на узвышшы пасярод вёскі, адкуль заўсёды была відна бацькоўская хата. Вось яго вуліца. І нарэшце...

– Тпр-р-у! – ад ўбачанага Сымон анямеў, хоць сані яшчэ працягвалі сунуцца з горкі ў накірунку Лупачовага падворка. Ён ужо саскочыў долу, і вось... Каля асмалкаў пад старажытны дубам, адзін каля аднаго ляжала пяць абгарэлых трупаў. Тры целы, якія знаходзіліся бліжэй да дуба, напэўна, належалі дарослым; два другіх адназначна былі дзіцячыя. Якраз каля іх, апусціўшы галовы, трымаючы ў жменях шапкі, стаялі тры дзядзькі – мясцовы солтыс гадоў пяцідзесяці і два маладых паліцаі з Дзярэчына. Па іх было відаць, што мужчыны вынеслі трупы малых, дасталі са згарэлай хаты толькі што. Сымон імгненна падскочыў да абгарэлых целаў. Страшная карціна, якая яму адкрылася, цалкам паралізавала ягоную волю. Ён ажно захістаўся і ўпаў на калені каля сваіх родных...

Колькі ён знаходзіўся ў такім стане, Сымон не ведаў. Але калі расплюшчыў нарэшце вочы, навокал было ціха і спакойна. Па прасторным пакоі хадзілі нейкія мужчыны ў белым, а вакол адзін каля аднаго стаялі ў некалькі радоў металічныя ложкі.

– Чаму так ціха? – Сымон паспрабаваў падняццца, але моцы хапіла толькі, каб прысесці на ложку. Калі ён яшчэ раз уважліва агледзеўся навокал, то зразумеў, што знаходзіцца ў нейкай больніцы. Моцна балела галава. Сымон павольна прылёг на ложак і праз хвіліну заснуў. Калі ён ізноў расплюшчыў вочы, то перад сабою ўбачыў свайго намесніка і сябра Яна Пяцюшыка, які з жалем і заклапочанасцю ўзіраўся яму ў твар.

– Ян, што са мной здарылася? Хто мяне сюды прывалок?

– У цябе нярвовы шок пасля ўбачанага, ты нават прытомнасць страціў, – прамовіў Пяцюшык. Сымон нерухома ўглядаўся ў белую, як бялізна, столь. Ён не мог плакаць, ён нават не хацеў верыць у тое, што ён пабачыў у Волі. Ён сціснуў зубы і праз некаторы час звярнуўся да Пяцюшыка:

– А што з імі?

– Пахавалі ўсіх на падворку каля дуба.

– Усіх?

– Ну а як жа? Бацькоў з левага боку, ну, а дзетак... – Ян уздыхнуў і дадаў, – бліжэй да веснічак. Ох, як дзетак шкада, і бацькоў, ды і ўсіх валянцаў.

Сымон нерухома працягваў углядацца ў столь.

– Якіх валянцаў?

Сымон прыпадняўся з ложка і ўважліва паглядзеў у вочы Яна. Той нярвова круціў галавой, як быццам яму нешта свярбела пад каўняром.

– Ян, я цябе прашу скажы, што там яшчэ здарылася?

Пяцюшык працягваў моўчкі круціць галавою, пазбягаючы пранізлівага погляду свайго начальніка.

– Ян, я ў цябе пытаюся! – прыкрыкнуў Сымон.

Тут Пяцюшык не стрымаўся і пачаў расказваць:

– Хорст загадаў выкапаць яму, паставіў каля яе ўсю вёску і расстраляў усіх: і дзяцей, і старых. Трыста пяцьдзесят чатыры чалавекі...

Пасля сказанага Пяцюшык затросся, як асінавы ліст. Рукі ў яго дрыжалі, твар перакасіўся. Па ўсім было відаць, што расстрэл вяскоўцаў яго шакаваў.

– А ты што, няўжо не мог запярэчыць? – Сымон сціснуў зубы і злосна паглядзеў на Яна.

– Ага, запярэчыш Хорсту. Солтыс валянскі пасля таго, як тваіх пахавалі, пабег сваю сям'ю вызваляць. Дык Хорст яго першым і расстраляў...

Галава ў Сымона забалела яшчэ больш, ён заплюшчыў вочы, закрыў твар рукамі. Ян зразумеў, што робіцца ў душы Лупача.

– Ну добра, Сымон, пайду я, бо і так засядзеўся.

Ян паклаў руку на плячо Сымону, уздыхнуў і падняўся. Зрабіўшы некалькі крокаў да дзвярэй, ён рэзка прыпыніўся і, не паварочваючыся ў бок Сымона, прамовіў:

– Паліцаі тады Кастуся Краўцэвіча ў Волі паймалі, казалі, нібы ён партызанаў на тваю хату навёў. Ды ўцёк Краўцэвіч. А можа, і адпусціў хто.

Пяцюшык выйшаў за дзверы. Сымон са стогнам паваліўся на ложак. Гэта была самая страшная ноч у яго жыцці. Што яму давялося пеpажыць – ведаў толькі ён.

Праз некалькі дзён Сымон, не развітваючыся і не звальняючыся са школы, ад'ехаў у Менск. Але нават там ён не захацеў заставацца і праз некаторы час, спаслаўшыся на сваё дрэннае здароўе, выехаў на захад. Пасля ўсяго, што здарылася, ён не мог ды і не хацеў знаходзіцца тут. Лупач спадзяваўся, што на чужыне пазбавіцца ўрэшце ад перажытага ў Чорнай Волі. І ён яшчэ зможа пачаць новае жыццё. На жаль, ён спадзяваўся дарэмна. Сумленне і памяць катавалі яго да канца жыцця.

## Кастусь

З таго часу, як Кастусь Краўцэвіч пасля звязнення ў Бярозе Картузскай перабраўся у Менск, пабываць яму ў Чорнай Волі давялося толькі ў 1939 годзе. Справа ў тым, што за год да таго, падчас

родаў у Менску памерла яго жонка Алена, але хлопчык, іхні сын, выжыў. Цэлы год Краўцэвіч гадаваў дзіця як мог. Па праўдзе кажучы, немаўля наўрад ці выжыла б, каб на той час Кастусь не займаў важную пасаду ў ЦК камсамола. Сувязі дапамаглі. Хлопчык з часам вылюдзіўся і стаў прыгожым, бялявым, з вялікімі блакітнымі вачыма. Ну – копія памерлай маці, якую Кастусь вельмі кахаў.

Сам Кастусь з часу заканчэння Слонімскай гімназіі ад усяго перажытага моцна змяніўся і душой, і целам. Неўзабаве настаў 1939 год. Кастуся Краўцэвіча, як знаўцу жыцця ў Заходняй Беларусі, выправілі ўслед за савецкімі акупацыйнымі войскамі на тэрыторыю толькі што сфармаванай Баранавіцкай вобласці.

Яшчэ ў Менску да Кастуся даходзілі весткі, што бацькі яго, дзякаваць Богу, жывыя і здаровыя. Перабраўшыся ў Баранавічы, ён, як толькі абжыўся на новым месцы, паехаў са сваім гадавалым сынам у Волю. Пасля прыемнай сустрэчы бацька і маці ўгаварылі Кастуся пакінуць малога ў іх, маўляў, тут яму і малако, і бульбачка маладая. Кастусь, павагаўшыся, Сымонку ў Волі пакінуў. Вось гэта і быў той апошні раз, калі ён заязджаў дахаты. А потым трапіў у вір неадкладных спраў на новым месцы, змагаўся з міраедамі-кулакамі, усталёўваў савецкую ўладу на месцах, ездзіў па гарадах ды вёсках. А тут неўзабаве пачалася вайна. Кастусь адышоў на ўсход, а сын так і застаўся ў бацькоў у Чорнай Волі. І толькі гэтай зімой, калі Кастуся ізноў накіравалі ў заходнія вобласці Беларусі, яму пашчасціла трапіць у пушчу, дзе ўсяго за некалькі кіламетраў ад базы партызанскага атрада знаходзіўся яго сын і жылі яго бацькі...

Пасярод старых соснаў і партызанскіх буданоў хадзіў шыракаплечы, сярэдняга росту малады мужчына. З-пад вайсковай шапкі на каўнер кажуха спускаліся доўгія чорныя з сівізной валасы. Прымружаныя вочы зусім заплюшчваліся, калі едкі тытунёвы дым, рассейваючыся ў густых чорных вусах, засціў мужчыну свет. Турма не сапсавала яго станістай фігуры. Толькі глыбокія маршчыны на твары і сівізна падказвалі, што жыццёвы шлях у яго быў нялёгкі.

– Што яны там марудзяць? – Кастусь паліў цыгарэту і нярвова праходжваўся сюды-туды. Ён толькі дзве гадзіны назад угаварыў камандзіра мясцовага партызанскага атрада, каб той адпусціў яго пабачыцца з роднымі. Але возны, які павінен быў яго падвезці ў Волю, нешта не паяўляўся. Нарэшце з зямлянкі выйшаў пажылы, трохі згорблены мужчына гадоў пяцідзесяці пяці ў старым, трошкі парваным кажуху. З-за паднятага каўняра і прыцемка, які ўжо спусціўся на пушчу, Кастусю не ўдалося разгледзець яго твар. У гэты самы момант з зямлянкі наверх высыпала яшчэ чалавек пяць, сярод якіх быў і Шукуня – камісар атрада. Апошні, як толькі ўбачыў Кастуся, звярнуўся да яго з прапановаю:

– Паслухай, Краўцэвіч, хай з табой паедуць нашы разведчыкі.

– Навошта, я ж пушчу лепш за іх ведаю, – запярэчыў Кастусь.

– Ды не, нам з Волі перадалі, што да сваіх бацькоў завітаў калабарант Сымон Лупач.

– Сымон?

– Я ведаю, што ён былы твой сябар.

Кастусь добра разумеў, што магло быць з тымі, хто кантактаваў з ворагам.

– Ды не, проста гадаваліся разам, а затым вучыліся ў Дзярэчыне і Слоніме. Усё даўно ў мінулым. А як быць з Лупачом?

– А вось вам якраз і заданне – затрымайце здрадніка. А калі не, дык... – камісар махнуў рукой, – у расход яго, зразумела?

– Ды што тут не зразумець. – Кастусь кінуў апошні позірк на камісара і заскочыў на запоўненыя разведчыкамі сані.

– Но, пайшоў, – скамандаваў возчык, і нагружаныя сані крануліся з месца ў накірунку заснежанай прасекі, якая вяла ўглыб лесу. Пакуль ехалі пушчай, Кастусь перадумаў усё сваё жыццё. У галаве круціліся ўспаміны пра дзяцінства, Дзярэчынскую школу, Слонімскую гімназію.

"Што ж здарылася? Чаму мы з лепшым сябрам апынуліся па розных берагах Шчары? А якія былі мары – Незалежная Беларусь, беларускае адраджэнне. Мы і нашыя дзеці жывем у сва-

боднай краіне. Дзеці, дзеці... Як там мой маленькі Сымончык...” Перад вачыма Кастуся ўсплыў твар сына. “Божа, які ён усё ж прыгожы, мой маленькі сынок! За гэтыя пару год, пэўна, зусім вырас.”

Санкі, выехаўшы з гушчара, пайшлі шпарка і ціха.

– Краўцэвіч, а ты што, бляха-муха, застанешся ў Волі? – прагучаў голас спераду. Кастусь памятаў гэты голас. Праз хвіліну натужлівых успамінаў Кастусь бадзёра прамовіў:

– Дзяцька Рыгор, гэта ты? Ну, слухай, ні за што б цябе не пазнаў бы, каб не твая вечная прымаўка.

– Ну, канешне, бляха-муха. – Мужчына апусціў каўнер старога парванага кажуха і павярнуўся да Кастуся. На няголеным і абмерзлым твары возчыка засвяцілася стрыманая мужчынская ўсмешка.

– А то гляджу, бляха-муха, Краўцэвіч, а не вітаецца.

– Ды я вас, дзядзька Рыгор, у гэтым кажуху проста не пазнаў. Вы таксама пайшлі ў партызаны?

– Пайшоў, бляха-муха, а хто ў мяне пытаў? Тою зімой заваліўся ў хату камісар Шукуня з двума акружэнцамі, бляха-муха, вось табе я і партызан. Я кажу яму – у мяне трое дзяцей, малодшае меншае за ягня, а ён на мяне: смірна! за мной шагам марш! Вось і ўсё, бляха-муха.

Кастусь добра ведаў дзядзьку Рыгора. Быў ён з суседняй вёскі Капці. А значыць, і прозвішча меў Копаць, хоць усе яго называлі па мянушцы – Бляха-муха. Не было ў пушчы чалавека, які яго не ведаў бы. Сярод пушчанцаў Рыгора Копаця ведалі як вясёлага расказчыка розных баек ды небыліцаў. Хаця цяпер яму, як відаць, не да баек.

– Так хочацца бацькоў пабачыць, дзяцька Рыгор, дый сына не бачыў аж з 39-га. Пабуду з ім дзён два і назад. – Кастусь акінуў поглядам сваіх спадарожнікаў і, крыху пачакаўшы, дадаў: – А хлопцы, дзяцька Рыгор, і самі справяцца, праўда? – Краўцэвіч паклаў руку на плячо камандзіра разведчыкаў.

– Справімся, канешне, хіба першы раз.

– Вось такія справы, дзяцька Рыгор.

Рыгор адкашляўся, павярнуўся назад і ўжо зусім сур'ёзна дадаў:

– Гэтыя, канешне, справяцца, бляха-муха. – Апошнія словы Копаць прамармытаў ужо наогул з'едліва.

– Ты, Копаць, пацішэй там, – праз зубы працадзіў камандзір разведчыкаў. Пасля апошніх катэгарычных слоў сярод ездакоў запанавала цішыня.

– Ну, вось, Кастусь, твая хата. Тпру, бляха-муха!

Конь, памахваючы абмерзлым хвастом, прыпыніўся каля бярозы, што расла якраз насупраць Краўцэвічавага падворка. Кастусь агледзеўся навокал, кіўнуў на развітанне разведчыкам і бадзёра саскочыў з саней.

– Да пабачэння, дзяцька Рыгор. – Возны, не паварочваючыся ў бок Кастуся, махнуў рукой.

– Но-о, пайшла, бляха-муха. – Сані з разведчыкамі рушылі ў накірунку моста, што вёў на другі бераг Шчары. Кастусь ішоў, няспешна аглядаючы падворак. Праз хвіліну ён ужо быў каля крайняга вакна, за якім мясціўся ганак. Кастусь грукнуў у шыбу. Ніхто не адгукаўся. Кастусь пастукаў яшчэ раз.

– Хто там? – З хаты пачуўся насцярожаны голас мужчыны.

– Тата, гэта я, Кастусь.

З-за акна пачаў даносіца нейкі вэрхал. Хтосьці мітусіўся па хаце, да мужчынскага голасу дадаўся і жаночы. І вось нарэшце бразнула засаўка, і на ганку паказаўся бацька з газоўкаю.

– Кастусь! – Бацька, не выпускаючы з рукі лямпу, моцна абняў сына.

– Ну, добра, бацька, добра. Зойдзем у хату.

Як толькі Кастусь пераступіў парог, да яго падбегла заплаканая маці.

– Сыночак, я ўжо не верыла што ты жывы! – Маці нахіліла да сябе галаву Кастуся і некалькі разоў пацалавала.

– Ну, мама, годзе, а то зараз усю Волю падымем, – бадзёра прамовіў Кастусь. Пасля нядоўгага вітання бацька і сын уселіся за стол.

– Ну як вы тут? А дзе Сымон? – Кастусь агледзеў хату.

– Спіць унучак. Ой і дае ён нам жару! То ён тут, а праз хвіліну ўжо на бярэзіне каля дарогі. Ледзве паспяваем за ім, – з ласкавай усмешкай прамовіла маці.

– Пацярпіце, яшчэ трохі пацярпіце.

– Ды хіба ж мы не разумеем? Вайна ж ідзе, будзь яна праклятая! А ты як? – пацікавіўся бацька.

– Як і ўсе, ваюем.

Маці ў гэты час мітусілася каля печы, падаючы на стол усё, што было ў хаце.

– Ну, а што там чуваць, сыне, ці хутка вайна скончыцца?

Кастусь махнуў рукой, падхапіўся з месца і накіраваўся за печку, дзе на драўляным самаробным ложку спаў яго Сымон. Хлопчык быў падобны на анёлка: маленькі, прыгожы і такі любы. Кастусю захацелася схапіць яго, прыціснуць да сябе і цалаваць, цалаваць.

– Як гэта добра, што сярод ваеннага вэрхалу засталося яшчэ нешта чыстае, святое і такое дарагое!

У гэты самы час вельмі асцярожна ў пакой зайшоў бацька і, нічога не гаворачы, пацягнуў Кастуся за рукаў. Праз хвіліну яны ўжо сядзелі за сталом, на якім стаяла патэльня з яечняй, ляжаў пакроены хлеб.

– Ну, чаго ты яго будзіш, яшчэ нагледзішся, – бацька узяў бутэльку самагонкі і, нахіліўшыся праз стол, напоўніў сынаву чарку.

– От зараз павячэраем і спаць, а заўтра пагуляеш з сынам.

– Слухай, бацька, а немцы ў вас паяўляюцца? Бо я толькі прыехаў у пушчу, не ведаю, што тут адбываецца.

– Якія немцы, адны паліцаі штодзень тут ашываюцца, – апярэдзіўшы бацьку, сказала маці.

– От бачыш, сыне, не паспеў я прыкусіць пасля першай чаркі, як маці табе ўсё і далажыла, – з крывой усмешкай прамовіў бацька. Кастусь, адчуваючы, што ў бацькоў добры настрой, сам усміхнуўся, падняў чарку і са смакам выпіў.

– Бачыш, маці, сын п'е, не нюхаючы. Нават не моршчыцца.

– А навошта яе нюхаць, каўтануў яе, праклятую, дый канцы ў Шчару, – захмялела рагатнуў Кастусь.

– От я і мацеры так кожны дзень кажу, – усмешка не сходзіла з твару бацькі.

– Я табе дам кожны дзень! На сёння годзе, – маці забрала пляшку са стала.

– От так, Кастусь, і жыву, – бацька, перажоўваючы ўзятую з патэльні скварку, павярнуўся да вакна. І раптам падхапіўся з месца і імгненна патушыў газоўку.

– Хто там? – Кастусь кінуўся да свайго паліто, у кішэні якога ляжаў рэвальвер.

– Давай, сыне, я выйду пагляджу.

– Не, бацька, пачакай. – Кастусь узвёў курок рэвальвера і амаль навобмацак стаў выходзіць з хаты. Каля ганка не было нікога. Кастусь стаў услухоўвацца ў ноч. Пастаяўшы на адным месцы, ён асцярожна выйшаў на сярэдзіну падворка, потым прайшоў за хату і, аглядваючыся па баках, стаў павольна абыходзіць яе вакол. Усё было ціха, толькі дзе-нідзе брахалі валянскія сабакі.

“Пэўна, бацьку падалося,” – разважаў сам-насам Кастусь, вяртаючыся ў хату. І толькі ён пацягнуўся да клямкі, як на яго нехта цяжкі наваліўся, а чыясьці моцная рука выхапіла рэвальвер.

– Вяжы яго, Мікола!

– Сам вяжы, бачыш, ён круціцца, сука! – Кастусь зразумеў, што нападнікаў двое. Ён паспрабаваў рэзка павярнуцца, і ў гэты самы момант атрымаў страшны ўдар па галаве. Зямля пайшла кругам, ногі падкасіліся, і Кастусь павольна стаў апускацца ў нейкую глыбокую яму.

Апрытомнеўшы, Кастусь ніяк не мог зразумець, што вакол яго адбываецца і дзе ён знаходзіцца. Галава трашчала, нібыта рассохлы цэбар, рукі былі закручаныя назад, што не давала яму павярнуцца. Ён агледзеўся. Санкі, на якіх ён ляжаў, стаялі пасярод Волі, спераду каня мужчыны ў чорных шынялях і ў такога ж колеру шапках палілі саматужніцы і нешта заўзята абмяркоўвалі. І тут адзін з іх павярнуўся да Кастуся і, убачыўшы, што той ачуняў, з'едліва прамовіў:

– Ну што, камісар, адваяваўся? – Кастусь пазнаў чалавека, хоць і не мог прыпомніць яго імя. Паліцай быў родам з Залацева. Гэты твар ён памятаў яшчэ з тых часоў, калі вучыўся ў Дзярэчынскай школе.

– Краўцэвіч, для цябе вайна скончылася. Мы цябе тут трое сутак чакалі, ведалі, што ты сюды павінен завітаць. – Кастуся сказанае абсалютна не здзівіла. Палова мясцовых мужчын служыла ў паліцыі, а другая сядзела ў партызанах. На святы і тыя, і другія звычайна сядзелі за адным і тым жа сталом, наліваючы адзін аднаму гарэлку.

– Слухай, Краўцэвіч, а навошта старых Лупачоў узарвалі ды яшчэ і дзяцей разам?

Кастусь ад болю мала што зразумеў.

– Якіх дзяцей?

– Як гэта якіх? Сымонавых.

І тут у галаве Кастуся прасвятлела. Ён успомніў апошнюю размову з камадзірам разведчыкаў на падводзе Копаця...

Ад пачутага яму стала яшчэ горш. Калі ён наступным разам апрытомнеў, перад ім ужо разгортвалася жудасная карціна, якая назаўсёды перамяніла яго жыццё. Якраз перад санямі, на якіх ляжау Краўцэвіч, была выкапана вялізная яма, крышку наводдаль ад яе стаяла група нямецкім афіцэраў у чорнай і шэрай уніформе. На пагорку, крыху бліжэй да дарогі, што вяла на Сліжы, стаяў кулямёт, каля якога варушыліся два нямецкія салдаты. Каля невялічкіх бярэзін у атачэнні немцаў і паліцаяў натоўпіліся жыхары Волі разам з дзецьмі. Вочы Кастуся паспешліва лавілі

сярод аднавяскоўцаў сына і бацькоў. Ён, не зважаючы на свой боль, прыўзняў галаву. Дзе ж яны, дзе?

Старэйшы афіцэр крыкнуў нешта па-нямецку. У адзін момант салдаты і паліцыянты адлучылі трынаццаць чалавек ад натоўпу і пагналі да ямы. Як толькі няшчасныя параўняліся з ёй, прагучаў прыглушаны трэск кулямёта. Кастусь пачаў крычаць, але голас параненага і знясіленага чалавека быў ледзь чутны...

Сані плылі за канём, час ад часу пагойдваючыся на выбоінах і карэннях, што выпаўзалі з заснежанай пушчы на ўскраек лясной дарогі. На санях ехалі трое маладых людзей. Возны сядзеў наперадзе, упёршыся праваю нагою ў загнуты полаз. Двое ляжалі на саломе. Адзін з іх быў звязаны па руках і нагах, другі быў ледзь жывы – ён ляжаў, раскінуўшыся на ўсе сані.

– Тпру! – Той, што сядзеў з лейцамі, саскочыў з саней, павольна падышоў да звязанага і адным махам сцягнуў таго на снег. Пасля выцягнуў з-за халявы нож і разрэзаў путы, што сцягвалі палоннаму рукі і ногі. Вязень абыякава і нерухома ўглядаўся вызваліцелю ў твар.

– Знаеш, што я табе скажу, Краўцэвіч? Я не адношуся да тых залацееўскіх паліцаяў, якія цябе прадалі немцам. Ім усё адно, як грошы зарабляць. Я твае камуністычныя погляды не магу прыняць ні душой, ні сэрцам. Ад таго ты мне не проста вораг, а вораг прынцыповы, – на хвіліну Пяцюшык замаўчаў, – але мы з табой выраслі разам. Бацькі нашы і дзяды сябравалі ад веку. Таму, як сусед і хрысціянін, я цябе забіць не магу. А за тое, што ты дзяцей Лупачовых спаліў, Бог цябе асудзіць.

Словы Пяцюшыка вязня абсалютна не цікавілі. Перад яго вачыма паўставаў расстрэл бацькі, увушшу чуўся плач маленькага сына, галашэнні маці.

– Ну, ідзі! – Пяцюшык папіхнуў Краўцэвіча ў спіну. Той, нічога не гаворачы, павольна рушыў у лес. Яму было ўсё роўна, будзе страляць яму ў спіну Пяцюшык ці не. Гора яго было большае, чымсці магчымая страта самога жыцця.

Пяцюшык няспешна залез у сані, кінуў позірк на адыходзя-

чага ў лес Краўцэвіча і на ляжачага ў непрытомнасці Сымона, нахіліўся і ўзяў у рукі пугу.

– Но, пайшла! – кабыла ірванула з месца, і праз хвіліну сані зніклі на пушчанскай дарозе.

## Суд

– Дазвольце?

– Калі ласка.

– Вось, Яўген Аляксандравіч, справа Лупача. Вам прасілі перадаць.

– Добра, дзякуй. – Маладзенькая сакратарка паклала папку на стол перад суддзёй, ветліва ўсміхнулася і выйшла з кабінета. Ціхоня працаваў суддзёй Вярхоўнага суда ўжо даўно. З тых пор, як прайшоў школу ад следчага да суддзі абласнога суда ў Гародні. Потым былі некалькі гадоў работы ў партыйных органах, адкуль ён па рашэнні ЦК быў накіраваны ў Вярхоўны суд Беларусі. За тыя гады, што ён працаваў суддзёй у Менску, такіх вось спраў яму давялося разглядаць шмат, і прынятыя ім рашэнні заўсёды задавальнялі і ЦК, і кіраўніцтва Вярхоўнага суда, і шырокую грамадскасць. Можа, улічваючы гэта, яму і даверылі справу здрадніка і прыслужніка фашыстаў Лупача. А тут яшчэ ўлетку вялікае свята – саракагоддзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Ціхоні было ўжо за шэсцьдзесят, але ён трымаўся малойцам. Кожны ранак – прабежкі, мацыён з халоднай вадой, гімнастыка. Дома – гаспадарлівая жонка, дарослыя дзеці, ёсць лецішча, дзе ён бавіць час на выходныя. Спакойнае, перадпенсійнае жыццё. Суддзя павольна падняўся з-за стала, падышоў да прамерзлага вакна.

“Градусаў дваццаць будзе, не меней”, – падумаў ён. Пасярод заснежанай плошчы, уся ў агнях ды цацках, стаяла святочная навагодняя ёлка, а на ёй – чырвоная зорка і надпіс – 1984 год. Суддзя хвілін пяць глядзеў на яе неадрыўна. Але міжволі ў галаве ажыло мінулае жыццё: вайна, пасляваенныя галодныя гады...

“Гады, мае гады, ну, але пара да працы”. – Ён падышоў да стала, сеў у крэсла, выцягнуў з пацёртага футляра акуляры і раскрыў папку. Знаёмства з абставінамі справы зацягнулася аж да палудня. Усё з прачытанага для яго было, як быццам, зразумелым. Падсудны падчас акупацыі ўваходзіў у калабаранцкі ўрад Радаслава Астроўскага, потым служыў у немцаў, арганізаваў расстрэл вёскі Чорная Воля, а прыканцы вайны збег на Захад. Атрымліваўся поўны камплект злачынстваў, каб вынесці падсуднаму пакаранне. Ціхоня добра разумеў, што яно будзе абавязкова смяротным. Ён не шкадаваў такіх злачынцаў, бо надта ж добра памятаў вайну, а здраднікаў ды перабежчыкаў ён не любіў асабліва і лічыў іх шкаднейшымі за немцаў. Апошнія звычайна ніколі не хавалі, хто яны, а здраднікі – гэта каста самых вераломных ворагаў. Менавіта з-за такіх вось нелюдзяў гітлераўскія войскі дайшлі ў 41-ым да Масквы ды блакіравалі Ленінград.

Але чаму ён сам у Беларусь вярнуўся? Дзіўны нейкі... Ведаў жа, што яму тут каюк, а прыпёрся. Можа, служыў на якую-небудзь разведку? Ды не, кадэбэшнікі пішуць, што не выявілі аніякай сувязі яго з замежнымі гаспадарамі. Дый няблага жыў ён у той Амерыцы, абараніў дысертацыю, выкладаў ва ўніверсітэце, што яшчэ трэба чалавеку? Праўда, з сям’ёй нешта незразумелае – як быццам усе загінулі падчас вайны. А ў Амерыцы новай сям’і не было. Эх, доказаў малавата, дый сведак нямнога, дый тыя, праўду кажучы, сведчаць неяк няпэўна. Чулі нешта пра расстрэл вёскі, чыталі нешта пра забойцаў, але ўсё не тое, усё не канкрэтна. Пяцюшыка нейкага, які разам з Лупачом паліў Чорную Волю, у 44-м павесілі у Слоніме. Фон Хорст, гестапавец, збег недзе, ніхто не ведае, дзе яго шукаць. Пэўна, у Аргенціне з Эйхманам ды другімі забойцамі.

Ціхоня зноў падышоў да вакна. На вуліцы ўсё выглядала святочна, свяцілася ёлка, трашчаў мароз, усё, як мае быць на Новы год. Суддзя вярнуўся да стала і зноў пачаць гартаць дакументы.

А вось і рэальны сведка, ваяваў у партызанах, быў адказным партыйным работнікам, сам усё бачыў на свае вочы, нават сям’ю тады ў Чорнай Волі страціў. Але следчыя пішуць, што пасля таго расстрэлу ён з глузду з’ехаў, у манахі падаўся і цяпер жыве пад

Слонімам у Жыровіцкім манастыры.

Ну, з'ехаў з глузду ці не, а на суд павінен з'явіцца, раз заключэння дактароў пра яго нездавальняючы псіхічны стан няма.

– Яўген Аляксандравіч, вам полудзень у кабінет прынесці, ці самі пойдзеце ў сталовую? – перарваў разважанні Ціхоні мілы голас сакратаркі, які данёсся з перагаворніка.

– Не-не, я сам пайду.

У гэты самы момант зазваніў тэлефон. Суддзя падняў слухаўку.

– Прывітанне, Яўген Аляксандравіч.

– Прывітанне, таварыш старшыня.

– Справу Лупача прынеслі?

– Так.

– Што скажаш?

– Пакуль што ўсё зразумела. Праўда, сведкаў малавата.

– Ну, малавата ці не малавата, ты там не марудзь. Бо з ЦК тэлефануюць, цікавяцца. Бачыш, як добра ўсё атрымалася. Якраз на 40-ыя ўгодкі вызвалення Беларусі мы ворага асудзім. Знаеш, які выгодны прапагандысцкі крок атрымаецца. Так, ніводзін здраднік не ўцячэ ад гневу народнага.

– Яно, канешне, зразумела, пакараць трэба, але...

– Пачакай, я нешта не зразумеў, чым ты не задаволены?

– Я ж кажу, доказная база малаватая, і сведкаў усяго пара-тройка. Па праўдзе кажучы, варта справу гэтую на даследаванне вярнуць.

– Ты мне гэта пакінь, даю табе месяц, каб усё было зроблена. – На тым канцы провада прагучалі кароткія гудкі.

"Каб усё было зроблена... Вазьмі сам зрабі!" – Ціхоня паклаў слухаўку і запаліў цыгарэту. Вопыт падказваў старому суддзі, што ўсё ў дадзенай справе пойдзе не вельмі гладка. Ён пачаў разважаць. З ЦК прыйдуць, сваё кіраўніцтва будзе цiснуць, журналісты набягуць. Рашэнне па гэтай справе, як выглядае, прынятае. На халеру тады я патрэбен? Каб усё абставіў, як трэба. Так бы мовіць, прыдаў законнасць дадзенай справе. Не, пара на пенсію.

У сваім узросце Ціхоня ўжо баяўся не за тое, як да яго паставіцца кіраўніцтва ці ЦК, ён ужо пачынаў думаць пра вечнае. Шчыра кажучы, стары суддзя маліўся па начах, як некалі ў акопе перад атакай.

Так ці інакш – прызначым дату суда. Ціхоня паглядзеў у каляндар. Дваццаць пятага лютага: і святы адыдуць, і месяц скончыцца, пакуль суд пройдзе. Суддзя націснуў на кнопку перагаворніка.

– Слухаю вас, Яўген Аляксандравіч, – адазвалася сакратарка.

– Паслухай, Ганна, прызначым разгляд справы Лупача на 25-га.

– Добра, Яўген Аляксандравіч. Але вы не забудзьцеся, што на полудзень пара.

– Ага, дзякуй. – Ён і сапраўды забыўся пра полудзень. Выключыў перагаворнік, падняўся з крэсла і пачаў апранацца.

– Устаць, суд ідзе! – Па зале пракаціўся грукат ад адкінутых крэслаў. Суддзя звыкла акінуў прысутных поглядам. Народу было – як ніколі. На задніх крэслах сядзелі некалькі чалавек у чорных аднолькавых гарнітурах – як блізнюкі. Ціхоня беспамылкова пазнаў у іх супрацоўнікаў КДБ. Спераду важна сядзелі два чалавекі з чырвонымі, як піянерскія гальштукі, тварамі. Па асаблівасцях весці размову паміж сабой Ціхоня прылічыў іх да партыйнай наменклатуры. Астатняя ж публіка была ў асноўным звычайная: тут і вайскоўцы, і рабочыя ў танных балоневых куртках, і служачыя ў паліто ад "Камінтэрна".

"Масоўка як масоўка", – падумаў Ціхоня. З правага боку ад суддзі сядзеў пракурор Шуйман. Яго лысая круглая галава, як дубовы пень, моцна сядзела на карчакаватым і поўным целе. Па ўсіх судах Шуймана ведалі як кар'ерыста, для якога кар'ера – усё.

"А хто ж, калі не ён? – адзначыў сам сабе Ціхоня. – Тут табе і слава, і пасады, і медалі".

З левага боку ад лавы падсуднага сядзеў маладзенькі, крыху паўнаваты адвакат. Па яго велікаватым гарнітуры і новых чор-

ных штыблетах было відаць, што па судовых працэсах хлапец хадзіць пачаў зусім нядаўна. Бо ўсё адзенне сядзела на ім не вельмі. Ціхоня яшчэ раз акінуў прысутных поглядам. Пара.

– Падсудны, устаньце, – у атачэнні двух салдат унутранных войскаў, трымаючыся за агароджу, павольна падняўся пажылы чалавек. Судзя ўважліва агледзеў яго. Мужчына быў даволі высокі, хударлявы і сівавалосы, з прадаўгаватым маршчыністым тварам. Доўгія жылістыя рукі. Вочы – як патухлыя вугалькі. Стары, змучаны допытамі чалавек. "Ён жа амаль мой равеснік," – падумаў сам сабе суддзя.

– Пытанні, заўвагі.

– Не, – упэўнена прамовіў падсудны

– Тады сядайце.

Далей усё пайшло як звычайна на судовым пасяджэнні такога роду. Зачытвалі абвінавачванне, дапытвалі сведкаў, якія часам не ведалі, пра што ў іх так настойліва пытаюць. І цягнулася так аж да таго часу, пакуль сакратарка суда не запрасіла ў залу сведку Краўцэвіча Канстанціна. Пад перашэпт прысутных у судовы пакой павольна зайшоў крыху згорблены, сярэднягя росту чалавек у чорным манаскім строі. Доўгія сівыя валасы, як лён, слаліся па яго сутулай і нават крыху прыгорбленай спіне.

– Ваша прозвішча, імя і імя па бацьку? – спытаў Ціхоня.

– Брат Мікалай. У свеце – Краўцэвіч Канстанцін Уладзіміравіч.

– Калі ласка, пракурор.

Шуйман падняўся са свайго месца і голасна, на ўсю залу, звярнуўся да сведкі.

– Скажыце, калі ласка, Канстанцін Уладзіміравіч, вы ведаеце падсуднага? – Манах, не спяшаючыся, адказаў:

– Так.

– Як даўно?

– Гэта Сымон Лупач, мой сябар з дзяцінства.

– Вы сцвярджаеце, што гэта ваш былы сябар?

– Я не сказаў былы, я сказаў – сябар з дзяцінства, – спакойна і ўпэўнена паправіў пракурора манах.

“Пачынаецца,” – падумаў сам сабе Ціхоня. Шуйман працягнуў допыт сведкі.

– Давайце не будзем высвятляць, чый падсудны сябар ці вораг. Што вы можаце сказаць наконт разглядаемай у гэтым судзе справы?

– А што менавіта вас цікавіць?

– Ну, як што? Усё. Як спалілі Чорную Волю? Хто арганізатар, хто ўдзельнічаў у расстрэле мірных жыхароў вёскі?

– Вінаватых ведае толькі Збаўца, – зноў упэўнена прамовіў манах. Шуйман разгублена пачаў аглядаць залу, нібы чакаў ад кагосьці падказкі.

– Вы што, здзекуецеся з суда? – запытаўся пракурор.

– Пры чым тут ваш суд? Забойцаў чакае Суд Божы. – Пасля апошніх слоў манаха хваляванне Шуймана заўважыў не толькі Ціхоня, але і ўся зала.

– Нешта я вас не разумею, грамадзянін Краўцэвіч. У вас жа сям'я тады загінула, а вы арганізатара таго пабоішча называеццеце сябрам. Хіба ж гэта справядліва? – Апошнія словы пракурор амаль выкрыкнуў.

– А хіба яна ёсць на зямлі, чалавечая справядлівасць?

– А вы ведаеце, што за адмову ад дачы паказанняў вас самога можна прыцягнуць да адказнасці? – не стрымаўся Шуйман.

– Сорамна вам, малады чалавек, мяне палохаць. А самае галоўнае – бессэнсоўна, бо хутка мяне чакае Суд апошні. – І манах паказаў пальцам угору.

– Дык вы будзеце сведчыць па дадзенай справе ці не?

Манах няспешна павярнуў галаву ў бок падсуднага, потым акінуў паглядам прысутных і толькі тады звярнуўся да Шуймана:

– Не таго вы судзіце, грамадзянін пракурор. Не арганізоўваў Сымон таго расстрэлу. Дый Пяцюшыка павесілі ў Слоніме пасля вайны дарэмна, добры быў чалавек. Вось вы лічыце, што на

вайне ёсць правыя і няправыя. Па-вашаму выходзіць, што тыя правыя, хто перамаглі ў тым пабоішчы.

Тут ужо не змоўчаў і Ціхоня. А як жа яму было не ўмяшацца: пад сумніў паставілі самае святое для яго, самае дарагое – памяць пра вайну, пра таварышаў, якія загінулі.

– А вы што, лічыце інакш?

– Забойца і ёсць забойца, – працягваў манах. – І няважна, перамог ён на той вайне ці прайграў. Дый сама вайна ёсць зло, а з якога боку зло большае – з боку прайграўшых ці з боку пераможцаў – гэта ўжо няважна. – Тут сведка нечакана для ўсіх перахрысціўся. Зала загула. Ціхоня заўважыў, як нярвова пачалі перагаворвацца прадстаунікі ЦК. Але тут манаха перапыніў разгублены Шуйман:

– Калі ласка, абыдземся без прапаганды вашага цемрашальства. Дык ці быў падсудны падчас расстрэлу ў Чорнай Волі? І што ўвогуле вы ведаеце пра расстрэл вяскоўцаў? – Пасля сказанага Шуйман зрабіў паўзу, а затым іранічна дадаў. – Ведаеце, сведка, вам будзе цяжка жыць на гэтым свеце, калі вы не скажаце праўды.

Манах ніяк не зрэагаваў на сказанае пракурорам, толькі павярнуўся да яго і ўпэўнена прамовіў:

– Што такое жыццё? Гэта толькі хвілінка на бясконцым і нябачным гадзінніку вечнасці. А за свае грахі кожны з нас адкажа прыватна, і не на гэтым свеце, а перад Богам. А калі вы шукаеце адказнага за тое, што адбылося ў Чорнай Волі, то я вам усё пастараюся растлумачыць.

Зала ізноў загула.

– Падсудны Сымон Лупач не ўдзельнічаў у расстрэле Чорнай Волі і, тым больш, той расстрэл не арганізоўваў, – прамовіў манах.

– Што вы тут лухту несяце! – забыўшыся на судовыя правілы, крыкнуў пракурор.

– Я лухту не нясу, проста я, у адрозненне ад вас, там быў.

– Ну, тады скажыце, хто, па-вашаму, арганізаваў пабоішча ў Чорнай Волі? – запытаўся Ціхоня.

– Я, – спакойна адказаў манах.

У судовай зале пачалося нешта несусветнае: народ пачаў голасна абмярковаць паводзіны манаха, суддзі, пракурора. Больш нястрыманыя пачалі выкрыкваць з месца абвінавачванні ў адрас суда і сведкі. Наменклатуршчыкі, адчуўшы няладнае, палічылі за лепшае пакінуць залу. Кадэбэшнікі адкрыта пазначалі ў сваіх нататніках усіх, хто праяўляў асаблівую актыўнасць. Уціхаміраўшы залу, Шуйман удакладніў:

– Вы?!

– Так, я.

Ізноў усчаўся галас. Суддзя папрасіў залу супакоіцца. Прысутныя, як было прынята ў савецкія часы, адразу прыціхлі. Ціхоня, адчуваючы, што пракурор зусім разгубіўся, паспрабаваў узяць працэс у свае рукі.

– Вы разумееце, якое абвінавачванне бераце на сябе?

– Канешне.

– Ну, то раскажыце нам, што і як адбывалася ў Чорнай Волі?

Манах яшчэ раз уважліва агледзеў усіх прысутных і павольна, нібы чытаючы малітву, пачаў расказваць пра той страшны дзень 13 снежня 1943 года. Хто накіраваў разведчыкаў у Волю, хто з імі ехаў, за што партызаны спалілі сям'ю Лупача, як ноччу яго захапілі паліцыянты, як расстрэльвалі вяскоўцаў.

Амаль пасля кожнага сказа манах прыпыняўся і, трымаючыся за сэрца, аддыхваўся.

Калі ён скончыў прамову, прысутных у зале немагчыма было стрымаць. Адчуваючы, што з людзьмі будзе цяжка справіцца, Ціхоня падняўся і аб'явіў перапынак да наступнага дня. Зала, не стрымліваючы эмоцый, прадаўжала гамонку і абмеркаванне.

Калі Ціхоня адчыніў дзверы свайго кабінета, там ужо знаходзіліся два партыйныя наменклатуршчыкі, кадэбэшнікі і разгублены Шуйман.

– Дзе вы такога сведку знайшлі? – не чакаючы, пакуль дойдзе да свайго месца Ціхоня, спытаўся партыйны чыноўнік.

– Во ў каго трэба пытацца. – Ціхоня кіўнуў галавой у бок супрацоўнікаў КДБ. Тыя прадаўжалі, як ні ў чым не бывала, моўчкі сядзець, як быццам тое, што адбывалася ў кабінеце, іх зусім не цікавіла.

– Ну, а вы што? – Той самы наменклатуршчык звярнуўся да Шуймана. – ЦК на вас ускладвала такія надзеі.

Пракурор збянтэжана забегаў па кабінеце Ціхоні.

– Ды я проста не чакаў, не мог падумаць, што так можа атрымацца.

– Дарагі мой, калі вы не будзеце думаць, то за вас падумаем мы. Вам зразумела?

– Так, я ўсё зразумеў, заўтра я яго ў парашок, у пыл! – Рукі ў Шуймана трасліся, губы дрыжалі.

– Яшчэ раз для усіх прысутных тлумачым: заўтра абавязкова павінен быць вынесены прысуд.

– Які? – Трохі здзекліва запытаў Ціхоня. Адчуўшы тон суддзі, наменклатуршчык падышоў бліжэй, нахіліўся і амаль на вуха Ціхоні прашаптаў:

– Такі, які заслугоўвае здраднік, забойца і нямецкі прыслужнік. Вам зразумела, таварыш Ціхоня? – Суддзя моўчкі пацінуў плячыма.

– А вам, таварыш пракурор?

– Так-так, мне ўсё зразумела.

Партыйцы, не развітаўшыся, зніклі за дзвярыма. Кадэбэшнікі рушылі за імі. Ціхоня, седзячы ў сваім крэсле, моўчкі праводзіў позіркам адыходзячых. Як толькі за апошнім з іх зачыніліся дзверы, Шуйман разгублена замармытаў:

– Той поп хіба вар'ят?

– Манах, – удакладніў Ціхоня.

– Што?

– Не што, а хто? Вы сведку папом назвалі, а ён манах.

– Ды хрэн з ім.

– Не, не хрэн, шаноўны. Да працэса трэба рыхтавацца, дарагі мой, а то ўсё на халяву. Не ведаеце ні сведкаў, ні фактаў, а цяпер выкручвайся, як хочаш.

– Хто ж ведаў, Яўген Аляксандравіч, што такое здарыца, – вінавата прамовіў пракурор.

– Добра, на сёння хопіць, таварыш пракурор, хадзем па хатах.

– Ну хто мог ведаць, хто мог ведаць, – прыгаворваў Шуйман, у нейкай прастрацыі пакідаючы кабінет.

Ноч для Ціхоні была цяжкай. Ён не знаходзіў сабе месца ні пры сняданку, ні па дарозе на працу. За ўсю судовую практыку яму яшчэ ні разу не даводзілася разглядаць падобную справу. Ціхоня быў амаль упэўнены, што падсудны невінаваты.

Нібыта ўсё ў справе ёсць: і служба ў немцаў, і ўдзел у калабаранцкім урадзе, і праца ў пранямецкай моладзевай арганізацыі. Але забойстваў – няма! А ад яго, чалавека, які прайшоў вайну, ЦК чакае толькі смяротнага прысуду для здрадніка беларускага народа. Іншае рашэнне суда іх не задаволіць.

Ціхоня прадчуваў, як яго будуць ушчуваць за мяккацеласць цэкоўцы. Дый кіраўнік суда па галаве не пагладзіць, зноў пачнуцца намёкі на ўзрост ды пенсію. А можа, халера яе бяры, гэтую працу? І так ужо перапрацаваўся, досыць. Дый грэх браць на душу не хочацца. А пенсія, пашана, падарункі – няўжо за сорак год не заслужыў? Што я, дарэмна ўсё жыццё цягнуў гэтую няўдзячную лямку?

Ціхоня, як мог, шукаў якога-небудзь выйсця. Але нічога з яго разважанняў не атрымлівалася.

Можа, захварэць раптам ці наогул, адмовіцца ад працэсу? Падыду да старшыні, папрашу адпачынак па стане здароўя. Не, тады адразу на пенсію адправяць. Не разумею, навошта Лупач сюды вярнуўся? Сядзеў бы ў сваёй Амерыцы, і ўсім было б спакойна. У безвыходных разважаннях Ціхоня дайшоў да будынка суда.

– Яўген Аляксандравіч, праз пяць хвілін працэс пачынаецца, – нагадала сакратарка.

Ціхоня, як заўсёды перад працэсам, сабраўся, агледзеў пакой, каб нічога не забыць. Пасля чаго зачыніў дзверы на ключ і пакрочыў у судовую залу.

– Устаць, суд ідзе!

Ціхоня прайшоў да свайго месца і ўважліва агледзеў прысутных. У зале сабралася намнога меней народу, чымсьці ўчора.

"Відаць, кадэбэшнікі не спалі гэтай ноччу ў шапку", – падумаў Ціхоня. Падсудны, сведкі, пракурор, адвакат і ўсе астатнія былі на сваіх месцах. Акрамя прадстаўнікоў ЦК. Пэўна, з'явяцца перад зачытваннем прысуду.

Паседжанне распачалося. І адразу за справу ўзяўся Шуйман. З першых слоў пракурора адчувалася, што мінулую ноч ён не патраціў дарэмна. Аргументы-абвіначванні з вуснаў пракурора сыпаліся, як з мяха. І няважна, што факты не заўсёды адпавядалі рэчаіснасці. Самае галоўнае – іх было многа, і яны прыводзілі ў жах прысутных. Было выкарыстана ўсё, чаму навучылі пракурора ў партыйнай школе пасля юрыдычнага факультэта. Тут вам і кіно пра здзекі фашыстаў і іх памагатых, і цытаты з прац Маркса і Леніна, і цытаты з кнігі Брэжнева «Малая Зямля».

Пасля палымянага выступа Шуймана суд выслухаў няўпэўненую прамову маладога адваката. Нават не спрактыкаваныя ў такіх справах прысутныя добра разумелі, што выступ адваката такога калібру патрэбен арганізатарам працэсу толькі для праформы.

І вось апошняе слова даецца падсуднаму. Пажылы чалавек, прытрымліваючыся за поручань, павольна падняўся. Акінуўшы ўважлівым поглядам суддзю, пракурора і залу, ён загаварыў:

– Шаноўныя людзі! Усё жыццё я змагаўся за свае ідэалы і заўсёды лічыў, што гэта самае галоўнае. Але скажыце, ці вартае слёз дзіцяці хоць якая-небудзь, нават самая высокая ідэя? Жывучы ў Амерыцы, я на працягу многіх гадоў думаў, што можна забыць вайну, смерць блізкіх, пакуты аднавяскоўцаў. У Амерыцы мне здавалася, што пройдзе яшчэ год-два, і ўсё стане на свае

месцы. Прывіды вайны адступяць, забудзецца ўсё, што было. Але прайшоў год, прайшло многа гадоў, і нічога не забылася. Штоноч да мяне прыходзілі забітыя і спаленыя жонка з дачушкамі, мае расстраляныя землякі, яны гаманілі са мной, яны абмяркоўвалі мае надзённыя справы, яны проста жылі побач. Я адчуваў, што паціху вар'яцею. І таму я вярнуўся на радзіму. І толькі пабыўшы ў іх на магіле, дзе я маліўся некалькі дзён за супакаенне іх душ, яны перасталі мне з'яўляцца ў сне. І тыя дні, і тыя ночы, што я правёў у менскай турме, для мяне былі, напэўна, самыя шчаслівыя за многія гады. Вы пытаецеся, ці прызнаю я сябе вінаватым? Я адказваю – прызнаю. Так, прызнаю, бо свае ідэі і ідэалы я паставіў вышэй за жыццё дзяцей, жанчын, старых. Ніхто, аніводзін філосаф, аніводзін фюрэр, аніводзін правадыр не прыдумаў больш каштоўнай рэчы, чым падараванае Богам жыццё. Таму паўтараю – я прызнаю сябе вінаватым. У мяне ўсё.

– Суд сыходзіць для прыняцця рашэння.

Думкі ў галаве Ціхоні віжавалі, нібы чэрці ў пост. "Не прысуджу смяротнага пакарання – канец усяму. Прысуджу – як жыць буду?" Шлях да пакоя, дзе прымаліся рашэнні, быў для Ціхоні як шлях на Галгофу.

Калі Ціхоня зайшоў у кабінет, там, парушаючы ўсе працэсуальныя нормы, ужо знаходзіліся тыя самыя прадстаўнікі ЦК.

– Таварыш Ціхоня, калі вы не ўпэўненыя наконт прысуду, дык гэта лішняе, – паважна прамовіў цэкоўскі чыноўнік, які ўчора лаяў кадэбэшнікаў і Шуймана. – Рашэнне прынятае. У ЦК. Вось, – ён працягнуў суддзі папку, на якой красаваўся герб БССР. Ціхоня раскрыў папку, у ёй ляжаў толькі адзін аркуш. Смяротнае пакаранне.

"Калі яны прынялі рашэнне, я ім патрэбны толькі дзеля прыкрыцця." Ціхоню на хвілінку стала брыдка за сваю слабасць, але прадчуванне, што ўсё застанецца ў яго жыцці па-ранейшаму, прынесла супакой. "Што ж, яны ўсё роўна прымуць рашэнне, якое ім трэба. Што з таго, што я думаю інакш? Хай так і будзе, не я ж прыняў рашэнне, а зачытаць прыгавор – не выносіць яго." Недзе глыбока ў душы штосьці яго ўсё ж вярэдзіла. Але суддзя не даваў таму вераду

падняцца на паверхню. Прыемнае адчуванне, што ўсё застанецца, як і раней, было мацней і за праўду, і за сумленне...

## Эпілог

Пасля заканчэння суду радыё "Свабода" яшчэ не адзін раз пачынала свой эфір расказам пра Лупачоў працэс. Ад таго адбыліся кадравыя перамены ў КДБ і Вярхоўным судзе Беларусі. Асуджаны нядоўга чакаў выканання прысуду. Неўзабаве на гарадскіх кладах з'явілася невядомая магілка – без помніка, без імя.

Манах памёр адразу пасля працэсу, не даехаўшы колькі кіламетраў да сваіх Жыровічаў.

Суддзя Ціхоня як ні стараўся служыць, папрацаваў нядоўга. Неўзабаве яго з гонарам адправілі на заслужаную пенсію. Шуйман, як і раней, шпарка ішоў угору па службовай лесвіцы.

Магчыма табе, мой паважаны чатач, калі-небудзь давядзецца пабываць на беразе Шчары ў Ліпічанскай пушчы. Там, дзе была спаленая вёска Чорная Воля. Абавязкова знайдзі месца, дзе на высокім пясчаным узгорку стаіць шэры савецкі абеліск, пад якім – 354 ахвяры. Пастой там, калі ласка, і памаліся, каб душы іхнія знайшлі на тым свеце супакой.

Кажуць, што вандроўнікі, якія едуць па шашы Менск-Зэльва, не вельмі хочуць прыпыняцца тут нанач. Бо як толькі сцямнее, з пушчы даносіцца немы крык: Чорная Воля-я! Чорная Воля-я!..

# МЫ НАШ, МЫ НОВЫ...

*...І сказаў Яму д'ябал: табе дам уладу над усімі гэтымі царствамі і славу іх, бо яна аддадзена мне, і я, каму хачу, даю яе; і вось, калі Ты паклонішся мне, дык усё будзе Тваё.*

*Ісус сказаў яму ў адказ: адыдзі ад Мяне, сатана; напісана: "Госпаду Богу пакланяйся і Яму аднаму служы".*

*Паводле Лукаша Святое Дабравесце,*
*раздзел 4:6-8*

## "Мы – сіла"

Паўлюшэнка пацягнуў святара за доўгія сівыя валасы і нагой з усяго маху выцяў яго па твары. Пажылы святар застагнаў.

– Не-не, пастой, гэта яшчэ не ўсё, – злосна прабурчаў Сіўкоў, чыркнуўшы некалькі разоў запалкам.

– Бл...ць, прамоклі дарэшты, – адкінуўшы разлезлую каробку ўбок, Сіўкоў звярнуўся да Шэхмана:

– Дай сваіх, бачыш – мае не гараць.

Камсамолец, што ішоў паперадзе і цягнуў бацюшку за рукі, на хвіліну прыпыніўся і палез у кішэнь. Збіты чалавек, адчуўшы хвілінную палёгку, ціха застагнаў. Але і стагнаць яму было цяжка, бо за некалькі гадзін катаванняў яго немаладое цела ператварылася ў крывавае месіва.

– Э-э, харош там марудзіць, бачыш – ён ужо ажывае, – уладна прамовіў Луковіч. Камсамольцы замітусіліся. Праз хвіліну Шэхман працягнуў запалкі Сіўкову.

– Ну што, поп, зараз мы цябе паголім. – Шэхман нахіліўся, чыркнуў запалкам і паднёс агеньчык да барады збітага. Залітыя крывёй валасы не хацелі гарэць. Сіўкоў адну за адной нярвова адкідваў убок згарэлыя запалкі. Няўдалыя спробы запаліць бараду бацюшку яшчэ болей злавалі падпальшчыка, і ён урэшце плюнуў на карабок і кінуў яго ў твар ахвяры.

– Бачыш поп, з-за тваёй юшкі ніяк не магу распаліць

вогнішча. – Ячэйка ў поўным складзе з'едліва і гучна зарагатала. Святар сабраў усе свае сілы і ледзь чутна прашаптаў:

– Даруй ім, Госпадзе, не ведаюць, што вытвараюць.

– Даруй-падаруй, – перакрыўляючы бацюшку, здзекліва прамовіў Луковіч. – Пасля павярнуўся да сваіх хаўруснікаў і моцна зарагатаў. Камсамольцы падтрымалі свайго сакратара, і ўжо праз хвіліну іх трэсла ад рогату.

– Бачыш, поп, бяссільны твой Бог. Нічога ён з намі зрабіць не можа, і знаеш чаму? Таму, што мы сіла, за намі партыя, за намі Сталін і ўвесь Савецкі Саюз. А за табой хто? Папяровы ідал у драўлянай рамцы, – нібы на камсамольскім сходзе, упэўнена заявіў Луковіч. Потым махнуў рукой сваім падначаленым, і працэсія працягнула рух. Грузнае цела збітага пажылога чалавека было цяжка валачы па расхляпанай восеньскай дарозе. Чым болей камсамольцы стамляліся, тым даўжэй білі яны на прывалах сваю ахвяру. Нарэшце працэсія выйшла на самае высокае месца ў наваколлі. Менавіта тут, на ўзвышшы, рос стары, разгалісты дуб, каля якога жыхары навакольных вёсак святкавалі Купалле.

– У-ух, ну нарэшце дайшлі. Бачыш, поп, якую мы табе званіцу выбралі. Зараз туды цябе падсадзім, а там і да бога твайго недалёка, – здзекліва прамовіў сакратар. Бацюшка расплюшчыў акрываўленыя павекі. Перад ім стаяў стары дуб. На залітым крывёю твары святара з'явілася ўсмешка.

– Вы паглядзіце на яго, ён жа з нас збыткуе, – прашамкаў збянтэжаны Луковіч і садануў кулаком па ацёкшым твары. Удар сакратара паслужыў сігналам астатнім камсамольцам, і яны, як ваўкі, накінуліся на паміраючага чалавека. Бацюшка ўжо ніяк не рэагаваў на ўдары і толькі ўсё цішэй і цішэй гаварыў:

– Госпадзе, даруй, Госпадзе, даруй...

Тры дні вісела на дубе цела святара. І тры дні ішоў бясконцы восеньскі дождж, нібы абмываючы цела закатаванага. Мясцовыя сабакі і днём, і ноччу вылі па наваколлі. Але ім, у адрозненне ад людзей, мясцовыя камсамольцы нічога не маглі зрабіць.

Праз тры дні цела бацюшкі некуды знікла. І колькі Луковіч і яго хаўруснікі ні шукалі, хто зняў нябожчыка з шыбеніцы, так нікога і не знайшлі.

А стары дуб неўзабаве засох. Перад самым пачаткам вайны ўначы ў яго трапіла маланка, і ён згарэў дарэшты.

## Кат

Паўлюшэнку калаціла пасля ўчарашняга, як ад лютага марозу. Падняць руку ці нагу каштавала няшчаснаму шмат поту і слёз. Таму перасоўваўся ён па хаце павольна і асцярожна, як стары нямоглы чалавек. А было яму не болей дваццаці пяці гадоў. З той пары, калі Паўлюшэнка разам з другімі камсамольцамі мясцовай ячэйкі закатаваў вясковага бацюшку, ён перастаў спакойна спаць. Для таго, каб хоць як-небудзь заснуць, гаспадар хаціны напіваўся кожны вечар да непрытомнасці. Два месяцы таму жонка Паўлюшэнкі нарадзіла дзіця. Дзяўчынка з'явілася на свет кволай і пражыла на божым свеце ўсяго некалькі дзён. Жонка ад гора кранулася розумам у той жа дзень, як памерла дзіця. Яе забралі у Наваградскую больніцу, дзе за тыдзень няшчасная згарэла ад невядомай хваробы.

– Дзе ж пахмяліцца? – думкі, нібыта надаедлівыя мухі, мітусіліся ў цяжкай галаве небаракі. Дрыжачымі рукамі ён падняў з падлогі пажоўклы ад сліны акурак і запаліў. Па хаце пацягнуўся шэры смуродлівы дым. Гаспадар раз за разам саладка зацягваўся.

– От, бляха, – акурак апёк губу, і камсамолец выплюнуў яго на непадмецены ток. Злосна вылаяўшыся, ён сплюнуў сабе пад ногі і, асцярожна апёршыся на край засмечанага стала, вызірнуў у вакно.

– Та-ак, у сельсавеце ўжо хтосьці ёсць. – Ледзь жывы, чалавек павольна падняўся, дрыжачымі рукамі накінуў на плечы андарак і выпаўз з хаты.

– Луковіч у сябе? – спытаўся Паўлюшэнка ў стаячага на ганку Шэхмана і, не чакаючы адказу, зайшоў у сельсавет.

– Гарэлка ёсць? – спытаўся ад парога і ўзяўся метадычна абшукваць шафы і шкапчыкі, якія знаходзіліся ў кабінеце.

– Ты што, зусім здурнеў!? – уладна выкрыкнуў, падняўшыся са свайго месца, старшыня сельсавета.

– Пайшоў ты нах..! – не звяртаючы ўвагі на ўсхваляванага старшыню, прамовіў Паўлюшэнка і працягнуў пошукі.

– О-о! – З ніжняй шуфляды шафы для адзення камсамолец выцягнуў «польскі літар», напалову запоўнены мутнай вадкасцю. Ён дастаў корак і дрыжачымі рукамі нахіліў пасудзіну сабе ў рот. Выдыхнуў паветра і яшчэ раз прылажыўся, смакуючы.

– Ты што робіш, паскудзіна!? – Але Паўлюшэнка ніяк не рэагаваў на лямант Луковіча. Старшыня рэзка падняўся і ў два крокі падскочыў да п'ітака. Пасля непрацяглага змагання «польскі літар» быў ужо ў старшыні.

– Хопіць! Згарыш ад гэтай гарэлкі, калі піць не кінеш

– Ніколі.

– На лекаванне цябе адправім.

– А мне хоць куды, я ўжо ні спаць, ні есці не магу.

– Ну дык піць кінь, ты ж камсамолец.

– Знаеш, сакратар, як толькі кідаю піць, прывіды да мяне прыходзяць: жонка, дзіця. Людзі кажуць, каб у царкву схадзіў ды паніхіду за іх замовіў. Але не магу я туды ісці...

– Ты цемрашальства сваё кінь. Якая яшчэ царква? Гэта ўсё ад гарэлкі, усе твае прывіды. – Луковіч паставіў на стол, за якім толькі што сядзеў, посуд з гарэлкаю і падышоў да Паўлюшэнкі.

– Пакінь піць, выйдзі на працу, і ўсё будзе добра. – Старшыня па-сяброўскі абняў Паўлюшэнку за плечы.

– Дай яшчэ глытнуць, хоць раз!

– Не дам, пайшоў адсюль! – Старшыня адпіхнуў п'янага на некалькі крокаў ад сябе. Не хочучы зноў ісці на абвастрэнне, Паўлюшэнка павольна выйшаў з будынку сельсавета і, ледзь перастаўляючы ногі, павольна павалокся да сваёй хаты.

Ён прачнуўся ноччу мокры, як хрушч. Цела калацілася яшчэ мацней, чым звычайна.

– Тата, тата! – Паўлюшэнка павярнуў галаву і ўбачыў каля печы немаўля, якое цягнула да яго рукі. Ён падняўся, павольна падышоў да дзіцяці і паспрабаваў яго абняць. Але на тым месцы ўжо нікога не было. Нічога не разумеючы, чалавек аглядзеўся навокал.

– Дзе ты? – І тут ён раптам заўважыў на сваім ложку нябожчыцу-жонку і тое самае дзіця. Ён амаль нячутна падкраўся да ложка і, каб не спалохаць іх, ціхенька прылёг побач. Яму стала добра і лёгка. Каханая жонка была побач, тут жа яго дзіцятка, жывенькае і здаровенькае...

Луковіч сядзеў за сталом і перабіраў партыйныя паперы.

– Таварыш старшыня! – ён падняў галаву ад стала і паглядзеў на дзверы, адкуль даносіўся крык. У памяшканне ўбег запыханы Сіўкоў.

– Цішэй, цішэй, – прамовіў упэўнены ў сваіх сілах старшыня сельсавета. Сіўкоў адсопся і нярвова крыкнуў:

– Паўлюшэнка павесіўся!

Луковіч ускочыў з месца:

– Што?!

– Паўлюшэнка павесіўся ўдома.

– Як, не можа быць! – разгубіўся Луковіч.

– Перакінуў вяроўку праз бэльку, і ўсё, – разгублена прамовіў Сіўкоў. Абодва замоўклі.

Праз дзень на мясцовых могілках з'явіўся драўляны помнік з чырвонай зоркай. Прастаяў ён нядоўга. Падчас вайны хцівыя землякі Паўлюшэнкі сцягнулі абы як збітую тумбу сабе на дровы. І ўжо праз некалькі гадоў нават самыя блізкія сваякі нябожчыка не маглі паказаць, дзе быў пахаваны былы камсамолец...

## Юда

Падвода павольна перавальвалася праз камяні пыльнай селавой дарогі. Сіўкоў сядзеў у драбінах і жаваў свежы хлеб, які перад ад'ездам схапіў са стала. Да Наваградка яшчэ было далёка, таму паразважаць наконт жыцця час у Сіўкова быў.

У паліцыі служыць можна, і плацяць добра, і харч неблагі даюць, а галоўнае – увесь час нешта перападае. Тут Сіўкоў стаў успамінаць, колькі ён сканфіскаваў маёмасці ў габрэяў ды ўсіх астатніх з тых пор, як стаў памочнікам начальніка мясцовай паліцыі. У траўні зганялі габрэяў у гета, а золата і срэбра цішком забіралі сабе. Расстралялі на тым тыдні савецкіх ваеннапалонных, ад іх засталіся шынялі і папругі. У мясцовых бальшавікоў... Пасля згадкі пра апошніх Сіўкову стала нейк не па сабе. Па-першае, ён сам да вайны ўваходзіў у мясцовую камсамольскую ячэйку. Па-другое, узяць у тых галадранцаў ды п'яніцаў не было чаго.

От і добра, што я ад іх уцёк. Хіба ж мне, гаспадарліваму, месца каля той басоты? А служба ў паліцыі – зусім іншая справа. Тут табе і грошы, і улада, і павага. А галоўнае – сканфіскаванага і дзецям хопіць. А яны ў мяне такія харошыя – старэйшая дзяўчынка і малодшы хлопчык. Ён на хвіліну ўявіў, як будзе важна жыць пры немцах пасля вайны. Сіўкоў выпадкова зірнуў на гадзіннік, які зняў летась з расстралянага палітрука.

Хутка палудзень, трэба спяшацца. Пад вечар маецца быць экзекуцыя ў адной з мясцовых вёсак. А як жа без мяне, можа, і там штосьці перападзе. Но-о, но-о, каб цябе халера!

Паліцай з усяе сілы сцебануў кабылу пугай. Тая ад болю і страху ірванула з месца, як апараная. Акаваныя колы падводы залескаталі па дарожных камянях, нібы танкавыя гусеніцы.

Паўдня прамарудзіўшы, Сіўкоў выйшаў з будынка камендатуры і акінуў поглядам наваколле. Цёплы летні вечар надыходзіў няўмольна. Паліцай спрытна залез на падводу і па-гаспадарску ўсеўся на загадзя падрыхтаванае месца.

– Но-о, пайшла! – Кабыла спалохана ірванула з месца з усіх чатырох...

Да роднай вёскі заставалася толькі адолець горку і мінуць пералесак. У гэты самы момант Сіўкоў заўважыў, як з-за лесу вырастае вялізны клуб дыму.

Паліцай падганяў кабылу і неадрыўна ўзіраўся ў той бок. Трывога ў душы нарастала. Не чакаючы, калі падвода ўзбярэцца на пагорак, Сіўкоў, прытрымліваючыся за драбіны, падняўся на ногі. Убачанае ўразіла Сіўкова. Родная вёска гарэла ўся – ад пачатку да канца.

– Тваю маць... паляць вёску! А мая хата!? – Сіўкоў стараўся разгледзець сярод дыму свой падворак, але гэта яму не ўдавалася. Спалоханая кабыла ляцела з горкі, пагражаючы растрэсці падводу. Праз хвіліну-другую колы залескацелі па абнятай з абодвух бакоў вясковай вуліцы. Сіўкоў прыгледзеўся.

– Сукі, а маю хату навошта, я ж свой! – Пад'язджаючы да свайго, таксама ахопленага полымем жытла, ён на хаду саскочыў з падводы. Хата палала, як сухое кастрышча. Паліцай з мацюкамі бегаў вакол і спрабаваў хоць штосьці ўратаваць. У агні гінула ўсё, што было дарага яму: грошы, рэчы. І тут ён раптам спахапіўся. А жонка, дзеці, дзе яны?! Сіўкоў прыслухаўся. Дзесьці здалёк даносіліся крыкі.

Няўжо ў старой Каўшовай кузні паляць? Сіўкоў імгненна ўскочыў на падводу.

– Но пайшла, но! – Перапалоханая кабыла ірванула з месца. Ужо праз некалькі хвілін падвода прыімчала пад кузню.

– Што ж вы робіце?! Што ж вы робіце?! – залямантаваў ашалелы Сіўкоў. Салдаты з Вафэн СС у чорнай форме з аўтаматамі наўзгатоўку шчыльнымі шыхтамі стаялі вакол палаючай кузні і ніяк не рэагавалі на крыкі паліцая.

– Што ж вы робіце, панове, там жа мае дзеці! – Сіўкоў, як сабака, бегаў, круціўся каля карнікаў. І калі ён у бездапаможнасці і разгубленасці на хвіліну спыніўся, то пачуў сярод іншых крыкаў галасы сваіх дзяцей.

– Татка, ратуй нас, татка! – Сіўкоў хацеў кінуцца ў вогнішча, але агонь, як люты звер, адагнаў яго. Паліцай у роспачы ўпаў на зямлю і жудасна заенчыў.

За гадзіну кузня дагарэла. За некалькі крокаў ад дагараючых галавешак, адкінуўшы ўбок правую руку з рэвальверам, ляжала грузнае цела ў паліцэйскай уніформе. Са скроні на апаленую зямлю сцякала рудая цягучая кроў...

## Фарысей

Падлога ў перапоўненнай камеры была халоднай і вільготнай. Шэхман сабраў усе свае сілы і павярнуўся са спіны, на якой ляжаў доўгі час, на правы бок. Боль быў невыносны. За тыдзень бесперапынных допытаў сіл у вязня амаль не засталося. Ён ляжаў на халоднай турэмнай падлозе і думаў толькі аб адным – за што яму такія пакуты? Абвінавачванні, якія прад'яўлялі следчыя, здаваліся яму абсурднымі.

Адкуль яны ўзялі, што я працаваў на польскую выведку? Гэта ж абсалютная лухта. А больш за ўсё Шэхману было прыкра за тое, што ён да акупацыі Заходняй Беларусі восенню 1939-га верай і праўдай служыў НКВД, збіраючы інфармацыю пра польскія вайсковыя часці, размешчаныя на Наваградчыне, пра людзей, што спачувалі палякам.

Тут, у менскай турме, ён штоноч пракручваў у галаве сваё датурэмнае жыццё.

Правільна ці не ён жыў, ці тым ідэям служыў? Як быццам, Шэхману не было за што сябе дакараць. Абсалютна нармальнае жыццё рэвалюцыянера. Усё, як пісалі ў савецкіх кнігах. Пасля кожнага ўспаміну ў галаве ізноў паўставала адно і тое ж пытанне.

За што? Ён жа самааддана служыў рэвалюцыі. Але адказ на гэтае галоўнае пытанне ніяк не знаходзіўся. Мінулай ноччу Шэхман зразумеў, што новых допытаў не вытрымае і прызнае любую лухту, якую яму падсуне следчы. А там хай будзе што будзе.

Праз закратаванае турэмнае акенца ў камеру прабіваўся кволы сонечны праменьчык. Але надыход новага дня вязня зусім не радаваў.

Ізноў допыты, ізноў пабоі. Гары яно ўсё гарам – сёння прызнаю ўсе іх абвінавачванні. А можа, пасля прызнання сапраўды

адпусцяць, як абяцалі? Хай прыйдзецца ілжасведчыць, я дам паказанні на ўсіх, на каго скажа следчы. Не мне ж аднаму пакутаваць, хай і яны паспрабуюць турэмнага жыцця...

Не, няможна так! Мяне абылгалі, і я буду тое самае рабіць? Не, я хлусіць не буду, трэба цярпець, цярпець. Яны ж павінны разабрацца. Прыйдзе пара, яны яшчэ будуць прасіць у мяне прабачэння за тое, што са мной рабілі ў турме.

Час ад часу дзверы ў камеру адчыняліся, і ахоўнікі выклікалі на допыт іншых вязняў. Шэхман нярвова прыслухоўваўся да бразгату засавак. І кожны раз яму здавалася, што прыйшлі за ім. Нарэшце:

– Шэхман, на выхад.

Былы камсамолец, апіраючыся на сцяну, павольна падняўся і, накульгваючы, накіраваўся да дзвярэй. Мясцовую турму ён ужо ведаў добра і мог лёгка арыентавацца на калідорах. Праз нядоўгі час хадзьбы ахоўнік адчыніў знаёмы кабінет. Следчы сядзеў за сталом, уважліва ўзіраючыся на зайшоўшага ў пакой Шэхмана, і паліў.

– Сядайце, – спакойна прамовіў ён і паказаў рукой на табурэтку, што стаяла пасярод кабінета. Шэхман сеў.

– Ну што, яшчэ доўга будзем уводзіць у зман следства? – суха і злосна спытаўся гаспадар кабінета.

– Я, таварыш следчы, не ведаю, што вы ад мяне хочаце. Гэта нейкая страшэнная памылка.

– Колькі я вам буду казаць – я вам не таварыш, а грамадзянін.

– Так-так, грамадзянін начальнік, – спахапіўся Шэхман.

– Дык якая памылка, вы гэтае пісьмо чыталі?

– Чытаў. І ўсё ж паўтару, гэта памылка ці нейчы злосны паклёп.

Пасля гэтых слоў Шэхмана следчы падняўся і падышоў да арыштанта. Былы камсамолец падумаў, што ўсё пачынаецца па-новаму: пабоі, здзекі. Але следчы гэтым разам паводзіў сябе стрымана і спакойна.

– Скажыце, калі ласка, Шэхман, у вас ёсць сям'я?

– Ёсць.

Следчы нахіліўся і ў самае вуха прашаптаў:

– Жонка і дзве дачкі. Адной чытыры гады, другой два. Я правільна гавару?

– Так. А нашто вам мая сям'я? – Шэхман трывожна заглянуў у вочы маладому энкавэдэшніку. Той нахмурыўся і ціха прамовіў:

– Шэхман, я вельмі многа страціў з вамі часу. Калі мы цяпер не зможам дамовіцца, я буду вымушаны пагаварыць з вашай сям'ёю. Улічваючы небяспеку, якую вы прадстаўляеце для савецкай дзяржавы, і абставіны, якія склаліся ў пачатку лета 41-га, маё кіраўніцтва пойдзе следству насустрач.

Сілы канчаткова пакінулі Шэхмана. Пасля нядоўгіх разважанняў ён сказаў:

– Добра, пішыце што вам трэба, я ўсё падпішу.

Неўзабаве адбыўся паказальны суд. Шэхмана за супрацоўніцтва з дэфензівай і польскім урадам прыгаварылі да смяротнага пакарання. А ягоную сям'ю, якую ён так хацеў зберагчы, рэпрэсавалі. Жонка і дочкі згінулі бясследна дзесьці ў Гулагу.

## Пракуратар

Ужо трэція суткі Луковіч не ўставаў з ложка. Інсульт ператварыў яго ў бездапаможную істоту. Ён ляжаў нерухома, не могучы ні паварушыцца, ні штосьці прамовіць, прытым свядомасць не пакінула яго. Луковіч глядзеў на сваё пачужэлае цела як быццам збоку. І гэта было нясцерпна. Ён думаў толькі аб адным – каб хутчэй памерці. Але нейкая невядомая сіла трымала і трымала яго на гэтым свеце.

Апошняй ноччу да яго ў пакой забег здаравенны аблезлы пацук, заскочыў на грудзі хвораму і ўважліва паглядзеў Луковічу ў вочы. Потым узяўся грызці яго вушы і губы. Луковіч у страшным болі адчуваў, што яго ядуць жыўцом. Пад ранак, насыціўшыся, пацук не спяшаючыся злез з цела і знік у цёмным падпечніку.

За час вымушанай лежні стары камуніст аднавіў у думках усё сваё жыццё. З тых самых часоў, як ён у гэтай жа хаціне праводзіў першы камсамольскі сход. Як у вайну камандаваў партызанскім атрадам на Наваградчыне. Як пасля вайны бязлітасна змагаўся з мясцовымі “бульбоўцамі” і краёўцамі. Усё ўспомніў.

Розум ніяк не мог пагадзіцца з тым, што адбывалася з ім і ў свеце. Ужо мінула пяць гадоў, як развалілася дзяржава, якой ён служыў усё сваё жыццё. Камуністычныя ідэі, якія ён лічыў адзіна правільнымі, цяпер абуджалі ў людзях непрыкрытую пагарду і страх. З тых пор, як яго, нямоглага, старога чалавека, маладая жонка перавезла з прасторнай менскай кватэры ў гэтую збуцвелую вясковую хату, ён думаў толькі пра адно – каб хутчэй камуністы вярнуліся да ўлады. У тым, што вернуцца, Луковіч не сумняваўся. Але час ішоў, а нічога не мянялася. Разрастаўся капіталізм, варожая заходняя культура не сыходзіла з экранаў тэлевізараў. А некалькі дзён таму здарылася самае страшнае. У мясцовай царкве, якую ён зачыніў яшчэ да вайны, загучаў звон, які заклікаў мясцовы люд адзначыць прышэсце Вялікадня. І гэта для Луковіча было невыносна. Ён нерухома ляжаў на смяротнай лажніцы і прасіў толькі смерці. Але тая ўсё не прыходзіла і не прыходзіла...

Бацюшка асвячаў хаты вяскоўцаў пасля Вялікадня ўжо трэці год запар. З тых самых пор, калі ён прыехаў сюды пасля заканчэння семінарыі і разам з вяскоўцамі вычысціў і адрамантаваў царкву, якая не працавала тут яшчэ з даваеннага часу.

Бацюшка з усёй працэсіяй прыпыніўся насупраць хаты Луковіча.

– Давайце зойдзем. Суседзі кажуць, што ён не выходзіць на вуліцу ўжо некалькі дзён.

Жанчыны з царкоўнага хору наперабой пачалі адгаворваць бацюшку. Маўляў, той камуніст-атэіст зусім выжыў з розуму.

– Не, гэтак няможна. Мы мусім зайсці. Можа, чалавеку патрэбная наша дапамога.

Жанчыны паслухмяна пайшлі следам за бацюшкам у хату Луковіча. Смуродны пах з хаты ледзь не збіў іх з ног. Бацюшка прыкрыўся даланёй і акінуў поглядам запушчаную хаціну. На старой гарбатай ка-

напе ляжаў з адплюшчанымі вачыма сівы, з акрываўленымі губамі і вушамі, чалавек. Жанчыны завойкалі і пералагналіся. Бацюшка агледзеў Луковіча, а затым звярнуўся да жанчын:

– Бяжыце да суседзяў і выклічце па тэлефоне доктара.

Пеўчыя нібы гэтага і чакалі і ўсе да адной кінуліся да дзвярэй. Бацюшка яшчэ раз агледзеў хату, пералагнаў хворага і прысеў побач. Дастаў з сумкі свечку і Біблію і звярнуўся да паміраючага:

– Калі вы чуеце, што я гавару вам, то падайце знак. Луковіч сабраўся з сіламі і варухнуў рукой. Бацюшка запаліў свечку і разгарнуў Біблію.

– Я вас пасабарую.

Луковіч ізноў даў знак бацюшку, што ён яго чуе.

– Госпадзе, памілуй, Госпадзе, памілуй. – загучала распеўная малітва...

Што ў гэты час тварылася ў душы старога камуніста – невядома. Можа, ён перажываў і каяўся за тое, што натварыў на божым свеце? Пасля малітвы і сабаравання па твары Луковіча пацяклі вялікія, як боб, слёзы. Праз некаторы час вочы хворага заплюшчыліся, і ён адышоў. Пад'ехаўшая неўзабаве хуткая канстатавала смерць. Улічваючы, што ад нябожчыка яшчэ раней адмовіліся сваякі, бацюшка прыватна займаўся пахаваньнем. На мясцовых кладах з'явілася магілка з драўляным, пафарбаваным у чырвоны колер, праваслаўным крыжам...

На гары, дзе ў 1939 годзе камсамольцы закатавалі святара, нехта штогод высаджваў некалькі маладых дубкоў. За дзесяцігоддзі там вырасла ніштаватая дуброва. Штогод на Вялікдзень мясцовыя людзі ішлі на гару і запальвалі безліч свечак. А ў дзевяностыя гады на месцы дуба, на якім камсамольцы павесілі святара, быў пастаўлены высокі крыж. Ён узвышаўся над маладымі дубамі, быццам аглядаў усё наваколле. Кажуць, у дзевяностыя, калі на постсавецкай прасторы паўсюль расла злачыннасць, у гэтых мясцінах было спакойна і ціха...

# БАЦЬКА

Такой дарогі, як ад Дзятлава да Галубоў, на гэтым свеце пэўна што і няма. Часткова адсыпаная ўжо пры цяперашніх Саветах, месцамі вымашчаная немцамі яшчэ ў Першую сусветную. Дарога гэтая толькі што завецца дарогаю, а так прасека прасекаю, з безліччу маленькіх масткоў ды пераправаў. Мала хто на яе трапляе з добрых людзей, асноўныя ж ездакі тут браканьеры розных масцей і зладзеі, што цягаюць з пушчы мораны дуб ды ясень. І вось я, журналіст абласной газеты, і кіроўца Зміцер, трасемся на гэтым гасцінцы ўжо дзве гадзіны запар. Па праўдзе кажучы, не люблю ні гэтую дарогу, ні мясцовую прыроду, ні гісторыі пра тамтэйшую партызанку, пра што, аднак, мушу пасля прыезду ў Гародню штосьці накрэмзаць. Але я, як і большасць нашых журналістаў, накіраваны сюды сёлетняй вясной па заданні рэдакцыі.

Дзякуй Богу, жыхары тут дужа ветлівыя: і накормяць, і напояць, а калі спадабаешся ім, то і з сабою карчоўкі грэлку нальюць. Карчоўка – мясцовая назва самагону, а грэлкамі, каб не знайшлі міліцыянты, тубыльцы экспартавалі згаданы вышэй напой з пушчы цывілізаваным аматарам.

Ну, і вось еду я па гэтай дарозе, скарачаючы шлях, за акном – цёплы красавіцкі дзень. Побач са мной кіроўца Зміцер, хударлявы хлапец гадоў трыццаці пяці, аматар мясцовай карчоўкі і іншых грымучых напояў. Праглядваю матэрыял, які назбіраў пра мінулую вайну ў Дзятлаве і ваколіцах, а Зміцер штосвет кляне жыццё, мяне і чамусьці галоўнага рэдактара. На маё пытанне, за што рэдактара, я пачуў толькі лаянку і праклён у бок савецкага ўрада. Шчыра кажучы, для мяне адказ наконт нездавальняючага настрою ўзбунтаванага кіроўцы ляжаў на паверхні. Ішоў трэці дзень камандзіроўкі, а ён яшчэ ні разу не прычасціўся мясцовай самагонкай. Хаця ні я, ні, што важна, наш рэдактар аніякага дачынення да яго алкагольнай смагі не маем. І вось неўзабаве, не даязджаючы да вёскі Руда Ліпічанская, на ўзбоччы дарогі мы заўважаем нейкі дарагі замежны легкавік з задраным дагары капотам, а каля яго чалавека гадоў пяцідзесяці, прыстойна апра-

нутага, з паднятай рукой. Зміцер, прадчуваючы неспадзяваны «гешэфт», бярэ ўправа і цісне на «гамульцы».

– Добры дзень, шаноўны! Як цябе занесла ў гэтую глухамань?

– Ды вось, мерсэдэс сапсаваўся...

– А хіба ж мерсэдэсы псуюцца? – не даўшы дагаварыць незнаёмцу, весела спытаўся Зміцер.

– Псуюцца, як бачыце.

– Ці можам чым дапамагчы? – умяшаўся ў размову я. – Едзем у вёску Ярнева, на гадавіну, у тым красавіку маці на тамтэйшых могілках пахавалі, вось цяпер з бацькам дабіраемся, як бачыце.

Мужчына павярнуўся да свайго аўто і развёў рукі. У гэты самы час з мерсэдэса вылез сівавалосы згорблены чалавек даволі высокага росту гадоў каля васьмідзесяці. Ён акуратна зачыніў дзверцы легкавіка, павярнуўся ў наш бок і паважна павітаўся. Пасля гэтага ён амаль нябачна кіўнуў галавой сыну, і той, як спрынтар, ірвануў да свайго легкавіка.

– От, Зміцер, каб да нас з табой так дзеці спяшаліся.

– Мгу-у, глядзі, нашых і па піва раніцай не пашлеш, хоць памірай.

Стары, апіраючыся на руку сына, даволі жвава падышоў да нашага аўто і абапёрся на яго крыло.

– Ну дык што, хлопцы, падвезяце дзеда? – на маршчыністым твары старога бліснула скупая ўсмешка.

– Ну, канечне, у чым справа, і вас, і сына – усіх падвязём! – прадчуваючы ўдалы вечар, загаманіў Зміцер.

– Не, мяне не трэба, я паспрабую ўсё ж такі мерс адладзіць, а потым сам і прыеду.

– Ну і добра, ваша справа, а вы, дзед, калі ласка, сядайце. – Зміцер, нібыта гайдук якога-небудзь магната, паслужліва адчыніў дзверы і акуратна пасадзіў на задняе сядзенне пажылога чалавека.

Праз пару хвілінаў наш неўміручы «ленінец» ужо ляцеў, як сокал, у накірунку Ярнева. Ехалі мы моўчкі. Я ўсё думаў, як не-

шта накрэмзаць з матэрыялу, сабранага напярэдадні. У галаве круціліся розныя варыянты, але як толькі я напружваў памяць, дык мне здавалася, што нешта падобнае я пісаў раней. «Халера яго ведае, што тут выдумаць», – разважаў сам сабе я.

– А як гэта вы ў нашыя мясціны трапілі? – парушыўшы маўчанне, прамовіў дзед.

– Ды вось матэрыял да Дня перамогі збіраем, – пасьпяшаўся адзначыцца Зміцер. У гэтых словах майго кіроўцы адчувалася і адказнасць за даручаную справу, і неабходнасць выканаць заданне рэдакцыі, а галоўнае, прадчуванне неблагога барышу, які ён намагаўся атрымаць у Ярневе. Я раздражнёна паглядзеў на Зміцера. Дзед, адчуваючы напружанасць, працягнуў сваю міралюбную палітыку і звярнуўся ўжо да мяне прыватна:

– Я так разумею, гэта вы журналіст?

– Так.

– А што вы на чалавека так злуецеся? Ён жа проста кіроўца і ўсё.

– Ну, і я гавару, чаго тут злавацца, – падхапіў Зміцер.

– Ды я не на цябе.

– Не-не, на мяне, я ж адчуваю.

– Так, Зміцер, кінь лухту несці і ўважліва глядзі на дарогу.

– Гляджу, што я, на гэтай дарозе першы раз? – Пасля маёй амаль сяброўскай заўвагі Зміцер прымоўк і далей паехаў спакойна і ўпэўнена. Я ж павярнуўся да нашага спадарожніка і са стомленасцю ў голасе прамовіў:

– Ды вось перад святамі мушу напісаць штосьці пра вайну.

– А хіба з такім песімізмам што-небудзь вартае напішаце?

– А вартае і не патрэбна, я працую журналістам ужо дваццаты год, і кожны раз пра адно і тое ж пішу на Дзень перамогі.

Дзед задумаўся, а затым, сатхнуўшы, дадаў:

– Канечне, цяжка кожны раз няпраўду пісаць, навучылі саветы і старых, і маладых толькі пра ваенныя перамогі ўзгадваць, як быццам не было Налібоцкага катла, узяцця Менска немцамі

на чацвёрты дзень вайны. Знаеце, але і вы, журналісты, не лепшыя, што вам ні гавары, вы ж толькі і пішаце пра медалі ды нейкі міфічны гераізм.

– А я хіба гаварыў, што мы не вінаватыя ў гэтым сусветным блюзнерстве? Я лічу, што мы, журналісты, самыя адказныя за ўсё і ёсць. А хаця-я... Усе хлусяць: і мы, і дзяржава, і ветэраны – усе.

– Вы шчыра лічыце, што ўсе?

– А хіба не так?

Дзед зірнуў у бакавую шыбу аўто, затым адкашляўся і ціха, нібыта толькі для сябе, прамовіў:

– А каму патрэбная тая ваенная праўда?

– Вы лічыце, што нікому? – ужо крыху націскаючы на свайго суразмоўцу, пацікавіўся я.

Дзед і не спрабаваў апраўдвацца. Ён працягваў гаварыць, нібыта для сябе, ціха і спакойна:

– Знаеце, на вайне ты жывеш з пастаянным прадчуваннем смерці, і яе непазбежнасць прытупляе ўсё закладзенае ў чалавеку Збаўцам. Праз некаторы час ужо нават Бог не зможа растлумачыць, дзе на вайне праўда, а дзе лухта. Ад таго тыя, хто па-сапраўднаму ваяваў, не сказалі праўду. А ляпечуць пра перамогу тыя, хто пра вайну толькі чуў. І то не ад саміх ветэранаў.

Мяне захапіла гэтая палеміка, і я ўзяў на сябе смеласць задаць яшчэ адно пытанне суразмоўцу:

– А як жа сумленне, як быць з сумленнем?

Пасля гэтых слоў у масквічы стала зусім ціха, нават Зміцер збавіў хуткасць і ўважліва пачаў сачыць за нашай размовай. Цішыня цягнулася некалькі хвілінаў. Я чакаў, што нарэшце скажа гэты вопытны, відаць па ўсім, адукаваны чалавек. Ён жа працягваў маўчаць, толькі глядзеў у запыленае акно масквіча і думаў пра нешта сваё. Адчуўшы, што дзед не хоча болей гаварыць пра вайну, я вырашыў нашу палеміку скончыць, але перад тым палічыў абавязковым назвацца.

Пажылы чалавек павярнуў галаву ў мой бок і, яшчэ раз сатхнуўшы, павольна працягнуў мне сваю руку:

– Міхась Чэчат.

Пасля сказанага мой новы прыяцель неяк глыбока задумаўся, павярнуў галаву да акна і замаўчаў. Я ж утульней уладкаваўся на сваім месцы і зноў акунуўся ў свае разважанні пра маю паездку ў тутэйшыя мясціны...

– Так, дзед, вось і Ярнева. Тут куды ехаць? – Пасля сказанага Зміцерам дзед і я ажывіліся.

– Ды вунь мая хата.

– Каторая? – пакручваючы галавою ў розныя бакі, удакладніў Зміцер.

– Ды на рагу, каля старой бярэзіны.

Зміцер, як сталічны таксёр, шпарка падкаціў масквіч да брамкі дзедавай хаты і якраз каля згаданай бярэзіны моцна націснуў на тармазы. Мы з дзедам ледзь не вылецелі са сваіх месцаў.

– О-о-о, калі ласка, дзед, як дамоўлена, якраз пад пад'езд.

– А дзе ты пад'езд тут бачыш? – з гумарам спытаўся я.

– Вось бярэзіна – гэта і ёсць пад'езд. – Мы са Зміцерам засмяяліся. Падняўся настрой і ў нашага спадарожніка.

– Ну што, хлопцы, дзякуй вам, што падвезлі старога, а цяпер пойдзем са мной на вячэру.

Зміцер імгненна вылецеў з-за руля і, нядоўга памарудзіўшы каля багажніка, вывалак адтуль здаравенную дзедаву сумку. Я таксама вылез з масквіча. Дзед стаяў каля сваіх дзверцаў і чакаў.

– Хадзем да мяне, павячэраем, а там, глядзіш, і паразмаўляем.

– Не, нам трэба ехаць, хутка ўжо ноч.

– Не, ну што гэта такое, хадзем, хадзем...

Дзед цягнуў мяне ў накірунку хаты. У гэты самы час падбег Зміцер і, падхапіўшы нашыя клункі, накіраваўся ў двор.

– А ты куды?

– Як куды, таварыш журналіст, вячэраць жа мы павінны.

– Канечне, канечне, – стары Чэчат яшчэ мацней ухапіўся за руку і пацягнуў да хаты. Што мне заставалася рабіць? Паддаўшыся на ўгаворы Зміцера і асабліва дзеда, я пакрочыў за імі.

У пакоях было даволі прасторна і чыста, і, калі ўлічваць, што ў ім ніхто не жыве, жытло абсалютна не выглядала пакінутым.

– Такое адчуванне, што тут хтосьці пастаянна прыбірае, – звярнуўся я да гаспадара, які выцягваў на стол розную правізію са сваёй сумкі.

– А-а-а, дык Алесь дамовіўся з суседкай, вось яна тут і гаспадарыць, і зімою сюд-туд прапальвае. Ну, і ён сам часта тут бывае: то на паляванне, то на рыбу. – Дзед спрытна спраўляўся са сталом і яшчэ паспяваў са мной пра нешта размаўляць.

– Сын ваш вельмі да вас хараша ставіцца. Мы сёння дзівіліся са Зміцерам.

– Праўда? – з задавальненнем прамовіў, крышку адарваўшыся ад сваіх спраў, дзед.

– Слухайце, а дзе дзеўся Зміцер? – Я нахіліўся над сталом і выглянуў у акно.

– Дык я не ведаю, пэўна, каля машыны сваёй, – прамовіў дзед.

І толькі мы пакінулі ўзгадваць Зміцера, як у хату не зайшоў, а ўваліўся персанаж, пра якога мы толькі што гаварылі. П’янюткі, як бот, кіроўца плюхнуўся на старую гарбатую канапу.

– Зміцер, навошта ты так? А як жа ехаць?

– Значыцца, ніяк. – Зміцер, каб не выслухваць натацыі, нешта прамармытаў, падклаў абедзве рукі пад сваю галаву і праз хвіліну захроп. Я не першы раз быў з ім у розных паездках і добра ведаў, што цяпер яго дабудзіцца немажліва. Ад таго развёў рукамі і спакойна сеў на зэдлік, які стаяў тут жа.

– Ну нічога, хай паспіць, – спакойна прамовіў стары Чэчат.

– Ну канечне, што ты яму зробіш? І дзе ён гарэліцу паспявае знайсці? Часу ж прайшло ўсяго хвілінаў дваццаць. У рэдакцыі

таксама ўсе добра ведаюць, што ён гарэлку страшна любіць. Але дзе ты другога кіроўцу знойдзеш на мізэрны заробак.

– А што, зусім малы? – пацікавіўся дзед.

– Ды што там, усяго семдзесят рублёў у яго... А сын у вас толькі адзін, ці ёсць яшчэ хто?

– Не, толькі адзін, была яшчэ жонка, ды вось той вясной памерла.

Я прыставіў зэдлік да рога багата накрытага стала. Стары Чэчат паставіў перада мной чарку, адкаркаваў пляшку нейкай замежнай гарэлкі. Пасля таго, як чаркі былі ўжо напоўненыя, я прапанаваў выпіць за сына старога Чэчата, які ўсё тут прыстойна падрыхтаваў. Мы выпілі, не стукаючыся. Стары задумаўся і, амаль не закусваючы, ціха прамовіў:

– А ведаеце, Алесь мне не родны сын.

– Як не родны?! – збянтэжыўся я.

– Вось так, не родны і ўсё. – І дзед распачаў свой аповед пра партызанку, пра вайну, а галоўнае, пра сябе.

Забягаючы наперад, я мушу прызнацца табе, любы чытач: тое, што я пачуў ад старога Чэчата ў той вечар, засталося ў маім сэрцы на ўсё жыццё.

...Міхась сядзеў, прыпёршыся спіной да старой падсохлай хвоі. Сухія іголкі падалі яму на акрываўленыя рукі і за каўнер. Трапляючы на голае цела, яны балюча каloліся і прыносілі хлопцу паскуднейшае адчуванне. Але маладзён нічога не мог з гэтым зрабіць. На яго руках ляжаў паранены ў абедзьве нагі сябар Алесь.

– Курва, як жа баліць! Такое адчуванне, што па нагах немцы кожную хвіліну калом б'юць.

– Цярпі, Алесь, бачыш, доктар зрабіў усё што мог, – супакойваў сябра Міхась.

Абодва добра ведалі, што доктар толькі і змог тое, што перабінтаваў раздробленыя ногі параненага. Шчыра кажучы,

Алесь толькі зрэдку ўзгадваў пра сваё раненне, калі ўжо наогул цярпець не было аніякай моцы. А так абодва сядзелі моўчкі, моўчкі ўспаміналі сённяшні жудасны бой. Кожны паасобку разважаў над тым, што яны рабілі не так, прарываючыся з аблогі.

Восенню 1943 года пескаўскія дубовікі (так называлі партызаны падраздзяленне егераў, якія мелі на плячы шэўрон у выглядзе дубовага ліста і размяшчаліся ў мястэчку Пескі, што каля Мастоў) і мясцовыя паліцаі прыціснулі да лідска-слонімскай шашы некалькі атрадаў ліпічанскіх партызан. Амаль тры дні тыя трымалі кругавую аблогу. Баі былі жорсткія і крывапралітныя. Толькі невялікая колькасць партызан прарвала кола і выйшла з катла. Большасць альбо загінула пад кулямётным агнём, альбо зноў была адкінута ў пушчу.

Ні Міхась, ні Алесь не ведалі, што рабіць далей. З такімі раненнямі Алеся разлічваць, што ім удасца на раніцу прарвацца праз нямецка-паліцэйскія шэрагі, не было аніякай мажлівасці. Хлопцы сябравалі даўно. У атрадзе пагаворвалі, што яны нібыта выраслі ў адной вёсцы. Хаця гэта было зусім не так. Міхась з'явіўся тут толькі ўлетку 41-га, якраз перад вайной. Хлопца накіравалі сюды па заканчэнні ўніверсітэта ў Менску. Алесь перад вайной ужо быў жанаты і жыў у сваім Ярневе. А пазнаёміліся яны ў партызанцы, на нейкай вайсковай аперацыі, адкуль раненага Міхася на сабе з поля бою вынес Алесь.

Ноч была – хоць вока выкалі, толькі вецер, як шалёны, насіўся з адной галіны на другую, пасыпаючы хлопцаў новай порцыяй надакучлівай іглiцы. Праз пару гадзінаў павінна было развіднець, часу на прыняцце рашэння заставалася вельмі мала. Між тым да наступнага прарыву камандзір загадаў усяму атраду не страляць і не распальваць вогнішчаў ні ў якім разе.

– Паслухай, Міхась, толькі абяцай, што мяне даслухаеш да канца.

– Толькі давай, Алесь, дамовімся: без глупства, бо я цябе тут усё адно не пакіну.

– Ну якое тут глупства ў нашым стане? – Алесь абапёрся на рукі і моцна застагнаў. Міхась падтрымаў яго за плечы.

– Ну, дык вось, Міхась, пакідаць мяне тут не трэба, бо страляцца мне няма як. Немцы знойдуць мой труп, прывязуць у Ярнева, а там, сам разумееш, апазнаюць спагадлівыя суседзі, тады ўсіх маіх паб'юць: і бацькоў, і жонку з малым Алесем. Жывым здацца таксама не выпадае. Пачнуць катаваць, хто ведае, ці вытрымаю. Значыць, сям'ю падстаўлю і сваіх з атрада магу ў бяспамяцтве здаць. Таму... – пасля апошняга сказанага слова голас у Алеся задрыжэў. Міхась насцярожана зірнуў на сябра. Пасля хвіліны маўчання Алесь сабраўся духам і ўпэўнена, як і да гэтага, прамовіў: – Ты мяне нажом, толькі пастарайся, каб адразу ў сэрца.

– Ты што, з глузду з'ехаў, дурань?! – Міхась, раззлаваўшыся, скінуў са сваіх ног на ігліцу сябра і вылецеў з-пад сасны. Алесь ад болю застагнаў.

– Даруй, Алесь, але ж што ты лухту нясеш... На вайне так бывае, жыве салдат, ваюе, ну а прыходзіць час – значыць, і памерці таксама з гонарам трэба.

– Ты што, ідыёт?! Мяне не павінны знайсці ні жывога, ні мёртвага. У цябе тут ні кала, ні двара. Забілі, дык хрэн з табой, а ў мяне сям'я, іх жа за мяне ўсіх, м-м-м... – Алесь у пякучцы забыўся пра свае параненыя ногі, на якія няўдала абапёрся. – Ты, калі мне сябар, не тое што даб'еш, а і абавязкова закапаеш так, каб немцы і з сабакамі не знайшлі.

– Не, Алесь, ты каго хочаш прасі, я не буду.

Алесь, пачуўшы адказ свайго сябра, зноў расхваляваўся і забыўся пра свае ногі.

– М-м-м-м... Паслухай, Міхась, ёсць рэчы ў жыцці, пра якія нікому з чужых не скажаш, толькі самым родным. І так атрымліваецца, што бліжэйшага за цябе ў мяне ў атрадзе нікога няма.

Думкі мітусіліся ў галаве Міхася. Ён разумеў, да чаго яго схіляе сябар.

– Не-не, Алесь, нават не ўгаворвай.

– Я цябе не ўгаворваю. Ты ж не баба, я цябе як сябра прашу, разумееш, як сябра. – Пасля гэтых слоў Алеся каля сасны зноў стала ціха.

– Міхась, паслухай. У мяне з Марыляй доўга дзяцей не было, а тут Алесік нарадзіўся здаравенны такі, шэсць кілаграмаў. Ды толькі пры родах Марыля ледзьве выжыла. Потым дактары сказалі, шго дзяцей у яе болей ужо ніколі не будзе. – Пасля сказанага Алесь моўчкі ўзіраўся ў ноч і ўсё, што не дагаварыў услых, гаварыў толькі сабе. Міхась запаліў саматужніцу, зацягнуўся некалькі разоў, а потым залез пад сасну, прысеў каля свайго сябра і даў таму зацягнуцца.

– Мо-оцны, халера яго, – Алесь адкашляўся.

– Дык вось, Міхась, паабяцай мне, што сям'ю маю не кінеш, а малога... – Алесь, узгадаўшы сына, пяшчотна ўсміхнуўся, – а Алесіка абавязкова выгадуеш і абавязкова вывучыш.

Алесь схапіў свайго сябра за крысо фуфайкі:

– Абяца-ай-й!

– Абяцаю!

– Во, а то не буду, не хачу, як цэлка, ламаешся.

Сябры глядзелі адзін аднаму ў вочы некалькі хвілін, і была паміж імі толькі вечнасць, вечнасць і цёмная, непраглядная ноч...

На парослым асакой востраве, вакол якога шалёны восеньскі вецер ганяў цёмную ад торфу ваду, чалавек вялізным нямецкім кінжалам, як крот, капаўся ў чорнай ліпкай зямлі. Карэнне і клейкі глей заміналі яму. Пот сцякаў з твару мужчыны ў запоўненую амаль на палову вадой магілу. На адзіным сухім узвышшы, накрыты акрываўленай плашч-палаткай, ляжаў нябожчык. Малыя бярозкі, што раслі на востраве, ад ветру кленчылі над ім, нібыта вясковыя бабкі ў апошні дзень перад пахаваннем. Чалавек з кінжалам не звяртаў на гэта аніякай увагі. Ён вельмі спяшаўся. Да відна заставалася ўжо зусім мала часу...

Пасля той сустрэчы са старым партызанам я больш ніколі не пісаў на ваенную тэму. Праз год я яшчэ раз хацеў сустрэцца з Міхасём Чэчатам, але па прыездзе ў Ярнева тая самая суседка, што даглядала дом старога партызана, расказала мне, што стары Чэчат зімою памёр у сына ў Менску. Яна ж распавяла мне пра пахаванне, як моцна гараваў сын Чэчата. Ад яе я пачуў, што Алесь нядаўна тут быў, ставіў па бацьку помнік.

Канечне, было б сорамна мінуць ярнеўскія клады, на якіх знайшоў сваё супакаенне мой былы спадарожнік. Я, едучы ў Гародню, завярнуў туды. Помнік старому Чэчату вылучаўся з усіх астатніх сваёй прыгажосцю і раскошай. Помнік быў з чорнага мармуру, прыгожа зроблены, а на ім, акрамя прозвішча, імя ды гадоў жыцця Чэчата, выбіта ўсяго некалькі слоў: “Дарагому Тату ад улюбёнага сына...”

## ПУГАЧ

Кастусь крочыў па заснежанай сцежцы, нахіліўшыся ўперад, з усіх сіл перамагаючы моцны сустрэчны вецер. Завіруха набірала моцы.

“Праўду казала Алеся, каб паспяшаўся дадому яшчэ да шарай часіны, не паслухаў, дурань”, – разважаў сам сабе Кастусь.

Завіруха падымала снег з навакольных кустоў і кідала яго за каўнер старога бацькавага кажуха.

“Бач, якая наравістая, а мне ўсё роўна цёпла”, – сцепануўшы плячыма, маладзён прыбавіў хады. Разважанні пра надвор’е міжволі зноў і зноў перарываліся ажылым у памяці вобразам каханай Алесі. Ад успамінаў сэрца нейк прыемна паколвала, пах Алесевых валасоў, здавалася, пасяліўся ў Кастусёвым адзенні. І гэты здранцвелы ад марозу свет здаваўся яму жывым і прыгожым. Нават шлях дадому не здаваўся хлопцу надзвычай цяжкім. Валёнкі, збітыя яшчэ дзедам і падшытыя бацькам перад сёлетнімі Калядамі, упэўнена praторвалі дарогу пасярод белай пустэчы.

Праз некаторы час хлопец перайшоў драўляны мост і сышоў са старой шашы на гасцінец, што вёў да Крупак. Пірамідальныя таполі, што засталіся тут яшчэ з часоў Сапегаў, стаялі каля старой шашы шчыльнымі шыхтамі, нібыта воі пад Грунвальдам, ўпэўнена і непахісна. Нават зіма разам са сваімі хаўруснікамі – ветрам і снегам –нічога не магла з імі зрабіць.

Якраз за таполямі пачыналіся прыватныя агароды і плеценая з лазы агароджа вакол вёскі. На яе цьмяны контур і скіраваўся Кастусь. Дарогу ад мастка да Крупак хлопец ведаў добра і мог ісці па ёй з заплюшчанымі вачыма. Кастусь ужо думаў, як міне Гербікау хутар, Снітчын надворак і зойдзе ў сваю, хоць і невялічкую, але ўтульную і цёплую хаціну. І тут жа яму прымроілася, як ён знімае прамерзлае адзенне, выпівае кубак цёплага малака і кладзецца пад нагрэтую на печы мяккую коўдру... Цёплыя ўспаміны пра сённяшнюю сустрэчу з каханай закалыхвалі яго...

Але тут нечакана аднекуль пачуўся трохі прыглушаны, але вельмі выразны мужчынскі голас. На хвіліну Кастусь перарваў свае разважанні і, ступаючы асцярожней, уважліва прыслухаўся.

– Ка-стусь, Ка-стусь... – Хлопец міжволі прыпыніўся.

Божачкі, гэта ж бацька... дальбог бацька. Голас працягваў клікаць:

– Ка-стусь, Ка-стусь... – Хлопец спалохана круціў галавой, не разумеючы, адкуль даносіцца голас. Ён пачаў нярвова гойсаць па заснежаным гасцінцы. Божа мой, гэта ж бацька, дзе ж ён... дзе... чаго ён тут блукае ў такую завіруху?

– Та-та, та-та! – Сілы сталі пакідаць маладзёна, але ён з астатніх сіл усё ж працягваў шукаць бацьку. Спатыкаючыся аб гурбы снегу, насіўся то да камянёў, што віднеліся абапал дарогі, то да велічных таполяў. Нікога!

Бацька ж хворы. Маці казала, што ён наўрад ці выцягне гэтую зіму. Стаміўшыся ад дарэмных пошукаў, Кастусь неяк выпадкова прыхіліўся да таполі, што стаяла найбліжэй да вёскі, і моцна засоп. Завіруха трохі сцішылася, і голас бацькі загучаў яшчэ больш выразна.

– Ка-стусь, Ка-стусь... – Хлопец прыслухаўся і вызначыў, што голас гучыць адекуль зверху. Ён рэзка задраў галаву ўгору і ўбачыў на самай вяршаліне вялізную шэрую птушку. Хлопец паправіў шапку, прыжмурыўся, каб снег не трапляў у вочы, і крыкнуў:

– Пугач, каб ты здох!

Кастусь ліхаманкава зляпіў камяк снегу і з усяе сілы шпурлянуў у пугача. Снежка, як з прашчы, паляцела ў накірунку птушкі. Не чакаючы, пакуль снежны снарад даляціць да абжытага ім сука, пугач спакойна ўзмахнуў крыламі і, зрабіўшы развітальны аблёт Кастуся, згінуў у начным небе.

Маладзён правёў яго вачыма і, даганяючы страчаны час, яшчэ шпарчэй пакрочыў у накірунку вёскі. Праз некалькі хвілін упэўненай хады ён ужо крочыў па заснежанай вуліцы свайго дзяцінства. Ён ішоў шпарка, падбіваючы мяккі снег валёнкамі,

разважаючы пра тое, што з ім здарылася некалькі хвілін таму, успамінаючы сваю ўлюбёную Алесю, думаючы пра далейшае шчаслівае жыццё. І тут ён раптам заўважыў, што з усёй вескі святло гарэла толькі ў адной хаце – іхняй.

Відаць, нешта здарылася! Кастусь прыбавіў хады. Напружанне нарастала, ён пайшоў подбегам, вось ён ужо на падворку, бразнуў дзвярной клямкай.

Пасярод кухні ў чорнай хустцы стаяла заплаканая маці.

– Мама, што?

Маці паглядзела на запыханага Кастуся і ледзь чутна прамовіла:

– Сынок, бацька памёр.

# СЁМАЯ РАПСОДЫЯ ЛІСТА

Канцэртная зала каралеўскага палаца запоўненая дарэшты. Шляхетныя кавалеры ў накрухмаленых белых кашулях і прыгожыя жанчыны ў шыкоўных строях, заняўшы свае месцы, ціха гаманілі паміж сабой. Музыкі, якія сядзелі ў аркестравай яме, настройвалі інструменты. Гукі апошніх, зліваючыся з чалавечымі галасамі, павісалі ў паветры нескончоным рэхам. І толькі белы, як анёл, раяль абыякава паглядаў са сцэны ў залу. Нібыта Напалеон пры Аўстэрліцы, ён добра ведаў, калі наспее нарэшце час скончыць гэтую бязглуздую вакханалію.

– Чэсю, братка, каб ты бачыў, колькі тут народу! Вайскоўцы, выкладчыкі з тваёй вучэльні і нават урадоўцы. Ух ты!

Маладая дзяўчына, прысеўшы ў закутку сцэны, праз невялічкую адтуліну ў заслоне заглядала ў залу. Высокі русы хлопец з блакітнымі, але халоднымі вачыма апантана лавіў кожны гук, які толькі мог пачуць.

– Караліна, дзе ты? – Хлопец, стоячы на месцы, хаатычна абшукваў рукамі паветра вакол сябе.

– Тут, братка, тут, не хвалюйся.

Дзяўчына адарвалася ад сваіх спраў, узяла маладога хлопца за рукі, і той супакоіўся. У гэты самы момант сівавалосы дырыжор гучна пляснуў у далоні і ўзмахнуў тамбурштокам. Аркестр, нібыта зладжаны механізм, адказаў дырыжору некалькімі прыгожымі нотамі. У зале тут жа стала нязвыкла ціха, а праз хвіліну цішыню абудзілі рэдкія апладысменты. Яны сталі заўважна гучнець, калі з-за заслоны ў чорным смокінгу няшпаркай хадой выйшаў канферансье. Дайшоўшы да раяля, ён павярнуўся тварам да гледачоў, і апладысменты ў зале адразу сціхлі.

– Шаноўнае панства! – Безуважны і ўпэўнены голас спрактыкаванага ў сваёй справе чалавека халадзіў сэрцы не толькі слухачам, але і выканаўцам. – Зараз для вас прагучыць Сёмая рапсодыя Феранца Ліста. За раялем – пераможца Варшаўскага конкурса 1939 года, малады піяніст з Навагрудчыны Чэслаў Варанцэвіч.

Зала патанула ў апладысментах.

– Ну, Чэсік, наш выхад. – Караліна ўзяла пад руку свайго сляпога брата, і яны выйшлі на сцэну. Уся зала, паддаючыся ўсеагульнаму захапленню, паднялася і стоячы вітала маладога музыку. Хлопец саромеўся, але ветліва хіліў галаву ў бок аркестра і залы. Ён мкнуўся як мага хутчэй заняць сваё месца. Толькі за раялем ён быў цалкам упэўнены ў сабе. Ён і раяль былі непадзельныя. Хвіліна падрыхтоўкі – і па зморанай цярпеннем зале паплылі жыццесцвярджальныя мелодыі Ліста. Чэсь іграў натхнёна. Пальцы лёталі над клавіятурай, як матылі...

Ужо пяцьдзясят? Здаецца, усё ў мінулым – каханне, канцэрты, поспехі. Усё часцей і часцей задумваешся пра сутнасць жыцця. З кожным днём усё менш і менш застаецца сяброў. Мінуў год, як памерла маці, два – як скончыў універсітэт старэйшы сын. А малодшы выйграў спаборніцтвы па валейболе. Ды і сам я толькі што выйшаў з бальніцы, дзе знаёмыя дактары спрабавалі падмацаваць маё стомленае сэрца, якое ўсё часцей і часцей дае збоі. Здаецца, усё ў мінулым – і развал Саюза, пры якім скончыў музвучэльню і кансерваторыю. Перабудова, калі добрая музыка нікому не была патрэбна, бо з'явіўся «Ласкавы май» ды рознага кшталту жанчынападобныя спевакі, як цяпер прынята казаць, нетрадыцыйнай арыентацыі. Усё ў мінулым. Але памяць не дае спакою, абуджаючы ў стомленай галаве былыя сустрэчы і падзеі. І толькі цяпер, калі мне споўнілася паўвека, я напоўніцу зразумеў сэнс жыцця. Не ўсё вымяраецца грашыма, матэрыяльнымі здабыткамі ды кар'ернымі поспехамі. Дзякуй Богу, што ёсць на гэтым свеце рэчы больш каштоўныя і вечныя.

На пачатку 1981 года мяне, Буцька Аляксандра, выпускніка Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, размеркавалі ў Гародню на пасаду кіраўніка аркестра пры Доме культуры аднаго з хімічных прадпрыемстваў горада. Праца была цікавая і перспектыўная. У аркестры ўсё ладзілася – і музыкі былі кваліфікаваныя, і адносіны з кіраўніцтвам былі выдатныя. І было мне тады толькі дваццаць тры. Прага нечага новага ў музыцы і ў

жыцці не давала спакойна жыць. «Бітлз», «Песняры», «Машына часу»... Музыка гэтых гуртоў вабіла і не давала спакойна сохнуць над нотамі ды праграмамі музычных твораў савецкай пары. І лагічна, што пры нашым аркестры за кароткі час я стварыў рок-гурт «Сапежычы». Нават па назве было відаць, што калектыў у сваёй творчасці мусіць прытрымлівацца беларушчыны. Музыкі мяне задавальнялі, але на новую апаратуру ды інструменты не было грошай. Што мы мусілі рабіць? Калі грошай не дае дзяржава, дык мы іх заробім самі.

Пошукі былі нядоўгія. І вось невядома адкуль з'яўляецца першая прапанова – пайграць на вяселлі знаёмага. Такога поспеху мы не прадбачылі. Пасля вяселля пасыпаліся запрашэнні на святы, вяселлі, вечарыны, амаль кожныя выходныя – праца. Паездкі ў Слонім, Ліду, Масты. Папулярнасць, грошы, магчымасці. І вось аднаго разу запрасілі нас на вяселле ў вёску Паромча, што паблізу Наваградка.

Зборы былі нядоўгія, і ў чарговую пятніцу чырвоны масквіч таксіста-нелегала ўжо імчаў нас у накірунку вёскі. Трэба пару слоў сказаць пра наш музычны калектыў. Канешне, збоку ён выглядаў не вельмі рэспектабельна. Ігар-піяніст – з Гарадзенскага лялечнага тэатра, хударлявы, з доўгімі прамымі валасамі. Саксафаніст Вася – трыбухаты, невялічкага росту чалавек, якога слухачы называлі Карлсанам. І я – двухмятровы баяніст, падобны звонку хутчэй на баскетбаліста.

Дык вось, праз гадзіны дзве масквіч ужо зарульваў на падворак у патрэбнай вёсцы. А яшэ праз некалькі хвілін прывезенае тэхнічнае і музычнае начынне ўжо ўладкоўвалася ў мясцовым клубе. Дарэчы будзе сказаць, што апаратура ў нас на той час была даволі прыстойная. Адзін сінтэзатар «Корг» чаго быў варты! Ён з лёгкасцю мог замяніць увесь аркестр, ён мог гучаць, як найлепшы на свеце раяль!

Пакуль мае сябры ўладкоўвалі апаратуру ў клубе, я на баяне граў каля хаты маладой. Стаяў прыгожы сонечны дзень, у мяне быў выдатны настрой. Мой «Вельтмайстар» гучаў шыкоўна, пасля некалькіх гучных акордаў на падворку сабралася кампанія дарос-

лых, якія не былі задзейнічаны пры падрыхтоўцы вяселля, і мясцовых дзяцей. Для апошніх вяселле было сапраўдным святам, і ласункаў было шмат, і прыгодаў розных ня менш. У гэтую хвіліну, уладкаваўшы апаратуру, з клуба падышлі мае кампаньёны.

– Ну, як там? – Граючы, я звярнуўся да Ігара.

– Усё нармалёва. Але каб ты ведаў, граць мы сёння будзем не адны.

– А хто там?

– Ды нейкі мясцовы музыка са сваёй жонкай.

– І што ў іх за апарат?

– Ды ніякага, ён – на акардыёне ды на скрыпцы, а яго баба – на шалестунах.

Мы абодва задаволена засмяяліся.

Не буду ў падрабязнасцях расказваць, як усё ў нас складвалася на тым вяселлі. Было як звычайна. Брама, сельсавет, дарога, застоллле. З надыходам прыцемкаў мы ідзем у клуб, каб яшчэ раз праверыць апараты перад прыходам вясельнікаў. Павінны ж мы паказаць усім, асабліва нашым канкурэнтам, што мы можам. Мы ўтрох ужо адчувалі сябе пераможцамі.

Дарэчы будзе сказаць, будынак мясцовага Дома культуры выглядаў даволі прыстойна. Калі адкінуць убок прысутнасць прапагандысцкіх плакатаў савецкай пары кшталту “Балбатун – знаходка для шпіёна”, развешаных па сценах, то ўсё астатняе радавала вока. Нядаўна пафарбаваныя столь, падлога, з густам аформленая сцэна. Па перыметры залы сядзелі мясцовыя людзі. Падымаючыся па прыступках сцэны, я заўважыў за кулісамі немаладога хударлявага мужчыну гадоў шасцідзесяці, пальцы якога перабіралі клавішы старэнькага акардэона. Побач з ім стаяла жанчына прыблізна такога ж узросту.

Пакуль мае хлопцы даводзілі інструменты да аптымальнага гучання, я ўлучыў час, каб добра разгледзець пару. Жанчына была звычайная, адзінае, што падкрэслівала яе самабытнасць, гэта нацыянальны строй і жывы, можна сказаць, мітуслівы харак-

тар. Яна ўвесь час нешта казала мужчыну на вуха альбо выглядала ў залу, адхінаючы краёчак заслоны. Чалавек з акардэонам, у адрозненне ад жанчыны, паводзіў сябе спакойна. Густыя белыя валасы былі прыгожа зачасаныя на бок. Прамы нос і скуласты твар больш падыходзілі б галівудскаму актору, а не мызыку з глухой беларускай вёскі. Хіба толькі вопратка на ім сядзела неяк не зусім натуральна. Але набольш мяне здзівіла тое, што ён на кожны гук паварочваў галаву і абсалютна не звяртаў увагі на свае пальцы, якія кранал клавішы акардэона. І толькі праз некалькі хвілін я злавіў сябе на думцы – ён жа сляпы! Я ўважлівей прыгледзеўся да гэтага чалавека. Так і ёсць – сляпы.

Да мяне падышоў Карлсан з саксафонам. Я падзяліўся з ім сваімі назіраннямі.

Мы ўдвух сталі са здзіўленнем глядзець на музыку. Але ў гэты самы момант Ігар стаў настройваць сінтэзатар, выдаючы гучанне розных інструментаў. Са сцэны ў залу несліся гукі скрыпкі, гітары, раяля. Усё было як звычайна, мяне ж цікавілі паводзіны і рэакцыя на гэта сляпога. Той пакінуў перабіраць клавіятуру акардэона і ўважліва прыслухаўся да таго, што адбывалася на сцэне. Праз некалькі хвілін ён павярнуўся да жанчыны і нешта сказаў ёй на вуха. Тая згодна кіўнула галавой і накіравалася ў мой бок.

– Прабачце, калі ласка, а вы не дазволіце майму мужу пайграць на вашым інструменце?

– На якім? – Я спачатку яе не зразумеў.

– На сінтэзатары.

– Ігар, тут людзі хочуць паспрабаваць, дазволь, калі ласка.

– Няма праблемы. – Ігар імгненна саскочыў з крэсла і паказаў на інструмент. Сляпы, трымаючыся за руку жанчыны, павольна падышоў да сінтэзатара. Намацваючы крэсла і інструмент, ён ціхенька звярнуўся да Ігара, і той за пару хвілін настроіў яму гучанне раяля. Што адбывалася далей, я запомніў на ўсё далейшае жыццё. Пра тое расказаць цяжка, не тое, што напісаць. Па зале звычайнага вясковага клуба, як малітва па царкве, палілася Сё-

мая рапсодыя Ліста. Такога выканання я не чуў нават на канцэрце Святаслава Рыхтара, на якім давялося прысутнічаць у Менскай кансерваторыі некалькі год таму.

Гэтага не магло быць! Сляпы акардэаніст у вясковым клубе памайстэрску выконваў Ліста! Пальцы музыкі, здавалася, плылі па клавішах сінтэзатара. Нават маладыя, якія зайшлі ў танцавальную залу ў атачэнні гаманкіх вясельнікаў, не пасмелі прыпыніць гэтую казку. Зноў і зноў лілася музыка Ліста... Далібог, кажу вам, менавіта ў тыя хвіліны я зразумеў выслоў'е: музыка – гэта ўсё!

Трыццаць хвілін выдатнай музыкі – што яны значаць для чалавека, які спазнае жыццё толькі на слых? Трыццаць хвілін мрояў і летуценняў, дзе няма месца савецка-калгаснаму побыту і штодзённай шэрасці, а ёсць толькі яе вялікасць Музыка. Чароўная з'ява, прыдуманая Богам і агучаная чалавекам. Яна, як малітва, ажыўляе стомленую душу, не даючы ёй зачарсцвець. Музыка, як вера, святая і несмяротная...

Калі рапсодыя скончылася, музыка падняўся, адсунуў крэсла і павярнуўся тварам да залы. Я не ўстрымаўся і, запляскаўшы ў далоні, крыкнуў:

– Брава!

– Брава, брава! – неслася па зале вясковага клуба. Сляпы мызыка не стаў выслухоўваць авацыіі, падзякаваў публіцы і ў суправаджэнні жонкі сышоў за заслону. Далей вечар пайшоў як звычайна: музыка, танцы, спевы. Але я не мог супакоіцца. Цэлую ноч маю галаву не пакідалі розныя думкі.

Як такога ўзроўню музыка мог апынуцца ў гэтай забытай Богам вёсцы? Куды глядзяць чыноўнікі ад культуры? І толькі раніцай, калі мне ўдалося паразмаўляць з мясцовым настаўнікам пра падзеі, якія тут адбываліся падчас вайны, у маёй галаве ўсё больш-менш стала на месца.

У даўнія часы ў Паромчы быў прыгожы панскі палац. У ім жыла сям'я графа Варанцэвіча. Былі ў яго два сыны і дачка. Старэйшы сын служыў у польскім войску, а малодшы стаў мызыкам.

І быў той малодшы сын сляпым ад нараджэння. Варанцэвічы як маглі апекаваліся ім. Але пачалася Другая сусветная вайна, старэйшага сына забілі на фронце, а Паромча трапіла пад савецкую акупацыю. Неаднаразова палац рабавалі савецкія ўлады і мясцовыя актывісты. Але графскай сям'і пакуль удавалася ацалець. Аж да той пары, пакуль у 1943 годзе не прыйшла з Масквы ў партызанскую зону разнарадка на спаленне панскіх маёнткаў ды забойства іх насельнікаў за «садзейнічанне акупантам».

І вось у адну з начэй пажар асвяціў Паромчу. Гарэў графскі палац. І старых, і сястру партызаны застрэлілі, а Чэсіку, апошняму з роду, пашчасціла. Сярод партызан знайшоўся «добры» камісар, які не стаў страляць сляпога хлапчука. Маўляў, і так памрэ...

Нікога ў няшчаснага на гэтым свеце не засталося. Пасля пажару мясцовыя людзі прыстроілі сірату ў парамчанскі касцёл арганістам, а калі саветы святыню зачынілі, сляпога музыку забрала да сябе мясцовая салдатка. З тых пор у Паромчы і ваколіцах сталі заўважаць пару вясельных музыкаў. Ён граў на акардэоне і скрыпцы, а жанчына апекавалася сляпым музыкам і біла ў бубен...

У тым жа масквічы мы вярталіся ў цывілізаваны свет. Мае спадарожнікі маўчалі, кожны думаў пра нешта сваё. А я ўсё не мог забыць натхнёны твар сляпога музыкі, разумеючы, што наўрад ці калі ўбачу яго яшчэ раз.

Але нават і сёння, праз дваццаць пяць гадоў, у любую цяжкую хвіліну майго жыцця ў памяці зноў і зноў гучыць Сёмая рапсодыя Ліста...

# АБРАЗКІ

## ХАТА

Старая бацькава хаціна ўжо даўно аддае трухлявым, запоўненым непатрэбнымі лахманамі, куфрам. Яе маленечкія вакенцы ўжо ніколі не будуць вокнамі ў светлую будучыню. Пабітыя шыбы, як крывыя люстэркі, адлюстроўваюць адну толькі старасць – непажаданую і прыкрую. І толькі ўспаміны, як павуцінне, усё чапляюцца і чапляюцца за яе збуцвелыя сцены.

Дах, з якога ты калісьці любіў сачыць за начным небам, цяпер, як стары бляшаны друшляк, працэджвае праз свае бязладныя дзіркі таямнічыя знічкі, і яны штоноч усё сыплюцца і сыплюцца на прамерзлую, як коўзанка, хатнюю падлогу. Усё гэтае відовішча суправаджаецца загадкавым, на першы погляд жудасным, рэквіемам-паланэзам.

Паламаныя мястачковымі дзецьмі дзверы, нібы спрактыкаваныя музыкі, падпарадкоўваюцца дырыжору-скразняку. І толькі старэнькі папяровы абраз Збаўцы, што з'явіўся на покуці бацькавай хаты яшчэ да цябе, – адзінае, што нагадвае пра былое жыццё былых жыхароў. І нават мясцовыя зладзеі, якія, відаць па ўсім, наведваліся сюды неаднойчы, пабаяліся яго скрасці, баючыся не людскога праклёну, а боскае кары.

Стаміўшыся ад гнятлівага параўнання мінулага і цяперашняга, ты прагнеш уцячы адсюль, уцячы туды, дзе яшчэ можаш быць маладым, дзе яшчэ жыве тваё каханне і свеціць сонца надзеі. Але, як бы ты ні хацеў, праз некаторы час зноў мусіш вяртацца сюды, бо гэта твая бацькоўская хата – твая і нічыя болей. А калі ты забудзешся на яе, то хата сама прыйдзе да цябе снамі і прывідамі, успамінамі і хваробамі.

За доўгія гады вандраванняў ты сам стаў прывідам гэтага дому – дому, што увесь час будзе лічыць цябе сваім няўдалым гаспадаром, і твая здрада альбо твой подзвіг ніколі не будуць

для яго мець хоць якое-небудзь значэнне. Гэтая старая хата, як твая маці, – адзіная, заўсёды прыме цябе, кім бы ты ні быў, кім бы ты ні стаў. Яе ніколі не будуць цікавіць ні твае поспехі, ні твае паразы, ні твая вера, ні тваё бязвер'е. Ты заўсёды будзеш для яе самым дарагім. І змяніць гэты заклён можа адна толькі смерць – твая альбо яе...

## АЙЧЫНА

Дык што такое Айчына? Можа, гэта маці, якая нарадзіла цябе ў халоднай неабжытай хаціне. А можа, гэта зямля, на якую ты ўпершыню ступіў пасля сваёй першай споведзі.

А можа, гэта горад ці вёска, дзе ты быў насамрэч шчаслівы і дзе словы "абавязак", "адказнасць", "гонар" не хвалявалі тваю дзіцячую істоту? Ты не раз у маленстве чуў слова "айчына", але ніяк не мог уцяміць, хто ж яна такая: чужая цётка ці ласкавая сваячка? Пра яе шмат гаварылі падчас шматлікіх застольных спрэчак твой дзед і бацька. А потым ты падрос, і твая душа патанула ў безлічы жыццёвых пытанняў і адказаў, загадак і памылак. І цябе, маладога, сур'ёзныя рэчы амаль што не хвалявалі, жыццё здавалася прыгожым і вечным.

Але гады ляцяць – імгненна і незаўважна, і праз некаторы час ты ўжо наблізіўся да акрэсленай лёсам мяжы, за якой цябе чакаў непазбежны, але абавязковы выбар служыць Айчыне аддана і самаахвярна, як служылі Міцкевіч і Каліноўскі, альбо выкарыстоўваць яе, як карыстае кірмашовы гандляр. І ты ўжо адчуваеш, што маладосць прайшла незваротна, і той выбар, якога ты так вельмі лёгка пазбягаў у маладосці, ужо наспеў. Але ж цябе, яшчэ нестарога чалавека, цікавяць новыя ўражанні ды знаёмствы, прыгоды і расчараванні. Загадкавасць навакольнага свету захопліваюць тваю рызыкоўную натуру, адчуванне, што маладосць прайшла незваротна, узбуджае яе.

Урэшце твая душа за доўгія гады распусты і бессэнсоўнасці выкарыстала ўсе назапашаныя сілы. І ты паспешліва пачынаеш

шукаць хоць якое-небудзь духоўнае спакмеўкі. І ў тэты складаны для цябе час ты зноў успамінаеш пра Айчыну, якая заўсёды прыме цябе, нават пастарэлага і спустошанага. Супакоены ды акрыялы, ты зноў задаеш сабе тое важнае пытанне. Дык што ж такое ўрэшце – Айчына? Маці ці мачаха, прытулак ці дом, жыццё ці смерць, дамавіна ці купель?

І як у дзяцінстве, ты зноў аніяк не можаш зрабіць правільны выбар. А гэты выбар ты мусіш зрабіць толькі сам, сам і ніхто болей. Ды толькі часу для гэтага выбару, на жаль, у цябе ўжо зусім мала...

## АЛЬБОМ

Стары сямейны альбом нагадвае мудраца, які шмат ведае, але мала гаворыць. І толькі заахвочвае думаць і ўспамінаць, думаць і ўспамінаць. Шэрая вокладка альбома – як старое вынашанае адзенне, якое ўжо немагчыма ні зацыраваць, ні перашыць. Загнутыя вуглы, падобныя на стомленыя ад цяжкай працы рукі. Пажоўклыя, ледзьве распазнавальныя здымкі, як пякучыя авадні, учапіліся ў пашкуматанае цела. Надпісы, пакінутыя на здымках іх былымі гаспадарамі, амаль што не чытаюцца, ды і самыя воблікі на іх за шмат гадоў сталі для цябе чужымі. Усё засталося ў далёкім мінулым.

Хто яны, жыхары твайго старога альбома, – сябры, што на працягу жыцця сталі тваімі ворагамі, ці ворагі, што дапамаглі ў цяжкую хвіліну? А можа, проста знаёмыя, якіх ты бачыў толькі выпадкова. На большасці здымкаў ты не можаш пазнаць нават сябе самога. А супрацоўнікам ці выпадковым гасцям, што трапілі да цябе ў хату, ты доўга тлумачыш, колькі ж табе тут было гадоў...

Іншы раз гэтыя старыя здымкі абуджаюць глыбока ў тваёй душы цяжкія ўспаміны. На жаль, дрэннае памятаецца даўжэй, а бывае, што і цэлае жыццё. Былая крыўда, як старая рана, што ные і ные, не даючы забыцца пра сябе ніколі. Урэшце госці разыходзяцца, і твой стары сямейны альбом зноў займае сваё належнае месца на запыленым бацькоўскім куфры. Усімі забы-

ты ды нікому болей непатрэбны. І толькі адзінае, што так і не здолелі разгледзець абыякавыя госці, дык гэта тваё прыхаванае за старонкамі і выцвілымі здымкамі дзяцінства, якое пасялілася тут яшчэ ў далёкім-далёкім мінулым. І гэта яго дом, які ты мусіш берагчы, як сваё жыццё, аж да часу апошняга прагляду...

## ТАПОЛЯ

Таполя здрыганулася, нахілілася набок і, шаснуўшы лістотаю, павалілася на брукаваную шашу, куды заўсёды паглядала зверху. Так, як глядзяць на сваіх брыдкіх састарэлых бацькоў падрослыя дзеці. І толькі сівавалосы, трохі нязграбны лесаруб, нібы касміт з фантастычнага трылера, хадзіў каля загінулага дрэва, ацэньваючы, колькі ж будзе з яго спажытку. Гэтага безразважлівага чалавека, здаецца, зусім не цікавіла, што адчувала загубленае ім дрэва.

Таполя, відаць, памятала многае – і росквіт мястэчка, і яго перадваенны заняпад. На шляхотных дамаў ды вясковых бабаў, на гжэчных кавалераў і спітых калгаснікаў, як і на брукаваную шашу, яна заўсёды глядзела з паднябесся, але тое жыццё ўжо засталося ў далёкім мінулым. А ўспаміны трывожаць толькі душу таго, хто на іх здольны. І толькі датрэсеная някемлівымі гаспадарамі механічная піла і лаянка ўсё таго ж лесаруба давалі зразумець наваколлю, што не ўсё яшчэ скончана. А смерць састарэлай таполі – гэта толькі коска, пасля якой, як у складаным сказе, жыццё зноў будзе працягвацца. На жаль, у ім ужо не будзе болей месца ні прыгожым летуценням, ні захаванай яшчэ з даўніх часоў хоць якойсьці шляхотнасці.

Надыходзячая будучыня – жорсткая і разліковая дама, якую цікавяць толькі рэальныя вынікі і колькасныя здабыткі. Ёй, халоднай і разважлівай, недаступныя чыесьці боль альбо радасць, веліч мінулага ці шэрасць і безвыходнасць сучаснага. Яны з'яўляюцца толькі вызначальнымі адзнакамі так незаўважна збеглага часу.

Яшчэ некалькі гадзін, і ад паваленай панскай таполі ўжо нічога не засталося, і толькі падобны на гасцінны стол пень

застаўся на тым жа месцы. На яго яшчэ не зусім астылым целе раскладалі свой сціплы полудзень узбуджаныя лесарубы. Пад позывы восеньскага дажджу яны адкаркавалі пляшку самагонкі. Падняўшыся з намошчанага галля, яны стукнуліся гранёнымі шклянкамі і, падзякаваўшы адзін аднаму за плённую працу, старанна ўзяліся паглынаць закусь.

А халодны восеньскі вецер разносіў па мястэчку і ваколіцах прамоклае тапалінае лісце і гучную, не зусім разборлівую лаянку лесарубаў. Праз месяц ужо нават старажылы мястэчка з цяжкасцю ўспомняць, ці была тут калісьці панская таполя. І толькі брукаванка, якая цягнецца з мястэчка ў далёкі хваёвы лес, выглядае вечнай і непарушнай...

## ДУМКІ-ЛЕТУЦЕННІ

Мае думкі, мае вольныя легкакрылыя птахі, ляцяць, куды ім захочацца. Яны то ўздымаюцца ў завоблачныя вышыні, то, нібы камяні, падаюць на зямлю. Прызнаюся, толькі сам-насам з імі я магу быць да канца шчырым. Як можа быць шчырым вернік, што прыйшоў на першую споведзь, альбо юнак, закаханы ў прыезджую красуню.

Так сталася, што за многія гады жыцця думкі сталі маімі самымі ўважлівымі і чулымі слухачамі, ім ніколі не надакучвае мая ціхая, неразборлівая гаворка. Толькі мае патаемныя летуценні-думкі, прыхаваныя ў глыбінных лёхах маёй душы, з'яўляюцца самымі дарагімі для мяне. Нават дзеці, якіх я вельмі люблю, не могуць належаць толькі мне, бо яны найперш належаць усемагутнаму Богу, і толькі ён можа лічыць іх дарэшты сваімі. І каханне, якому я аддаваўся цалкам, не з'яўлялася толькі маім здабыткам, яно заўсёды належала нам. А думкі заўсёды, у любых варунках, належаць толькі аднаму. Бо нават смерць, якая заўсёды таўчэцца дзесьці побач, не ўладная забраць іх у мяне. Яны сталі часткай майго разбэшчанага жыццём цела, як рука альбо галава.

Думкі часта збыткуюць з мяне, але ж і я магу пасмяяцца з іх, праўда, я гэтага ніколі не раблю, бо толькі дурань жартуе з самога сябе. Я і думкі – самыя даўнія і верныя сябры на ўсім свеце, колькі я сябе памятаю, яны заўсёды побач са мною, як дзённае святло і начная цемра. Разам з імі я вырас, а потым і пасталеў. Яны адзіныя былі сведкамі маёй сапраўднай радасці і смутку. І чым болей я жыву на гэтай няшчаснай зямлі, тым болей я разумею, што такіх сяброў, як яны, у мяне ўжо не будзе ніколі.

А нядаўна думкі зрабілі мне найпрыемнейшы падарунак. Яны пракруцілі ў патаемным кінатэатры маёй душы бязгучнае старое кіно. Праглядваючы гэтую кінастужку, я ўбачыў сябе і немаўлём, і дарослым, і шчаслівым, і няшчасным. Лепшага фільма не мог бы зняць ніводзін знакаміты рэжысёр свету, бо сцэнарый для гэтага фільма пісала само жыццё. Але, як і ўсе фільмы, гэтае кіно таксама калісьці скончыцца. І я ўпэўнены, мае думкі сканаюць разам са мной. Бо яны не змогуць жыць без мяне, як і я без іх. І толькі ў магільных цітрах на звычайным помніку нас узгадаюць – ужо як адзінае цэлае.

І толькі Бог на небе будзе сачыць за ўсім гэтым, разумеючы, наколькі мы яшчэ цёмныя і недасканалыя, хоць і зрабіў ён нас па сваім вобразе і падабенстве.

## СЛЯДЫ

На аркушы заснежанай дарогі я ўбачыў чыесьці сляды. Яны беглі наперадзе мяне, як паляўнічыя сабакі, што адшукваюць звера, альбо як звер, што ўцякае ад паляўнічых сабак. Сляды спатыкаліся і прыспешваліся, разыходзіліся і збліжаліся, нібы ройста. Я размаўляў з імі, а яны маўчалі, я радаваўся ім, а яны радаваліся дарозе.

Чужыя сляды сталі часткай майго падарожжа, як вера, што становіцца часткай пілігрыма. Альбо пілігрым, што становіцца часткай дарогі. І вось сляды зніклі... Зніклі таксама, як і з'явіліся. І толькі заснежаная дарога, спяшаючы да небасхілу, не звярнула ўвагі на страту.

# НОЧ

Ноч крадзецца ў горад праз шматлікія закуткі і прыгарадныя вулачкі. Увесь горад разам са сваімі насельнікамі ў адначассе стае яе доўгачаканай здабычай. І толькі самота адзіная кахае ноч і песціцца ў яе непрагляднай цямрэчы. Дый сама ноч – чулая, кахаючая маці – лашчыць самоту ды адорвае яе сваімі незлічонымі пяшчотамі.

Што ж яднае самоту і ноч? Можа, адзінота, якая даўно пасялілася ў тваім сэрцы, а можа, страх, які час ад часу суправаджае адзіноту. Яшчэ хвіліна, і ноч ужо паўсюль. Зладзейка, пракралася нават у лёхі тваёй душы. Туды, куды ты не вельмі хочаш кагосьці пускаць. Нават родную маці ці сваіх цікаўных сяброў.

Ты баішся ночы, як баяцца невядомага немаўляты ці хворыя. Але што ты можаш зрабіць – нічога, хоць да канца ўсвядоміць сваю недзеяздольнасць цяжка, а іншы раз і немажліва. І калі твае духоўныя высілкі падыходзяць да акрэсленай Збаўцам мяжы, ты раптоўна пачынаеш разумець, што патрабуеш яе, а калі б ночы не было, то куды б ты хаваў свае таямніцы? Самае прыкрае, што назапашанае табой за мінулы дзень ноч хавае у сваіх непрагляднных схованках. Як хавае Нясвіж таямніцу згінулых залатых апосталаў, выробленых па замове Радзівілаў, альбо як дуб у Шчорсах хавае мроі вялікага Адама.

І толькі тады, калі ты не зможаш болей спакойна спаць, яна пераўтвараецца ў абрыдлую і невыносную спадарожніцу твайго жыцця. І ты, як стомлены вандроўнік, апантана пачынаеш шукаць хоць якога-небудзь святла. Але начное святло і само з'яўляецца часцінкаю ночы. Як зоркі з'яўляюцца часцінкамі неба, альбо як памяць з'яўляецца часцінкай тваіх летуценняў.

У роспачы ты ўжо думаеш, што ноч бясконцая, як сусвет. Але ўсё мае свой пачатак і сваё завяршэнне, і вось, як і заўсёды, за ноччу зноў прыходзіць дзень са звыклай для яго пасрэднасцю ды ўсеагульнай бязладнасцю. Але цябе новы дзень ужо болей абсалютна не цікавіць, бо ты зноў чакаеш ноч. І сумніву няма –

яна абавязкова прыйдзе. Бо яна заўсёды прыходзіць ды тых, хто ночы вельмі прагне. Яна на працягу дня стаецца часткай тваіх думак, страхаў і так прыхаванага глыбока ў сэрцы адчаю.

## ВОСЕНЬ

Хворыя людзі больш за ўсё на свеце чакаюць, калі за агіднымі дажджамі надыдзе зіма. Можа, таму, што з прыходам маразоў адступаюць іх вечныя прастуды ды болькі. Старыя чакаюць, калі на зямлі запануе вясна з яе мроямі і спадзяваннямі.

Прастытуткі на шашы Брэст – Масква з нецярпеннем чакаюць лета, каб спакойна зарабляць свае дзесяць даляраў, не зважаючы ні на зімовыя халады, ні на вясновую няпэўнасць. А мне дык даспадобы восень. Менавіта тая пара, калі прырода, стаміўшыся ад бязладнай летняй мітусні, супакойваецца і як быццам асэнсоўвае перажытае, абуджае ў душы глыбокія лірычныя пачуцці. Хаця перажыванне гэтае асабістае для кожнага чалавека, а прырода ўсяго толькі існуе, і яе зусім не цікавяць чалавечыя думкі альбо адчуванні. А восень у сілу сваіх асаблівасцяў толькі абвастрыла гэтыя чалавечыя якасці. Ды і які сэнс наракаць на яе за працяглы для кагосьці надакучлівы дождж ці на нечаканую прахалоду. Хаця, не зважаючы на ўсё, восень усё ж стала для мяне надзвычай чулай і разам з тым таямнічай валадаркай. Валадаркай маіх мрояў і расчараванняў, думак і таямніц. Што застанецца ў душы пасля яе? Пажоўклае лісце, сумны халодны дождж...

Дальбог, гэта якраз тое, што мне цяпер вельмі неабходна. А адзінота і стомленасць? Дык яны ж таксама неабходныя чалавеку хаця б дзеля таго, каб зрэдку пераасэнсоўваць усё назапашанае дзесьці глыбока, у самых далёкіх сховах сваёй душы. Ды ўсе гэтыя перажыванні – толькі прыватнае, маё і нічыё болей, а восень, як і да сустрэчы са мной, не зважаючы на ўсе акалічнасці, будзе шпацыраваць па свеце ў сваім жоўтым, прашытым дажджом сурдуце, пакідаючы на сэрцы толькі шкадаванні і ўспаміны... Толькі адзінае, што ад яе застанецца...

# ПАЛЯВАННЕ

Ваўчыца прабіралася праз хмызняк бясшумна, амаль што па паветры, зрэдку азіраючыся ды прынюхваючыся. Яе скрываўленая зяпа была моцна сціснута, звярыныя вочы, як памерлыя зоркі, адбівалі бляклае вячэрняе святло.

Здалёк, дзесьці з-пад пакінутага людзьмі хутара, даносіліся брэх сабак ды загадкавы зык паляўнічае трубы. Ганчакі надзейна трымалі след ваўчыцы і ўжо не адну гадзіну імчалі за ёю следам. Маладая ваўчыца-маці амаль што не мела шанцу, бо параненая лапа і цёплае малако, якое сцякала з яе поўнага вымя, вельмі выразна акрэслівалі шлях бязлітаснай зграі. Яе суродзічы, з якімі яна яшчэ нядаўна бавіла час ды хадзіла на так любыя ёй ловы, ужо забітыя, а яна з паляўнічага ў адначассе пераўтварылася ў бездапаможную ахвяру.

Адзінае, што паспела зрабіць ваўчыца перад уцёкамі, – гэта забіць сваіх улюбёных дзетак. Невядома, што адчувала яна, але ж аддаць на літасць пераможцаў сваіх ваўчанят не змагла, бо яна, выгадаваная на вольных прасторах, адчувала, што нармальнага жыцця ў няволі не бывае, ёсць толькі ганебнае і прыніжанае існаванне.

Галас пагоні няўхільна набліжаўся. Адчуўшы безвыходнасць свайго становішча, ваўчыца раптоўна развярнулася і шпарка, колькі было сілы, рушыла на паляўнічых. Загоншчыкі ніяк не чакалі такіх дзеянняў ад параненай ваўчыцы і разгублена расступіліся. А ваўчыца, не зважаючы на ашалелых ад страху людзей, пранеслася каля іх і ўдарыла ўсім сваім целам проста ў кодла ганчакоў. Скарыстаўшы нечаканасць і неразбярыху, яна адным рухам ухапіла за горла самага вялікага ганчака, той сіпла ўсхліпнуў і разам з нападніцай зваліўся на чорную, пабітую восеньскім дажджом і нагамі паляўнічых зямлю. Пачалася кароткая, але бязлітасная бойка.

Хтосьці з людзей апрытомнеў і крыкнуў: “Страляйце, страляйце! А то яму канец”. Стрэл, як гром, абудзіў шэры восеньскі вечар.

Калі над абшарам рассеяўся едкі, як атрута, дым, каля невялікага куста альшыны ляжалі два нерухомых целы: вялікі, трохі згорблены ганчак і схудалая, з выскаленымі зубамі ваўчыца. Кроў сцякала з яе спіны на грудзіну.

## ЦЕНЬ

Цень узнік раптоўна, як з'яўляецца на золку кажан. Ён закружляў вакол мяне, не звяртаючы ўвагі ні на вострыя камяні, ні на лужыны, што, як разбітыя люстэркі, валяліся пад нагамі. Нават пташка не змагла б так блізка лётаць каля чалавека. А ён лётаў і ўзіраўся мне проста ў вочы. Час ад часу ён ператвараўся то ў цёмную, неразборлівую пляму, то ў незнаёмага чорнага сабаку.

Праз хвіліну я наогул стаў лічыць яго жывым. Адзінае, што мяне непакоіла ўвесь час, гэта тое, што мой таямнічы спадарожнік маўчаў. Маўчаў, калі я гаварыў, маўчаў, калі я крычаў. І ўсё кружляў і кружляў вакол мяне, як быццам штосьці хацеў сказаць. Хацеў, але ж не мог. Ды ж хіба цені гавораць? – думаў я. Яны ж – мае адбіткі. Дакладней – адбіткі толькі майго цела. І каб можна было навучыць цень думаць і гаварыць, ён стаў бы чалавекам. А ці быў бы той чалавек мною? Не. Вось таму ён маўчыць і маўчыць, не хочучы зрабіць мне крыўду.

Але надыходзіць ноч, так ціха і звычайна, як заўсёды, і мой маўклівы спадарожнік незаўважна для мяне знікае. Як знікаюць аднойчы каханне і нянавісць, як знікаюць сябры альбо бацькі. І я, пасумаваўшы, зноў збіраюся туды, дзе мяне яшчэ чакаюць. На жаль, падарожнічаць ноччу са мной будуць толькі цемра і спусташальная адзінота...

# ЗМЕСТ

Боты ... 5
Паліцай ... 47
Чорная Воля ... 72
Мы наш, мы новы... ... 108
Бацька ... 118
Пугач ... 129
Сёмая рапсодыя Ліста ... 132

**Абразкі**

Хата ... 139
Айчына ... 140
Альбом ... 141
Тапола ... 142
Думкі-летуценні ... 143
Сляды ... 144
Ноч ... 145
Восень ... 146
Паляванне ... 147
Цень ... 148



**Валянцін Дубатоўка** нарадзіўся 20 ліпеня 1963 г. у мястэчку Дзярэчын на Зэльвеншчыне. Закончыў Дзярэчынскую сярэднюю школу, Гарадзенскую электратэхнічную вучэльню. Служыў у Савецкай арміі (ракетныя войскі стратэгічнага прызначэння). Працаваў у пажарнай частцы Вытворчага аб'яднання «Азот». У 1987 г. заснаваў першы ў Гарадзенскай вобласці музычны кааператыў «Актава». З 1992 г. займаецца вытворча-камерцыйнай дзейнасцю. Арганізаваў прадпрыемствы «Вітаўт», «Губерт», «Фрадо», «Тэх-Еўра-мэбля», «Рагнеда». Быў фундатарам царквы Ўсіх Беларускіх Святых (Гародня), кніг беларускіх пісьменнікаў, мемарыяльных дошак у гонар Ларысы Геніюш (зэльвенская Свята-Троіцкая царква) і ўдзельніка Паўстання 1830 г. Яўстаха Каятана Сапегі (дзярэчынскі касцёл Ушэсця). Даследуе матэрыяльную спадчыну роду Сапегаў. Выдаў краязнаўчую кнігу «Архіпелаг Сапегаў» (2002). Узнагароджаны памятным медалём "100 гадоў з дня народзінаў Ларысы Геніюш". Жыве ў Гародні.

**“Гарадзенскія коды”** – гэта серыя сучаснай гарадзенскай прозы. “Чорная воля” – 3-я кніга серыі. Раней пабачылі свет “Галс“ Аркадзя Ліцвіна, “Сандалі мітрапалітыка або маленькія гісторыі з вялікай палітыкі” Віктара Сазонава. Серыя заснавана **“ГАРАДЗЕНСКАЙ БІБЛІЯТЭКАЙ”.**

Кніжная серыя **“ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА”** заснавана ў 2006 годзе жыхарамі Гродна. Мы вырашылі з дапамогай інтэлектуальнага набытку нашых продкаў і сучаснікаў абараніць наш горад ад бульдозернай “рэканструкцыі”. Гістарычныя і культурныя вартасці, створаныя жыхарамі Гродна розных нацыянальнасцяў, ва ўсе часы мелі вялікае значэнне для гісторыі Беларусі і нашага рэгіёна Еўропы, працягвалі найлепшыя еўрапейскія традыцыі і мелі ўплыў на фармаванне дэмакратычнай свядомасці насельніцтва горада.

Кожная чарговая кніга серыі **“ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА”** прысвячаецца той Гародні, якой мы ганарымся.

## Выйшлі з друку:

Юры ГАРДЗЕЕЎ “Магдэбургская Гародня”

Данута БІЧЭЛЬ “Хадзі на мой голас”

Пётр СЯЎРУК “Небыцця не існуе. Невядомыя старонкі беларускага нацыянальнага руху”

Аляксей КАРПЮК “Развітанне з ілюзіямі”

“Зрабаваны народ. Размовы з беларускімі інтэлектуаламі”

Алесь КРАЎЦЭВІЧ “Рыцары і дойліды Гародні”

Сяргей ШАПРАН “Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця” Т. 1-2

Гарадзенскі палімпсест 2008, 2009, 2010, 2012

Апанас ЦЫХУН “...Улюбёны я ў сваю зямлю”

Віктар ШАЛКЕВІЧ “Рэквіем па непатрэбных рэчах”

Дзмітры ЛЮЦІК “Нёманскі Фронт. 12-25 ліпеня 1944 года. Баі за Гродна ў данясеннях, успамінах, статыстыцы”

Васіль БЫКАЎ. “Гарадзенскі архіў: Невядомыя творы (1957—1972). Незавершанае. Нататнікі”

“Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада”

Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы

Аркадзь ЖУКОЎСКІ “Галс”

Віктар САЗОНАЎ “Маленькія гісторыі з вялікай палітыкі”

Гарадзенскі гадавік-2012

Ларыса ГЕНІЮШ “Лісты з Зэльвы”

Зянон ПАЗЬНЯК “Добрая фатаграфія”

Наталля МАЛІНОЎСКАЯ-ФРАНКЕ “Забыты вернісаж”. Творчасць мастакоў Гарадзеншчыны 1860-х – 1930-х гг.

Зоська ВЕРАС “Я помню ўсё”

“Гародня. 50 год без Фары Вітаўта”

Алесь КРАЎЦЭВІЧ “Гісторыя ВКЛ (1248—1341 г.)“

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

...Лёс шматкроць
кідае чалавека ў прорву,
забірае самае дарагое,
а часам дорыць тое,
чаго той ніколі не чакае.
І чалавек тут зьмяніць нічога
не можа.
Можа толькі
падпарадкавацца лёсу,
альбо загінуць...

Валянцін Дубатоўка

Чорная воля